№ 26 (432) 15 ліпеня 2005 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы



## Генэрал агрызнуўся

Сівакоў: «Ці да Парфяновіча ў веславаньне пайду, ці ў Замежны легіён».

старонка 2

## Дом, які збудаваў кандыдат

у прэзыдэнты. Рэпартаж зь Берштаў.

старонка 13

## Правакацыя тыдня

Справа Кішкурны.

старонка 3

# Аманалія

**Сьвятлана Завадзкая** першая ўдарыла амонаўца, а той толькі абараняўся. Яму разьбілі вусны, а ён, як сапраўдны мужык, не заплакаў (а мог жа й «хуткую» выклікаць), а знайшоў у сабе сілы даць здачы. Аддзел інфармацыі ГУУС Менгарвыканкаму распаўсюдзіў афіцыйную заяву па выніках папярэдняга разбору сытуацыі з Завадзкай. **Алесь Кудрыцкі** пра аманальную сытуацыю — **старонка 3**.



## ІНШЫМІ СЛОВАМІ

**Юбілей «Салідарнасьці»**

Калі ўрад рэзка падняў цэны на мяса, рабочыя спынілі працу. Лідэрам прафсаюзнага руху стаў звычайны электрык, бацька сямейства, шчыры каталік Лех Валэнса. Як потым пра яго скажуць — электрык, які зрабіў «кароткае замыканьне ў камуністычнай сыстэме». Праз чвэрць стагодзьдзя пытаньне салідарнасьці стаіць перад беларускім грамадзтвам. Піша Віталь Тарас. **Старонка 3.**

## ГРАМАДЗТВА

**Каб любіць Беларусь нашу мілую...**

Насамрэч, што трэба, каб любіць Беларусь? Як беларусы ставяцца да сваёй краіны? Часткова адказ на гэтае пытаньне даюць зьвесткі апытаньня, праведзенага пры спрыяньні Незалежнага інстытуту сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў (Літва) і фонду «Понціс» (Славаччына). Артыкул Юр'я Дракахруста — **старонка 2.**

## СПОРТ

**Першы блін Рабаканя**

Лёсаваньне выбрала менчукам у супернікі кіпрскі «Анартосіс» з Фамагусты. Гэта клюб-бежанец. У 1970-я краіну напаткала грамадзянская вайна. Туркі абвясьцілі Незалежную Рэспубліку Паўночны Кіпр. Дэмаркацыйная лінія падзяліла краіну на дзьве часткі, і Фамагуста, па-турэцку — Газімагуса, апынулася на турэцкім баку. Каманда пераехала ў Ларнаку. За 12-разовага чэмпіёна Кіпру гуляе немалая грузінская дыяспара. **Старонка 21.**

**Дык падпісвайся!**

На любой пошце можна аформіць падпіску на ліпень—сьнежань. Падпісны індэкс газэты «Наша Ніва» 63125. Падпіска для прыватных асобаў будзе каштаваць 4510 рублёў у месяц, для арганізацыяў — 5631 рубель. Падпіска на шапікі «Белсаюздруку» таньнейшая: 3340 рублёў на месяц. «Наша Ніва» — гэта 24 старонкі без чужога слова штотыдзень.

## Хто разбамбіў Лёндан, або Ці існуе «Аль-Каіда»?

Брытанскія ўлады зрабілі першыя арышты меркаваных арганізатараў тэрактаў у Лёндане. Прагучала меркаваньне пра датычнасьць да выбухаў «Аль-Каіды». Ці абгрунтаваны гэтыя падазрэньні? Піша ўсходазнаўца **Сяргей Богдан**.

Паводле заходніх СМІ, «Аль-Каіда» — звышэфэктыўная тэрарыстычная сетка, кіраваная злачынным розумам бэн Ладэна. Ёй прыпісваюць мноства тэрактаў па ўсім сьвеце — ад Інданэзіі да ЗША. Але дагэтуль сьвет ня ўбачыў доказаў ейнай віны ні ў Нью-Ёрку, ні ў Мадрыдзе, ні ў якіх-небудзь іншых тэрактах. Вашынгтон не падаў паважных доказаў існаваньня сувязі паміж тэрактамі 11 верасьня, бэн Ладэнам і талібскім рэжымам. Ня знойдзена і сьлядоў супрацоўніцтва бэн Ладэна з Іракам.

**7 ліпеня ў Лёндане вачамі беларуса**

Я працую ў Сіці. 7 ліпеня выехаў з дому раней — заскочыць перад працай у трэнажэрную залю. Ехаў на цягніку з паўночнага Лёндану да станцыі «Moorgate»… Ліст Паўла Шаўцова зь Лёндану.

Працяг артыкулаў на старонцы 12.

## 50 РАДКОЎ РЭДАКТАРА

АМАНАЛЬНАЯ СЫТУАЦЫЯ. Амонавец, які спэцыялізуецца на задушэньні апазыцыі, не завагаўся ўдарыць Сьвятлану Завадзкую ў твар. Ён ударыў мірную дэманстрантку — хоць права забараняе яму гэта рабіць. Ён ударыў у твар жанчыну, удаву, што страціла мужа — хоць гэтага не дапускае мараль. Але мы ўсе разумеем, што на Цэнтральнай плошчы ня здарылася ніякай анамаліі. Адбылося тое, што за дзесяць гадоў адбывалася ўжо тысячу разоў. Тое, што стала нормай для гэтай сыстэмы. Нормай дэмакратыі. Нормай законнасьці. Нормай стаўленьня да іншадумцаў. Нормай стаўленьня да жанчыны. Да чалавека ўвогуле. Проста хтосьці з гэтым не сутыкаўся, хтосьці не заўважаў, а на гэты раз справу зафіксавалі тэлекамэры **(старонка 3).** Гэта наш час, калі фігура на экране здольная кіраваць сьветам і розумамі. Выключыце тэлевізар — і яе няма. На прыкладзе бэн Ладэна гэты фэномэн тлумачыць Сяргей Богдан **(старонка 12).**

Мы свой урок еще по карте учим,
Но снится нам экзамен по ночам.

Верш цытаваўся ў рэдакцыйнай калёнцы «Беларуси сегодня» ў сувязі зь лёнданскімі тэрактамі. Але ў вуснах аўтара калёнкі ён набывае беларускае гучаньне. Амонавец наўрад ці разумее іншасэнсы. Ён служыць пану верне...

Журналістаў дзяржаўных СМІ, якія таксама служаць, у выпадку Завадзкай абавязваў ня толькі прафэсіяналізм (значная падзея, праблемнае здарэньне, гарачы кадар), але і журналісцкая салідарнасьць, звыклая маральнасьць урэшце. Ані слова. АНТ адрэагавала на выпадак з Завадзкай (яны яго не паказалі, вядома) паведамленьнем пра парушэньні правоў чалавека ў латвійскіх пастарунках. Трэба чуць гэтага дыктара. Ён кажа пра пастарункі ці «ашмёткі чалавечых целаў» у лёнданскім мэтро з інтанацыяй вядучага перадачы «Ў сьвеце жывёлаў».

У РАСЕІ тым часам узбуджаная крымінальная справа супраць экс-прэм'ера Касьянава, ледзь апошні выказаў прэзыдэнцкія амбіцыі і выступіў з крытыкай Пуціна.

# Генэрал агрызнуўся

Юры Сівакоў шматзначна папярэдзіў: калі што, «ці да Парфяновіча ў веславаньне пайду, ці ў Замежны легіён». Але пакуль ён проста знаходзіцца там, дзе Латыпаў. Абяцанай прэзыдэнтам «працы па профілі адукацыі» прафэсійны танкіст не атрымаў.

Звальненьне Юр'я Сівакова сталася неспадзяванкай для ўсіх, уключна зь цяпер ужо былым міністрам спорту ды турызму. Відаць, таму Сівакоў зрабіў беспрэцэдэнтны ход: даў інтэрвію незалежнаму інфармацыйнаму агенцтву БелаПАН. «Я не сьпяваў пад фанэру, не гуляў значанымі картамі», — заявіў Сівакоў, і ў яго словах адчувалася крыўда.

Трэба прызнаць, што на сваёй апошняй пасадзе Юры Сівакоў глядзеўся дзіўнавата: генэрал, былы кіраўнік МУС, раптам апранае цывільную вопратку ды пачынае разважаць пра пэрспэктывы разьвіцьця экатурызму… І рамантычна ж разважае... І ўвесь час вяртаецца да таго, што вісіць у яго на сумленьні: абвінавачваньняў у датычнасьці да выкраданьняў і забойстваў людзей.

У параўнаньні з астатнімі негаваркімі функцыянэрамі рэжыму Сівакоў меў такую афарыстычную мову, што мог бы на роўных спаборнічаць у красамоўстве з самім прэзыдэнтам. У адным са сваіх інтэрвію ён казаў, што глыбока цікавіўся кітайскімі філязофскімі трактатамі пра дзяржаўную будову. Інтэрвію Сівакова БелаПАНу таксама падкінула журналістам, аналітыкам ды псыхааналітыкам нямала моўных рэбусаў.

На пытаньне, што ён будзе рабіць цяпер, Сівакоў адказаў: «Ці адстаючы калгас узначалю, ці да Парфяновіча ў грэблю пайду, ці ў Замежны легіён. А калі сур'ёзна, то я сам вызначуся са сваім далейшым лёсам. Выкарыстаць мяне дзесьці ня ўдасца: ужо выкарыстоўвалі дастаткова».

Калгас — гэта, так бы мовіць, новае «міністэрства спорту» ці, у варыянце Мясьніковіча, «акадэмія навук»? Ці намёк на тое, што начальнік калгасу можа далёка пайсьці (за прыкладам хадзіць за сьвет ня трэба)? Парфяновіч — гэта перадусім апазыцыя. А Замежны легіён — ён і ў Афрыцы замежны... Ад'езд за мяжу? «Невыязнога» Сівакова, бадай, прынялі б ня толькі ў Расеі.

І калі з тым, як далей складзецца лёс Юр'я Сівакова, раней ці пазьней усё будзе зразумела, дык галоўнае пытаньне ягонай адстаўкі рызыкуе так і застацца без адказу: за што?

**Алесь Кудрыцкі**



**16—17 ліпеня ў Міжнародным адукацыйным цэнтры пройдзе IV Зьезд беларусаў сьвету. Сярод дэлегатаў будуць Вітаўт Кіпель (зьлева) і Янка Запруднік, лідэры беларусаў ЗША. Фота з прэс-канфэрэнцыі 13 ліпеня.**

## ВІНШУЕМ

Віншуем мужны калектыў «Народнай волі» зь дзесяцігодзьдзем. Загляне сонца і ў ваша аконца!

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

19 ліпеня ў ПЭН-цэнтры (вул. Казлова, 7-101) адбудзецца сустрэча міжнароднага майстра ФІДЭ Зьмітра Лыбіна з чытачамі «НН». Пачатак а 18-й.

## «ARCHE»

Працягваецца падпіска на штодвухмесячнік «ARCHE». Падпісны індэкс 00345.

# Каб любіць Беларусь нашу мілую…

Пад вонкавым спакоем беларускага грамадзтва хаваюцца значнае напружаньне. Беларусь — глыбока расколатая краіна. Прычым раскол закранае ня толькі праблемы палітыкі, але даходзіць і да вышэйшага ўзроўню каштоўнасьцяў грамадзтва — ягонай самаацэнкі. Вынікі сацапытаньняў аналізуе **Юры Дракахруст**.

*Люблю Отчизну я,*
*но странною любовью*
*М.Лермантаў*

Насамрэч, што трэба, каб любіць Беларусь? Як беларусы ставяцца да сваёй краіны? Часткова адказ на гэтае пытаньне даюць зьвесткі Табліцы 1, складзенай на падставе апытаньня 2005 году (травень), праведзенага ў Беларусі пры спрыяньні Незалежнага інстытуту сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў (Літва) і фонду «Понціс» (Славаччына).

**Табліца 1. Адны людзі ганарацца тым, што яны грамадзяне Беларусі, а другія не. Ці ганарыцеся Вы тым, што Вы грамадзянін Беларусі?**




Двое з кожных трох грамадзян Беларусі ў той ці іншай ступені ганарацца гэтым званьнем. Шмат гэта ці не? Для параўнаньня ўвядзём так званы «індэкс гонару». Тым, хто пэўна не ганарыцца беларускім грамадзянствам, прыпішам вагу 0, хто, хутчэй, не ганарыцца — вагу 1, хутчэй, гордым — вагу 2, і пэўна гордым — вагу 3. Тады, выключаючы з разгляду тых, хто не адказаў, атрымліваем значэньне індэксу гонару

(0,052 * 0 + 0,151 * 1 + 0,234 * 2 + 0,426 * 3) / (1,0 - 0,137) = 2,19.

Індэкс можа зьмяняцца ад 0, калі ўсе пэўна не ганарацца сваім грамадзянствам, да 3, калі ўсе, наадварот, пэўна ганарацца ім.

Паказчык з апошняга апытаньня НІСЭПД цікава параўнаць са зьвесткамі маштабнага міжнароднага дасьледаваньня World Values Survey («Сусьветны агляд каштоўнасьцяў»), які праводзіўся ў 1995—1998 гадах. У ім, у прыватнасьці, вывучалася, у якой ступені ганарацца сваімі краінамі грамадзяне 20 посткамуністычных дзяржаў, асобна дасьледавалася стаўленьне да краіны пражываньня этнічных меншасьцяў і тытульных этнасаў. Індэксы гонару па некаторых краінах, атрыманыя ў дасьледаваньні і вылічаныя паводле формулы пададзеныя ў **Табліцы 2**.

**Табліца 2. Індэксы гонару (1995—1998 г.)**




**Працяг на старонцы 14.**

# АМОН хавае твар

Баец, які ўдарыў Сьвятлану Завадзкую, лічыць за лепшае захоўваць інкогніта. **Аддзел інфармацыі ГУУС Менгарвыканкаму** заявіў, што Завадзкая першая ўдарыла амонаўца, а «баец» толькі «штурхнуў спн. Завадзкую далоньню». Але на тэлезапісе выразна відаць іншае.

Нячаста здараюцца падзеі, здольныя зварухнуць закарэлую беларускую душу: на ўсялякае нагледзеліся. Але зьбіцьцё Сьвятланы Завадзкай закранула аголены нэрв. Пабачыўшы па тэлевізіі кадры, на якіх амонавец б’е жонку зьніклага журналіста кулаком па твары, шмат каму закарцела плюнуць. Людзі атрымалі яскравы прыклад сваёй безабароннасьці і зразумелі: тое самае можа адбыцца з кожным.

Начальнік аддзелу інфармацыі і грамадзкіх сувязяў ГУУС Менгарвыканкаму Алег Сьлепчанка кажа: «У справе Завадзкай цяпер праводзіцца службовае расьсьледаваньне аб перавышэньні службовых паўнамоцтваў». Высновы па такіх справах робяцца ў тэрмін ад 10 дзён да месяца, таму пакуль рана казаць пра вынікі.

«Мы ня можам гаварыць пра зьбіцьцё Завадзкай, пакуль ня дадзена прававая ацэнка таму, што адбылося», — заяўляе чыноўнік.

Як зазначыў сп.Сьлепчанка, сёньня пракуратура Цэнтральнага раёну, якая будзе разглядаць скаргу жонкі зьніклага журналіста, запытала ў ГУУС дакумэнтацыю па справе. Да гэтага аддзел інфармацыі ГУУС Менгарвыканкаму распаўсюдзіў афіцыйную заяву па выніках папярэдняга разбору. Паводле яе, Сьвятлана Завадзкая першая ўдарыла амонаўца, а той толькі абараняўся. Маўляў, яму разьбілі вусны, а ён, як сапраўдны мужык, не заплакаў (а мог жа й «хуткую» выклікаць), і нават знайшоў у сабе сілы даць здачы.

Аднак на запісе, які быў паказаны па расейскіх тэлеканалах, відаць іншае: амонавец прыкладаўся добра (а не «штурхнуў спн. Завадзкую далоньню», як напісана ў заяве аддзелу інфармацыі) і зьбіраўся нанесьці другі ўдар, але яго адцягнулі.

Гэта энны інцыдэнт такога кшталту (зьбіцьцё Лябедзькі, вываз журналістаў у лес з мэтамі запалохваньня і г.д. аж да зьбіцьця дэпутатаў у 1995-м, з чаго пачаўся адлік), але ўпершыню сцэна была зафіксаваная шматлікімі тэлекамэрамі. Гідкія паводзіны магла назіраць уся краіна.

Як на добры розум, кіраўніцтва АМОНу мусіла б выступіць з прабачэньнямі. Прызнаваць свае памылкі — прывілей моцных. Але міліцыя сваю памылку не прызнае і кажа пра сваю слабасьць. Замест таго, каб захоўваць свой твар, АМОН яго хавае.

**Алесь Кудрыцкі,**
**Сяргей Будкін**

# Маскі-шоў

«Цяпер ня час для інтэрвію, хлопцы. Хіба вы не разумееце, што гэта правакацыя?» — кажа **Уладзімер Кішкурна**. Можна меркаваць, што справа будзе раскручвацца, каб зьбіць хвалю абурэньня зьбіцьцём Завадзкай.



**Выбіўшы дзьверы і вокны, міліцыянты ўварваліся ў дом Кішкурнаў.**

І ўсё-такі ёсьць у спэцслужбах людзі, якія цалкам маглі б перакваліфікавацца ў рэжысэраў бандыцка-мянтоўскіх сэрыялаў. Паўза пасьля «эфэктнай» канфіскацыі 200 тысяч даляраў, нібыта прызначаных Сяргею Скрабцу, зацягнулася. І вось у этэры БТ і АНТ чарговы тэлегіт — рэпартаж пра штурм 9 ліпеня дому Уладзімера Кішкурны, старшыні менскай гарадзкой арганізацыі Партыі БНФ. Выбіўшы дзьверы і вокны, каля тузіна міліцыянтаў учыніліператрус і арыштавалі Антона Кішкурну, 22-гадовага сына гаспадароў дому, якія былі ў гэты час у адпачынку.

Антону прад’яўлена абвінавачаньне ў незаконным збыце наркотыкаў і захоўваньні боепрыпасаў. Пад боепрыпасамі маюцца на ўвазе тры патроны, знойдзеныя ў доме. Што да наркотыкаў, якія нібыта былі пры Антоне, дык адносна іх увогуле ніякай дакладнай інфармацыі няма.

«Цяпер ня час для інтэрвію, хлопцы. Хіба вы не разумееце, што гэта правакацыя?» — кажа Уладзімер Кішкурна. Ён тэрмінова вярнуўся ў Менск і адмаўляе любую датычнасьць яго сына да вылучаных абвінавачаньняў.

Нягледзячы на гучны пачатак, ня выключана, што справа перацячэ ў хранічны стан і неўзабаве рассыплецца. Надта ўжо шмат мэдыйнай валтузьні і замала какрэтных доказаў віны хлопца. Аднак можна меркаваць, што справа будзе ў любым выпадку актыўна раскручвацца, каб зьбіць хвалю абурэньня, якая ўзьнялася пасьля зьбіцьця Сьвятланы Завадзкай.

**АК**

# Гэтае забытае слова «салідарнасьць»

У ліпені 1980-га ў Польшчы пасьля павышэньня цэнаў на мяса пачаліся страйкі, якія сталіся пачаткам «Салідарнасьці» й крушэньня камуністычнай сыстэмы. Праз чвэрць стагодзьдзя пытаньне салідарнасьці стаіць перад беларускім грамадзтвам. Піша **Віталь Тарас**.

«Водка шесть и водка восемь —
Все равно мы пить не бросим!
Ну а если будет больше,
Мы устроим то, что в Польше!»

Гэты немудрагелісты вершык нарадзіўся 25 гадоў таму. Для сёньняшніх маладых людзей ён уяўляе сабой суцэльную шараду. Для тых, хто ня жыў у той час, трэба тлумачыць, што ў першым радку згадваюцца цэны на гарэлку. Шэсьць, а тым больш восем савецкіх рублёў за бутэльку пры тагачасных мізэрных зарплатах былі немалымі грошамі. У 1980-м цэны на ўлюбёны напой працоўных у мэтах «павышэньня дабрабыту савецкага народу» (як пісалася ў пастановах партыі і ўраду) павышаліся двойчы, што выклікала страшэнную нездаволенасьць масаў. Ну а што было тады ў Польшчы й чым пагражалі савецкія грамадзяне савецкай уладзе — таксама трэба тлумачыць.

Адбылася тады абсалютна нечуваная для эпохі развітога сацыялізму рэч.

### Кароткае замыканьне

У ліпені 1980-га Польшчу скаланулі страйкі, якія ўспыхнулі ў Гданьску, Шчэціне, Варшаве, а потым пашырыліся на ўсю краіну. Паводле палітэканоміі сацыялізму, такога быць не магло — эксплюатацыя працоўных адбываецца толькі ў капкраінах, а пры сацыялізьме прадпрыемствы належаць працоўным. Рабочыя Гданьскай вэрфі ці варшаўскага трактарнага заводу «Урсус» палітэканомію ведалі слаба. І калі ўрад рэзка падняў цэны на мяса й мясныя прадукты, пакінуўшы ранейшыя заробкі, рабочыя спынілі працу. Савецкая прапаганда была ў шоку. Перад гэтым, у 1970-я, прыклад братняй Польшчы пад кіраўніцтвам першага сакратара ПАРП Э.Герака падаваўся як варты перайманьня ў пляне росту дабрабыту. Польшчу тады называлі «самым свабодным баракам у сацыялістычным лягеры».

Савецкае кіраўніцтва раздражняла, што лідэрам прафсаюзнага руху стаў звычайны электрык, бацька сямейства, шчыры каталік Лех Валэнса. Як потым пра яго скажуць — электрык, які зрабіў «кароткае замыканьне ў камуністычнай сыстэме».

### «Трыбуна люду» як носьбіт праўды

Нават у савецкай таталітарнай сыстэме зь яе татальнай цэнзурай існавалі своеасаблівыя дзіркі. Так, у Менску ў шапіках «Саюздруку» у 1980-м можна было свабодна купіць за капейкі газэту польскіх камуністаў «Трыбуна люду». У 1970-я яна мала чым розьнілася ад савецкай «Праўды». Таму ніхто з савецкага начальства не чакаў ад камуністычнага выданьня таго, што яно ўтварыла. Па-першае, газэта інфармавала чытачоў пра страйкі. Потым, калі ўлады вымушаны былі сесьці за стол перамоў з кіраўніцтвам незалежнага прафсаюзу «Салідарнасьць», газэта ня проста пісала пра сам факт перамоў, але вымушана была выкладаць меркаваньне ня толькі ўрадавага боку, але й дзеячаў апазыцыі, хоць і не пагаджалася зь ім.

Нарэшце ў верасьні 1980-га «Трыбуна люду» апублікавала тэкст гістарычнага пагадненьня ў Ястшэмбе, у якім прызнавалася права незалежнага апазыцыйнага прафсаюзу на сваё існаваньне ды абарону правоў працоўных.

У той час мне давялося працаваць на БТ, дзе кожны тыдзень на занятках палітінфармацыі лектары апавядалі пра каварныя пляны імпэрыялістаў у дачыненьні да Польшчы ды прадажную польскую апазыцыю.

**Працяг на старонцы 4.**

## СЬЦІСЛА

### Загінулі на будоўлі

У вёсцы Галоўчын Бялыніцкага раёну адбыўся няшчасны выпадак, у выніку якога пацярпелі чальцы будаўнічага студэнцкага атраду Беларуска-расейскага ўнівэрсытэту з Магілёва. Падчас разбору будынку былога сьпіртзаводу адна сьцяна абрынулася і завалiла двух чалавек. Маладыя людзі атрымалі траўмы і пераломы. Адзін зь іх знаходзіцца ў рэанімацыі, іншы — у аддзяленьні нэўрахірургіі. Астатнія студэнты ўжо пакінулі Галоўчын.

### Узор Балтыі

Міністэрства па надзвычайных сытуацыях мае намер стварыць добраахвотныя пажарныя каманды. Пра гэта заявіў кіраўнік ведамства Энвэр Барыеў падчас побыту ў Віцебску. Дружыны будуць ствараца ў тых населеных пунктах, дзе адсутнічаюць сталыя пажарныя каманды. Пілётныя праекты спачатку рэалізуюць у аграгарадках. МНС спасылаецца на досьвед краін Балтыі.

### СПБ адмовілі

Вайсковая пракуратура адмовіла Саюзу палякаў Беларусі ў завядзеньні крымінальнай справы ў сувязі з публікацыяй у чырвеньскім нумары газэты «Во славу Родины» артыкулу Уладзімера Кажэўнікава «Гульня краплёнымі картамі» і вершу Яўгена Няфёдава «Па Эўропе ходзіць прывід кандалізму», прысьвечаных сытуацыі вакол СПБ пасьля VI зьезду Саюзу палякаў. Кіраўніцтва арганізацыі палічыла, што аўтары газэты імкнуцца распаліць варожасьць да палякаў.

### Дзе ў Менску можна купацца

Гарадзкі цэнтар гігіены і эпідэміялёгіі вызначыў вадасховішчы, дзе бясьпечна купацца. Чыстымі лічацца Пціч, Цнянка, Крыніца, Вяча. Зачынены для купаньня пляж №8 Заслаўскага вадасховішча, пляж №2 Драздоў, Камсамольскае вадасховішча. Нельга купацца ў Сьвіслачы, Чыжоўскім і Лошыцкім вадасховішчах, Сьляпянцы.

### Пабіўся зь мядзьведзем

Незвычайны інцыдэнт адбыўся ва ўкраінскіх Чаркасах. 22-гадовы наведнік заапарку Канстанцін пералез цераз агароджу вальера з бурымі мядзьведзямі і паспрабаваў пагуляць у дрэсіроўшчыка. У адказ 270-кілаграмовая жывёліна адмахнулася ад чалавека. Тады наведнік сур’ёзна раззлаваўся і пачаў біць мядзьведзя нагамі, мядзьведзь нанёс пару ўдараў у адказ. На дапамогу «мужу» падасьпела мядзьведзіца. Выратавалі чалавека ад сьмерці людзі, што сілай выцягнулі яго з клеткі. Пацярпелы дастаўлены ў рэанімацыю ў цяжкім стане.

**АГ; belapan.com, belta.by, interfax.by**

# Гэтае забытае слова «салідарнасьць»

Працяг са старонкі 3.

На занятқі я звычайна прыносіў з сабой сьвежую «Трыбуну» й чытаў пра апошнія польскія падзеі. Часам да мяне далучаліся яшчэ некалькі калегаў — з тых, што ведалі польскую мову, астатнія прасілі пераказаць, што пішуць. Старэйшыя касавурыліся, але заўваг ніколі не рабілі.

## Каб Міхнік чуў

А пра гістарычны пленум ЦК ПАРП, на якім быў зьняты з пасады Герак, а на яго месца пастаўлены Станіслаў Каня, я даведаўся ў Горадні, з экстрэннага выпуску навін польскага тэлебачаньня.

Ня стану перабольшваць і казаць, што той пленум, як і ўвогуле падзеі ў тагачаснай Польшчы, выклікалі вялікую цікавасьць у Беларусі. Нават тыя, у каго была магчымасьць глядзець польскае тэлебачаньне, цікавіліся ня стольскі страйкамі, колькі забаўляльнымі перадачамі — мульцікамі, сэрыяламі, эстрадай. У застольных жа размовах калі й гаварылі пра польскія падзеі, дык часьцей за ўсё зь нейкім раздражненьнем, нават злосьцю — ат, тыя палякі, халера іх бяры! Чаго ім бракавала?!

Пасьля «Трыбуна люду» зьнікла з шапікаў. Усю інфармацыю, асабліва пасьля ўвядзеньня вайсковага становішча ў Польшчы ў сьнежні 1981-га, даводзілася атрымліваць з замежных радыёгаласоў. Гаварыць жа шчыра на польскія тэмы стала проста небясьпечна.

Між іншым, тады здарыўся эпізод, які асабліва выразна паказаў розьніцу паміж савецкім грамадзтвам і польскім. Адзін з тагачасных лідэраў КОС—КОР (падпольнай арганізацыі, што спрычынілася да стварэньня «Салідарнасьці»), цяперашні галоўны рэдактар «Газэты выборчай» Адам Міхнік быў адпраўлены ў варшаўскую турму. Дык вось, жыхары навакольных дамоў штовечар, калі распачыналася трансьляцыя «Вольнай Эўропы», уключалі свае радыёпрыёмнікі на поўную магутнасьць, каб вядомы на ўсю краіну вязень змог пачуць апошнія навіны.

## Фэномэн «Салідарнасьці»

«Салідарнасьць» працягвала дзейнічаць у падпольлі. Выстаяўшы ў самы цяжкі час, прымусіўшы камуністычныя ўлады сесьці за «круглы стол» перамоў з апазыцыяй, якія скончыліся поўнай перамогай на першых дэмакратычных выбарах, «Салідарнасьць» пачала хутка траціць свае пазыцыі ў свабодным грамадзтве. Паступова яна саступіла на выбарах — і прэзыдэнцкіх, і парлямэнцкіх — левым партыям, а потым і ўвогуле сышла з агульнанацыянальнай арэны як самастойная палітычная сіла. Прафсаюзны рух зрабіў сваю справу — гэты рух павінен быў сысьці.

Аднак хаця з моманту ўтварэньня «Салідарнасьці» мінула ўжо чвэрць стагодзьдзя, ейны фэномэн яшчэ не разгаданы цалкам гісторыкамі. Застаецца без адказу галоўнае пытаньне — ці была «Салідарнасьць» чыста нацыянальнай зьявай, абумоўленай польскай гісторыяй, традыцыямі, мэнтальнасьцю? Ці яна была заслугай прыўнесеных з-за мяжы палітэхналёгій і сталася, такім чынам, далёкім папярэднікам «каляровых рэвалюцый» XXI ст.? Ні для кога не сакрэт, што на падтрымку незалежнага прафсаюзнага руху ў Польшчы вылучаліся немалыя грошы заходнімі дэмакратыямі. Але наколькі гэтая дапамога была вызначальнай для перамогі дэмакратыі ў самой краіне?

## Шляхам вызваленьня

Наколькі можна меркаваць, падзеі 1980-х у краінах усходняга блёку адбыліся ня ў выніку экспарту рэвалюцыі. Аксамітная рэвалюцыя» ў Чэхіі адбылася не таму, што ў Польшчы перамагла «Салідарнасьць». Вугоршчына, Усходняя Нямеччына, Баўгарыя, а потым краіны Балтыі ішлі кожная сваім шляхам да вызваленьня (выключэньнем стаў хіба падрыхтаваны спэцслужбамі пераварот у Румыніі). Хаця прыклад папярэднікаў, а таксама дапамога заходніх дэмакратый, безумоўна, мелі вялікае значэньне для народаў гэтых краін.

Варта нагадаць, што лідэры «Салідарнасьці» не аднойчы наведвалі Беларусь у 1990-я, сустракаліся з актывістамі незалежных беларускіх прафсаюзаў, нават зьвярталіся непасрэдна да менскіх працоўных на мітынгах. Аднойчы па абвінавачаньні ў агітацыі супраць уладаў быў высланы зь Беларусі лідэр «Салідарнасьці», наступнік Леха Валэнсы на гэтай пасадзе Мар'ян Кшаклеўскі.

І што ж? Дзесяць гадоў таму, 1 верасьня (яшчэ адна круглая дата!), распачаўся страйк менскіх мэтрапалітэнаўцаў. Работнікі іншых галін страйку не падтрымалі. Страйкоўцы засталіся сам-насам з уладамі. Арганізатары былі звольнены, пачаліся рэпрэсіі супраць прафсаюзных актывістаў, незалежных прафсаюзаў, дэмакратычных грамадзкіх арганізацый.

Акцыі салідарнасьці са сваякамі зьніклых палітыкаў зьбіраюць усё менш людзей. Пятая гадавіна зьнікненьня журналіста Зьмітра Завадзкага азнаменавалася яшчэ адным агідным фактам. Падчас акцыі «Хочам ведаць праўду» на Кастрычніцкай плошчы ў Менску амапавец ударыў кулаком у твар жонку Зьмітра Сьвятлану. Тэлекамэры паказалі гэты брутальны акт прадстаўніка ўлады на ўвесь сьвет. Беларуская грамадзкасьць праглынула й гэта. Якая тут можа быць гаворка пра салідарнасьць?

## Гісторыя — рэч жорсткая

Сэрыя дэмакратычных рэвалюцый не закранула, дый не магла, відавочна, закрануць краіны былога СССР, за выключэньнем балтыйскіх. Сёньня абсалютна ясна, што распад Савецкага Саюзу і атрыманьне дзяржаўнага суверэнітэту саюзнымі рэспублікамі стварылі ўсяго толькі перадумову, магчымасьць дэмакратычнага выбару. Але магчымасьць зусім не азначае непазьбежнасьці. Беларускі народ, па сутнасьці, зрабіў свой выбар на выбарах (прабачце за таўталёгію) 1994-га году. Ці азначае гэта, што зробленую памылку — зрэшты, цалкам заканамерную для посттаталітарнай краіны — ніколі ня ўдасца выправіць?

Між іншым — не дзеля суцяшэньня, а дзеля праўды, — 25 гадоў таму народ зусім іншай краіны таксама зрабіў свой выбар. Шляхам дэмакратычнай рэвалюцыі й свабодных выбараў да ўлады ў Іране прыйшоў аятала Хамэйні. Краіна добраахвотна вярнулася ў сераднявечча, да тэакратычнага праўленьня.

Так, гісторыя — рэч жорсткая. Яна ня ведае ўмоўнага ладу. Але ж і дэтэрмінізму гісторыя ўсё-такі не прызнае. Інакш у адных і тых жа ўмовах усе народы паводзілі б сябе абсалютна аднолькава. Але ж мы бачым, што ва Ўкраіне, напрыклад, дзе ўмовы ў цэлым былі падобныя да беларускіх ці, скажам, расейскіх, народ павёў сябе інакш. Гэта, зноў жа, не азначае, што ўкраінцы зрабілі адзіна правільны выбар, высунуўшы Юшчанку. Цалкам магчыма, што заўтра яны расчаруюцца ў сёньняшнім кіраўніцтве ды прагаласуюць за Януковіча. У гэтым сэнсе ўкраінскія выбаршчыкі нічым не адрозьніваюцца ад польскіх, вялікая частка якіх яшчэ зусім нядаўна гатовая была пайсьці за папулістам Лепэрам, ці якіх-небудзь іншых.

Але ж ёсьць адна прынцыповая рэч, якую сьвядома ці несьвядома ігнаруюць разважныя крытыкі Аранжавай рэвалюцыі ў Украіне або Ружовай рэвалюцыі ў Грузіі. Чым новыя ўлады лепшыя за старыя? — пытаюцца яны. Хіба новыя гаспадары ня робяць памылак, не змагаюцца за хлебныя пасады, не падманваюць выбаршчыкаў? Падтэкст такіх пытаньняў зразумелы: навошта ўкраінцам было выходзіць на плошчы, калі вынікамі рэвалюцыі ўсё адно заўсёды карыстаюцца адзінкі? І ці варта беларусам сёньня пратэставаць, калі невядома, ці стане лепш у выніку зьменаў заўтра?

## Маральны выбар

Але хіба сам факт выхаду на Майдан, адчуваньне адказнасьці й адзінства з тымі, хто быў побач, само чаканьне перамен і вера ў іх магчымасьць — хай нават і памылковая — нічога ня вартыя? Спытайцеся аб гэтым ва ўдзельнікаў мінулагодніх восеньскіх падзей у Кіеве. Або ва ўдзельнікаў абароны літоўскага Сойму ў студзені 1991-га, сярод якіх былі й беларусы.

І вось тут мы вяртаемся да тэмы Салідарнасьці — і ў канкрэтнагістарычным пляне, і ў зьместавым, філязофскім. У гістарычным пляне сябры толькі што створанай польскай «Салідарнасьці» ня ведалі й не маглі ведаць у 1980-м годзе пра тое, што будзе ў 1989-м. Яны маглі толькі аб гэтым марыць. Але яны добра ведалі, напрыклад, хто такі гэнэрал Ярузэльскі і чаго ад яго можна чакаць. Яны здагадваліся, што іх чакаюць турмы, і не памыліліся. Іншага ж з актывістаў «Салідарнасьці», як ксяндза Ежы Папялушку, прычакала сьмерць ад рук карнікаў.

У 1980-м «Салідарнасьць» яшчэ не была вядомай ва ўсім сьвеце маркай магутнай ды аўтарытэтнай арганізацыі, ад якой залежыць лёс нацыі. Тады быў усяго толькі незалежны прафсаюз, не прызнаны ўладамі, а значыць, няздольны гарантаваць сваім сябрам ніякіх выгод у будучыні. «Салідарнасьць» была для палякаў пытаньнем маральнага выбару.

За чвэрць стагодзьдзя зьмянілася шмат паняткаў, на многія рэчы беларусы пачалі глядзець па-новаму. Але пытаньне выбару паранейшаму застаецца для іх актуальным.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Маці (у цэнтры), жонка (зьлева) і сын Зьмітра Завадзкага твар у твар зь сябрамі тых, хто...**




**10 ліпеня на старых габрэйскіх могілках у Вішневе (Валожыншчына) быў адчынены помнік ў памяць габрэяў, забітых у Другую сусьветную вайну. Ініцыявала ўсталяваньне беларуская камісія ўшанаваньня памяці ахвяраў Галакосту. Грашыма дапамаглі брытанцы Даяна і Майкл Лазарус. На адкрыцьці прысутнічаў амбасадар ЗША Джордж Крол. Пасьля адкрыцьця помніка дэлегацыя наведала сялібу Шымона Пэрэса ў Вішневе. На старым падмурку стаіць ужо іншы дом. Захаваўся, праўда, Пэрэсаў калодзеж. Габрэі пілі ваду зь яго як сьвятую.**
**Памяткі ахвярам Галакосту былі адчыненыя таксама ў блізкім Ракаве і ў Параф'янаве (Докшыцкі раён).**

# Каму сёлета расьці добра

Тыя ж, хто абрабляе зямлю, устрывожана пытаюцца: што ж гэта будзе з такім надвор'ем? Травеньскія залевы ў некаторых рэгіёнах Беларусі зьмяніла засуха. Якія «віды на ўраджай» пасьля гэтага? Піша **Сямён Печанко**.

Сярэдзіна лета — той час, калі з пэўнасьцю можна казаць, ці будзе што нарыхтоўваць увосень. На што можна разьлічваць сёлета?

Пачнём з бульбы. Травеньскія залевы не абяцалі нічога добрага, асабліва на поўначы і ўсходзе краіны. На Віцебшчыне і Магілёўшчыне дзенідзе давялося нанова пераcаджваць бульбу. Агулам пацярпела да 30% пасадак. Для калярадзкага жука мяккая зіма і цёплае лета — найлепшыя ўмовы для разьвіцьця. Да таго ж большасьць беларусаў змагаюцца з навалай пры дапамозе састарэлых сродкаў («Банкол», які актыўна рэкламуецца па тэлевізары, ужо каторы год прадаецца ў Беларусі), а як вядома, выкарыстаньне аднаго сродку на працягу некалькіх год ня толькі зьніжае яго эфэктыўнасьць, але й выклікае прывыканьне. Спэцыялісты ня раяць чакаць вялікіх ураджаяў бульбы і прагназуюць павышэньне цэн на «другі хлеб».

Ня вытрымалі выпрабаваньня вялікай вадой агуркі, морква і таматы. Агурочкі не расьлі праз тое, што начныя тэмпэратуры не адпавядалі аптымальным: у чэрвені яны не падымаліся вышэй за 10—15 градусаў. Да ўсяго, спрыяюць захворваньню дажджы. Парада агароднікам: ніколі не палівайце агуркі паверх лісьця, толькі пад карэньне, інакш уласнымі рукамі зьнішчыце будучы ўраджай. Морква пакутуе ад запозьненай вясны, памідоры ўжо на пачатку чэрвеня акупавала фітафтора.

Да ўсяго пачалася суша. У некаторых раёнах захаду Беларусі, напрыклад, вакол Берасьця больш за месяц не было дажджу. Перасыханьне зямлі ўзмацнілася з ростам сьпёкі ў ліпені. Засуха дасягнула другой ступені — глебавай. Залевы мінулага тыдня спаталілі ня кожную вёску.

Радыс і буракі аказаліся найбольш трывалымі у сёлетніх экстрэмальных умовах. Як і капуста з цыбуляю, якія амаль не адрэагавалі на выклікі надвор'я, а таксама бабы, гарох і розныя салаткі. А вось часнык масава жаўцее, засмучаючы гаспадароў.

Нарабіла шкоды надвор'е і ў садах. Костачкавыя яшчэ неяк пратрывалі. А вось яблыні сёлета пайшлі ў вымушаны адпачынак. Запозьненае цьвіценьне прывяло да затрымкі ўтварэньня завязі, ды яшчэ шкоднікі пачулі слабіну.

Затое, лес! Ён зьдзівіў незвычайна раньнімі грыбамі, якія нават складана назваць каласавікамі — якая ж зважына каласуе ў траўні, калі зьявіліся першыя абабкі і нават баравікі.

Такім чынам, незвычайны гэты год абяцае нам дарагую бульбу, імпартныя яблыкі, але свае буракі з капустай. Збожжа сёлета сасьпее трошкі пазьней, але ўраджай яго, насуперак найгоршым спадзяваньням, абяцае быць неблагі.

ТЭНДЭНЦЫІ

# Трэцяе пакаленьне

Пакаленьне бацькоў уцякала зь вёскі. Пакаленьне дзяцей уцякае з дачаў. Але яно яшчэ будзе выхвальвацца перад унукамі сваёй сялянскай загартоўкай. Піша **Руслан Равяка**.

Пакаленьне маіх бацькоў уцякала зь вёскі, кідала мову, ламала сьветапогляд. Дзяды самі выпраўлялі дзяцей у сьвет, каб выбавіць іх ад рабскай працы, працаднёў, бяспашпартнасьці, калгаснага бязладзьдзя. Гэтак перарвалася повязь вякоў. Беларус перайшоў са стадыі селяніна ў стадыю гараджаніна.

Першае пакаленьне ўрбанізаваных сялян, крыху асвойтаўшыся ў горадзе, штотыдзень наяжджала на вёску дапамагаць старым правіць гаспадарку. У нядзелю рэйсавыя аўтобусы развозілі здраднікаў вёскі з торбамі, наладаванымі бульбай, і гумовымі грэлкамі з самагонкаю. Аднак гэтае пакаленьне яшчэ захавала сялянскія веды, будучы здатным на ўсялякую працу — запрэгчы каня, накляпаць касу, абагнаць бульбу.

На вёсках паціху пямiралі родныя, езьдзіць дапамагаць не было куды, і таму першае пакаленьне, маючы цягу да зямелькі, ухапілася за дачы. Тое пакаленьне (нашы бацькі, а ў каго й дзяды) цяперака як чорны вол шчыруе, ня бачачы прасьветлае гадзіны, на сваіх сотках, змагаецца з пустазельлем і кратамі, каб пасьля пахваліцца экалягічна чыстым ўраджаем.

Іх дзеці — другое, так бы мовіць, пакаленьне — саступае яшчэ на крок — кажа, што лягчэй гэтую бульбу і гуркі купіць, чым гарбаціцца. Старыя скардзяцца: дзяцей не загнаць на дачу, моладзь агінаецца ды ўвільвае. Усё паўтараецца наноў — тая самая здрада бацькоўскаму палетку, якім некалькі дзясяткаў год таму здрадзілі старэйшыя. Моладзь дапамагае крыху татку з мамкаю, каб сумленьне не загрызла. Гэтая моладзь яшчэ не зусім страціла дзядоўскую навуку ды здатная выкапаць і пасадзіць бульбу, прывезьці гародніну дахаты, абабраць парэчкі. Але само, выпеставанае ў гарадзкіх кватэрах, другое пакаленьне для сябе брацьсотак ніколі ня будзе.

Калі адыдзе першае пакаленьне, лецішчы другому ня будуць патрэбныя. Хіба што на шашлык які зьезьдзіць ці яблыкі абтрэсьці.

Магчыма, праз якія дваццаць год цяперашнія вырaслыя падшыванцы будуць тыркаць пальцам на экран з кланаванай бульбай пад маналёг дыктара пра рэкордныя ўраджаі ды павучаць сваіх дзяцей: «Я ж у тваё гады бацькам на лецішчы дапамагаў мяхі ў машыну насіць, а вы тут як клёцкі ў масьле жывяце…»

Беларусы паціху ператвараюцца ў эўрапейскую нацыю, што на выхадных хоча адпачываць і забаўляцца, глядзець сьвет ды розныя дзівы. Дзядоўскі палетак праз гэтых лайдакоў зарасьце дзірваном.

*Баранавічы*

## ГАСПАДАРКА СЬЦІСЛА

### SOS ад «Нёману»

Шклозавод «Нёман» (Бярозаўка), які нядаўна наведаў прэзыдэнт краіны, просіць дапамогі: заводу тэрмінова патрэбны $10 млн крэдытаў на выплату пазык і мадэрнізацыю вытворчасьці. Праўда, урад праводзіць рэанімацыю заводу не сьпяшаецца, мяркуючы, самі вінаватыя: штогод з заводу наўпрост выносілася 30—35% прадукцыі.

### Запахла атамам

Праект пабудовы ЦЭЦ у Берасьці можа быць перагледжаны. ЦЭЦ мусіла працаваць на вугалі, аднак у «Берасьцеэнэрга» актыўна абмяркоўваецца магчымасьць замены вугалю на іншы від паліва ці наагул адмовы ад будаўніцтва. Калі рашэньне пра будаўніцтва атамнай электрастанцыі ў Беларусі будзе прынята, станцыя коштам $140 млн зробіцца непатрэбнай, мяркуюць энэргетыкі.

### МАЗ у Румынію

МАЗ выйграў тэндэр на пастаўку 30 аўтобусаў у Румынію. Машыны маюць рухавікі «Мэрсэдэс» стандарту «Эўра-3» і месцы для інвалідных вазкоў. Конкурс на пастаўку аўтобусаў на радзіму Сьцяпана Батуры МАЗ выйграе ўжо пяты год запар.

### Красоўкі для Хуана

Фірма «Белкельме» вырвалася на рынак ЭЗ. Упершыню прадпрыемства накіравала на экспарт у Гішпанію 1100 параў красовак. Дагэтуль абутак ішоў на продаж толькі ў Беларусь ды краіны СНД. Гішпанская фірма «Кельме» валодае 33% акцый зарэгістраванага ў Белаазерску СП «Белкельме». У першым паўгодзьдзі фірма вырабіла 89 тыс. параў спартовага абутку.

### Гандаль зьліткамі

Нацбанк пачаў ня толькі прадаваць, але і купляць у насельніцтва срэбныя ды плацінавыя зьліткі. Іх продаж быў распачаты два з паловай месяцы таму. За гэты час ўжо набыта 30 кіляграмаў срэбра і тры кіляграмы плаціны.

### Бабульчына бяда

Дэпутаты Менскага гарсавету зацьвердзілі стаўкі адзінага падатку для прадпрымальнікаў. У сярэднім яны зьніжаны на 15—20%, але тым, хто мусіць плаціць ПДВ, радасьці ад гэтага мала. Непрыемны сюрпрыз падрыхтавалі дэпутаты бабулькам-прадпрымальніцам: за права гандляваць на вуліцы шкарпэткамі і іншымі саматужна вязанымі вырабамі цяпер трэба плаціць 30 эўра ў месяц, поліэтыленавымі пакетамі — 35 эўра.

**АК, АФН**

### КУРСЫ ВАЛЮТ

**на 14 ліпеня:**

1 амэрыканскі даляр — 2 150 рублёў
1 эўра — 2 620,42 рубля.
1 латвійскі лат — 3 765,65.
1 літоўскі літ — 758,99.
1 польскі злоты — 634,17
1 расейскі рубель — 75,26.
1 украінская грыўна — 426,80.

**Паводле Нацбанку**

# Намоленае месца

Ужо чатыры месяцы, штодня на ганку касьцёлу Сьвятога Язэпа ў Верхнім горадзе а 19-й зьбіраецца купка людзей. Яны моляцца, каб Госпад і ўлады вярнулі ім сьвятыню. Піша **Сяргей Харэўскі**.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

У 1990-м самую вялікую па плошчы культавую будыніну сталіцы фармальна перадалі грэка-каталікам, якія і зарэгістравалі па гэтым адрасе парафію Сьвятога Язэпа. Аднак архівы з будынку — тут месьцяцца Архіў-музэй літаратуры і мастацтва і Архіў навуковай дакумэнтацыі — ніхто ня вывез. Нейкі час уніяты маліліся ў капліцы ў колішніх гандлёвых радах, покуль іх адтуль у 1995 г. ня выгналі. Сёньня парафія Сьв.Язэпа ня мае сродкаў, каб правесьці аднаўленьне касьцёлу. Таму уніяты адракліся правоў на яго, разьлічваючы наўзамен атрымаць дзялку й дазвол на будаўніцтва ўласнае капліцы ў Менску. Не атрымалі нічога.

Сёлета з ініцыятывай вяртаньня каталікам бажніцы, якая налічвае 380-гадовую гісторыю, выступілі рыма-каталікі. У Менску зарэгістравана рыма-каталіцкая парафія Сьв.Язэпа. Таму Канфэрэнцыя каталіцкіх біскупаў накіравала ліст да кіраўніцтва краіны з просьбаю аб перадачы касьцёлу вернікам.

Колькасьць вернікаў расьце, на Вялікдзень у касьцёлы ня ўбіцца, таму бажніца Сьв.Язэпа будзе ім цалкам дарэчы. Да таго ж, у Менску да сёньня няма ніводнага каталіцкага манастыра. Яго ўзьнікненьне — толькі пытаньне часу, а таму бэрнардынскі кляштар надаўся б як найлепей у гэтай справе.

Ёсьць і іншы клопат: новыя пражэкты рэканструкцыі старога Менску пужаюць тых, каму неабыякавы лёс помнікаў.

Паводле адных зьвестак, з колішняга кляштару бэрнардынаў зьбіраюцца зрабіць бізнэс-цэнтар, паводле іншых — перадаць РПЦ. Ведаючы, як робяцца апошнім часам у нас рэстаўрацыйныя работы, можна ўпэўнена сьцьвярджаць, што ў лепшым выпадку гэта будзе пахабны «эўрарамонт». Ужо цяпер з касьцёлу паскідалі керамічную дахоўку, каб замяніць на модную мэталадахоўку.

Сумны лёс напаткаў могілкі XVII—XVIII ст., так званыя «бэрнардыны», што месьціліся на цьвінтары Сьв.Язэпа. У мінулыя часы сьвятароў ды вядомых асобаў заўжды хавалі проста ля сьвятыняў. Рэшткі кладоў былі зьнішчаны ў 2002 годзе падчас будаўніцтва піўнога рэстарану на месцы колішніх гандлёвых радоў «Віленчукоў».

Між тым будынак унікальны. Адмыслоўцы пераканаяня, што пад слаямі тынку й фарбы на сьценах засталіся старажытныя росьпісы XVII—XVIII ст. Менск мог бы аднавіць самы старажытны інтэр'ер сьвятыні. Тыя, хто дбае пра вяртаньне храму, ня маюць адказу ад уладаў. Пры гэтым яны пачуваюцца самотнымі, бо ксяндзы таксама адмоўчваюцца... На вуліцы моляцца людзі без сваіх сьвятароў.

**Кляштар бэрнардынаў** быў заснаваны ў Менску ў 1624 г. па фундацыі краснасельскага старосты **Андрэя Кансоўскага** і ягонага брата Яна, паводле якой манахам перадаваўся драўляны дом на ўсходнім баку Верхняга рынку. У 1630-х гадах бэрнардыны пабудавалі драўляныя касьцёл і канвэнт на рагу кварталу, утворанага рынкавай плошчай і Вялікай Бэрнардынскай. Да 1652 г. былі ўзьведзены мураваныя будынкі, а ў 1752 г. пабудовы набылі цяперашні выгляд. Пры канцы XVIII ст. кляштар складаўся з касьцёлу й далучанага да яго жылога корпусу, некалькіх флігеляў, трапезнай, школы, шпіталю, стайні, бровару ды шэрагу гаспадарчых пабудоў. Утвораны ім квартал быў абнесены высокай каменнай агароджай з брамамі, галоўная зь якіх — перад касьцёлам — мела трохпралётную кампазыцыю, завершаную «вазонамі вытачанымі». Пасярэдзіне кляштарнага двара быў выштукаваны сонечны гадзіньнік. Менскі комплекс прадстаўлены на мапе бэрнардынскіх канвэнтаў, гравіраванай у Нясьвіжы **Гіршам Ляйбовічам** у 1760-я гады. Кляштар звычайна насялялі 20 законьнікаў. Пры ім дзейнічала школа філязофіі, пачатковая школа сыстэмы Бэла-Ланкастэра. Бібліятэка кляштару лічылася найбуйнейшай у Менску.

Маршалак літоўскі і віленскі кашталян **Крыштаф Завіша**, які за вялікія грошы вымураваў у 1676 г. капліцу, спачывае ў сутарэньнях касьцёлу разам з братам **Андрэем** і сынамі **Янам Казімерам** і **Юр'ем**. У крыпце пахаваныя таксама прадстаўнікі вядомых родаў **Кансоўскіх** ды **Тышкевічаў**. На 1864 г. кляштар заставаўся апошнім дзейным з васьмі мужчынскіх каталіцкіх кляштараў Менску. Але 29 жніўня 1864 г. пасьля здушэньня паўстаньня і ён быў скасаваны. Будынак аддалі праваслаўным, якім не хапала «спэцыялістаў», каб «асвоіць» усё рэквізаванае, таму пасьля пажару 1872 г. прыстасавалі пад архіў. Пасьля гэтага шыкоўны франтон касьцёлу разабралі, дах панізілі. У кляштарных жа карпусах разьмясьціліся кашары Каломенскага пяхотнага палка й дзяржаўная сьледчая камісія. Багаты дэкор дзевяці аўтароў быў зьнішчаны. Толькі ў 1983 г. знадворны выгляд касьцёлу быў рэстаўраваны.

## СЬЦІСЛА

### Пяцімільённы штраф

6 ліпеня на плошчы Леніна ў Горадні міліцыянты затрымалі пяць журналістаў, што пратэставалі супраць умяшаньньня ўладаў у выданьне газэты Саюзу палякаў «Głos znad Niemna». Склалі пратаколы за непадпарадкаваньне міліцыі, удзел у несанкцыянаваным пікеце і за антысанітарыю: пікетоўцы паклалі на газоне свае рэчы. 7 ліпеня суд Ленінскага раёну аштрафаваў ўдзельнікаў акцыі рэдактара часопісу «Магазын польскі» **Андрэя Пачобута** на 5 млн 125 тыс. руб. і журналіста газэты «Głos znad Niemna» **Ігара Банцара** на 510 тыс. руб. 8 ліпеня астатнім удзельнікам — галоўнаму рэдактару газэты **Анджэю Пісальніку** і карэспандэнту газэты «Салідарнасць» **Івану Роману** — далі па 2 млн 550 тыс. штрафу, **Інэса Тодрык** пакараная штрафам у 20 б.в. (510 тыс.). Журналістаў, якія прыйшлі падтрымаць калег, не пусьцілі ў будынак суду.

### На Берасьцейшчыне

9 ліпеня міліцыя затрымала ў Дамачаве (Берасьцейскі раён) удзельнікаў сходу па выбраньні дэлегатаў на Кангрэс дэмакратычных сілаў (КДС) Берасьцейскага сельскага раёну. На дзесяцёх удзельнікаў сходу зь Менску былі складзены пратаколы за парушэньне рэжыму знаходжаньня ў памежнай зоне. Сярод іх **Станіслаў Шушкевіч**, **Аляксандар Бухвостаў**, **Анатоль Лябедзька**, **Тацяна Ваніна**. На вядучага сходу, мясцовага дэпутата **Анатоля Новіка**, склалі пратакол за арганізацыю несанкцыянаванага сходу. Канфіскавана друкаваная прадукцыя.

### Пагроза над Эвангельскай царквой

Менгарвыканкам накіраваў у Менгарсуд пазоў аб ліквідацыі рэгістрацыі Беларускай эвангельскай царквы. Чыноўнікі лічаць, што ў эвангелістаў адсутнічае юрыдычны адрас. Суд прызначаны на 18 ліпеня.

### Зноў затрыманы Шыдлоўскі

8 ліпеня ў Менску арыштавалі актывістаў руху «Зубр» **Аляксея Шыдлоўскага** і **Васіля Жакава**. У Савецкім РАУС склалі пратаколы па арт.172 (ч.3) — распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных зьвестак. У гэты ж дзень А.Шыдлоўскага затрымалі зноў і даставілі ў Савецкі РАУС.

### Уціск Грамады

8 ліпеня **Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі «Грамада»** не дазволілі зрабіць чарговую спробу правесьці ў Менску аб'яднаўчы сход.

### У Залесьсі

6 ліпеня ў в.Залесьсе атрад міліцыі з Чачэрску (Гомельская вобл.) на чале з маёрам Цалком сарваў раённы сход па выбраньні дэлегатаў на Кангрэс дэмакратычных сілаў. Свой візыт у прыватны вясковы дом міліцыянты растлумачылі пошукам забітага чалавека і наркотыкаў. Яны ўчынілі пашпартную праверку ўсіх удзельнікаў сходу. З гаспадара дома ўзята пісьмовае тлумачэньне.

### Ціск на прафсаюзы

5 ліпеня УП «ЖРЭТ Партызанскага раёну г.Менску» паўторна адмовіла кіраўніцтву **Свабоднага прафсаюзу Беларускага** ў падаўжэньні дамовы аб арэндзе і прапанавала да 30 ліпеня вызваліць памяшканьне па вул.Захарава, 24 у Менску. Кіраўніцтва СПБ лічыць патрабаваньні незаконнымі і гатова разьбірацца ў судзе.

### Перамога прафсаюзаў

7 ліпеня юрысты прафсаюзу работнікаў радыёэлектроннай прамысловасьці адстаялі ў судзе правы сябра прафсаюзу РЭП **Валер'я Алёнава**. Адказчык — ТДА «Ліга» — заплаціў яму кампэнсацыю ў памеры 645 тыс. руб.

### Зьбілі Завадзкую

7 ліпеня АМОН разагнаў акцыю на Кастрычніцкай плошчы з нагоды пятай гадавіны зьнікненьня Зьмітра Завадзкага. Адзін зь міліцыянтаў ударыў у твар яго жонку **Сьвятлану Завадзкую**. У больніцы ёй паставілі дыягназ: удар мяккіх тканак галавы і твару. Жонка зьніклага журналіста зьбіраецца падаваць скаргу ў пракуратуру і ў беларуска-расейскую камісію, якая створана ў складзе Савету праваў чалавека пры прэзыдэнце Расеі.

### Васільева вызвалілі

**Валера Леванеўскага** не ўключылі ў сьпіс тых, хто падпадае пад амністыю. На камісіі па справах амністыі палітвязьню паведамілі, што ён зьяўляецца «злосным парушальнікам». Леванеўскага прынялі на працу днявальным у мэдычную часьць калёніі. Цяпер ён будзе атрымліваць 9 тыс. руб. у месяц. А вось другі палітвязень — **Аляксандар Васільеў** – трапіў пад амністыю. Ён прасядзеў у турме траціну прысуджанага тэрміну (8 месяцаў) і 7 ліпеня быў вызвалены.

### Не працягнуты кантракт зь беларускамоўным

Аддзел адукацыі Сьветлагорскага раёну адмовіўся працягваць кантракт з **Генадзем Бядой**, настаўнікам хіміі і біялёгіі Прудкоўскай школы, сябрам КХП-БНФ. Настаўнік вёў свае прадметы па-беларуску.

### У Горадні

6 ліпеня пяцёра пакараных судам Кастрычніцкага раёну Горадні за ўдзел у акцыі, прымеркаванай да шостых угодкаў зьнікненьня Юр'я Захаранкі, падалі скаргі ў Вярхоўны суд. Гэта ўжо трэцяя інстанцыя, дзе **актывісты АГП** абскарджваюць незаконнае рашэньне раённага суду.

### У Пінску

9 ліпеня ў Пінску быў сарваны сход жыхароў для вылучэньня дэлегатаў на Кангрэс дэмакратычных сілаў. Былі затрыманы для надгляду й праверкі дакумэнтаў пасажыраў увесь транспарт, які меўся даставіць удзельнікаў на месца, у тым ліку аўтамабіль **Аляксандра Мілінкевіча**. **Юрася Губарэвіча** затрымаў асабіста начальнік ДАІ Пінскага раёну. З багажнікаў аўтамабіляў былі канфіскаваны інфармацыйныя матэрыялы.

### Напад на дом Кішкурны

Увечары 9 ліпеня каля паўтара дзясятку людзей у міліцэйскай форме і ў цывільным уварваліся ў прыватны дом старшыні Менскай гарадзкой арганізацыі Партыі БНФ **Уладзімера Кішкурны**. Каб пранікнуць у дом, яны выбілі дзьверы й выламалі акно. У доме знаходзіўся толькі 22-гадовы **сын грамадзкага дзеяча Антон**. Яго затрымалі на падставе абвінавачаньня ў захоўваньні боепрыпасаў і даставілі ў Цэнтральны РАУС. Сканфіскаванае друкарскае абсталяваньне.

### У Ашмянах

11 ліпеня памежнікі затрымалі намесьніка старшыні Саюзу палякаў **Юзафа Пажэцкага** і галоўнага рэдактара часопісу «Magazyn Polski» **Андрэя Пачобута**. Ім далі папярэджаньне за «парушэньне рэжыму знаходжаньня ў памежнай зоне». Міліцыя прызналася, што затрымала іх «паводле апэратыўнай інфармацыі». З гэтага актывісты зрабілі выснову, што іхныя тэлефоны праслухоўваюцца.

**Сяргей Будкін**

## Угодкі бітвы пад Палонкаю



Баранавіцкая суполка ТБМ зладзіла сьвяткаваньне 345-х угодкаў перамогі пад Палонкаю. Тут у 1660 г. адбылася пераломная бітва ў вайне Расеі з Рэччу Паспалітай, празванай Патопам. Войска ВКЛ і Кароны сустрэлася з маскоўскім войскам на чале з ваяводам Хаванскім. Маскоўцы, разбэшчаныя лёгкімі здабычамі, недаацанілі апанэнтаў. У сярэдзіне 1990-х на месцы бою, наўзбоч дарогі на ўезьдзе ў мястэчка, баранавіцкія патрыёты ўрачыста паставілі камень, які асьвяцілі праваслаўны і каталіцкі сьвятары. Прымацавалі шыльду, праз пару гадоў яе скралі. Цяпер патрыёты плянуюць проста выбіць надпіс на камені.

Сёлета службу па абаронцах Бацькаўшчыны правёў уніяцкі сьвятар айцец Маліноўскі. Перад прысутнымі выступілі навучэнцы баранавіцкіх навучальных установаў і мясцовы гісторык Васіль Дубейка. Гэта ўжо другая сёлета акцыя баранавіцкіх актывістаў. Месяцам раней падобная паездка была ў Мілавіды, на ўшанаваньне памяці ваяроў Каліноўскага.

**Руслан Равяка, Баранавічы**
**Фота Ігара Юркевіча**

# Варнянскае сьвята

Калі душа просіць сьвята — трэба проста ўзяцца і арганізаваць яго. Так паступілі жыхары астравецкай вёскі Варняны — цэнтру заможнай гаспадаркі з аднайменнай назвай.
Кажуць, што ганарыстасьць варнянцаў сваёй неабдымнасьцю спаборнічае хіба што з хітрасьцю аўцюкоўцаў.

Варняны «засьвяціліся» ў аналах гісторыі яшчэ ў 1391 годзе. Напачатку імі валодаў легендарны Ягайла, затым — асобы, набліжаныя да гаспадароў ВКЛ, урэшце беларускі род Абрамовічаў. Менавіта яны пабудавалі ўнікальны архітэктурны ансамбль, што захаваўся да нашых дзён. У ягоны склад уваходзяць касьцёл Сьвятога Юр'я, плябанія і парафіяльны дом, а таксама плошча, якую акаляюць два рады мураваных дамоў для прыгонных сялян і парк. Вянцом ансамблю некалі быў панскі палац — сёньня на яго месцы зелянее трава.

Усе варнянцы — і стары, і малы — сабраліся 26 чэрвеня на плошчы на сьвята вёскі пад назвай «Ад пляцу — да палацу». Сьпяваў выдатны народны калектыў «Сьвітанак», ёсьць добрыя салісты, жаночая вакальная група «Берагіня»… А ўжо танцы! Хоць што расказваць — іх трэба бачыць. Завіталі ў госьці да варнянцаў і сталічныя артысты — сьпевакі і музыканты на чале з экс-лідэрам «Камэлёту» Зьмітром Сідаровічам.

Спрыт у валоданьні баявым мячом дэманстравалі сапраўдныя рыцары менскага клюбу «Меч і воран» на чале з самім «сэрам Гэнры» (Сяргеем Паўлавым). Лучнікі вучылі мясцовы люд страляць з лука, а іх прыгожыя пані радавалі вочы прысутных гібкасьцю станаў і старажытнымі танцамі.

На спартыўнай арэне мястэчка таксама кіпелі страсьці: «ірвалі» гіру асілкі, высьвятлялі дачыненьні валейбалістыпляжнікі, кожны да сябе цягнулі канат аматары гэтага віду спорту. Дарэчы, не абышлося без канфузу: калі на пляцоўку выйшла жаночая каманда, моцная палова чалавецтва паставілася да яе паблажліва, за што і была пакарана — літаральна праз 10 сэкундаў мужчыны адпачывалі на траве.

На адным са ставоў заклiналі сястрыцу Фартуну яшчэ адны канкурсанты — аматары рыбнай лоўлі.

Бліжэй да вечара на востраве, ля Варнянскай чырвонай вежы, пачалося Купальле. У самы разгар якога сваё прывітаньне прысутным даслалі нябёсы: «Варняны-2005» — такі штандар лунаў у руках параплянэрыста Г.Заранковіча. Зь зямлі ў паветра ўзьляцелі коркі ад шампанскага.

А завяршыўся сьвяточны маратон далёка за поўнач — традыцыйнымі танцамі. Нястомнасьці танцораў заставалася толькі пазайздросьціць.

**Хрысьціна Прыходзька**

## СЬЦІСЛА

### Сагановіч у Полацку

7 ліпеня слынны гісторык Генадзь Сагановіч наведаў Полацак. Адбылося гэта ў неспрыяльны час — якраз праходзіла пілігрымка грэка-каталікоў, таму адсутнічала частка яго патэнцыйных «фанаў». У гарадзкой бібліятэцы імя Скарыны Сагановіч распавёў пра «Беларускі гістарычны агляд», кнігі сэрыі «Бібліятэка часопісу «БГА». Палачан цікавіла, як далёка пашыраецца за часамі РБ беларуская гістарыяграфія ў сьвеце. Сагановіч шчыра прызнаўся, што Беларусь паранейшаму ня ведаюць у Эўропе. Так, летась гісторык быў надзвычай уражаны: нямецкія дасьледчыкі рэфармацыі, зь якімі ён сустракаўся, ніколі ня чулі імя Скарыны.

Прыхаваў Генадзь і сэнсацыйную навіну для палачан. У бібліятэцы нямецкага гораду Вальфэнбютэль ён адшукаў старадрук 1581 году сьвятара Паўля Адэрборна. Аўтар падрабязна апісвае ўбачанае ў Дзісьне, Полацку і іншых ліцьвінскіх мясьцінах падчас побыту на Полаччыне. Кніга спачатку выйшла лацінскай мовай, а затым па-нямецку. Цяпер ажыцьцяўляецца пераклад з лаціны на беларускую. Сагановіч паабяцаў адну зь першых прэзэнтацый «Праўдзівых і грунтоўных апісаньняў русінаў» зрабіць у крыўскай сталіцы.

### Пілігрымаў не пусьцілі ў Сафійскі сабор

9 ліпеня на Полаччыне скончылася традыцыйная грэка-каталіцкая пілігрымка. Яна пачалася ў Віцебску ад Усьпенскай горкі — месца, дзе быў забіты Язафат Кунцэвіч. А завершылася ля муроў Сафійскага сабору, дзе 300 гадоў таму былі забіты служкамі Пятра I пяцёра базыльянаў. Іх цяпер называюць полацкімі пакутнікамі. У Віцебск прыехалі грэка-каталікі з усіх куткоў Беларусі, а таксама Ўкраіны і Расеі — усяго больш за 200 чалавек, у тым ліку групы манахаў двух ордэнаў — студыцкага і базылянскага.

Летась улады дазволілі пілігрымам наведаць Сафійскі сабор і правесьці ў ім канцэрт духоўнай музыкі. Сёлета арганізатары таксама падалі заяўку на правядзеньне канцэрту. З Івана-Франкоўску нават прыехаў харавы калектыў «Асанна» — дыплямант міжнародных конкурсаў, у тым ліку і «Магутнага Божа». Аднак у Сафійскі сабор пілігрымаў не пусьцілі, замест таго сустрэлі на Верхнім замку ўзмоцненым нарадам міліцыі з тэлекамэрай. Пілігрымы памаліліся перад зачыненай брамай сабору, тамсама выступіў хор.

Упершыню за ўсе гады ўніятамі так шчыльна апекавалася міліцыя. У вёсцы Слабада ім нават адмовілі ў начлезе ў мясцовым клюбе, хоць была папярэдняя дамоўленасьць. Затое па-хрысьціянску гасьцінна віталі пілігрымаў у полацкай стараверскай Сьвята-Ўсьпенскай царкве. Вандроўнікаў запрасілі ў храм, дзе пілігрымы мелі магчымасьць памаліцца, напаілі калодзежнай вадой, пажадалі божага спрыяньня ў іх справах.

### Полацкія супэрмаркеты

1 ліпеня ў Полацку зьявіўся яшчэ адзін буйны гандлёвы цэнтар — «Эўралюкс». Ён разьмясьціўся на двух паверхах супэрмаркету «Стралец».

Цэнтар Полацку перанасычаны буйнымі гандлёвымі прадпрыемствамі. Усё пачалося напрыканцы 1990-х, калі гандлёвы дом «Стралец» набыў напаўразваленую базу «Гарсьвятла» ля аўтавакзалу і пачаў з нуля ўзводзіць Стралецкі рынак. Спачатку ўзьнік двухпавярховы гандлёвы комплекс, а затым як грыбы вакол яго пачалі расьці гандлёвыя павільёны. Як для райцэнтру, у які ўпарта ператваралі старажытны горад улады, будынак рынку выглядаў нібы казачны замак.

Празь нейкі час наваполацкая гандлёвая сетка «Эканом» выкупіла насупраць чыгуначнага вакзалу дзяржаўную краму і зрабіла зь яе прыстойны міні-маркет. Так у Полацку зьявілася першая крама з аўтаматычнымі дзьвярыма. Да «спрэчкі» далучыўся яшчэ адзін мясцовы гігант — гандлёвая сетка «Дыяніс», якая выкупіла частку плошчаў Полацкай кравецкай фабрыкі «Мона» ды зрабіла эўрапейскі супэрмаркет «Дыяніс» — найбліжэйшы да аўтавакзалу.

Гаспадар фірмы Барыс Цлаф у якасьці партнэра ўзяў літоўскую фірму NPI. Нават дызайнэр, які працаваў над супэрмаркетам, прыехаў зь Вільні — Томас Будзінас. Абсталяваньне прывезьлі з Швэцыі і Даніі. 23 сакавіка «Дыяніс» гасьцінна расчыніў свае вялікія аўтаматычныя дзьверы.

І «Стралец», і «Дыяніс», і «Эканом» істотна русіфікавалі сваёй рэклямай Полацак і Наваполацак — фірмы ўпарта адмаўляюцца рабіць свае шыльды па-беларуску. Дарэчы, шыкоўную шыльду супэрмаркету «Стралец» рабілі маскоўскія спэцыялісты. Захараў у свой час паведаміў журналістам, што гэткі цуд тэхнікі — шыльда зроблена з оптавалакна і можа плаўна мяняць свой колер — у расейскай сталіцы мелі толькі клюб «Мяцеліца» і казіно «Голдэн пэлас».

А ў Захарава пасьля канфлікту праз «Мону» пачаліся цяжкія часы. Нечакана ў прэсе зьявілася рэкляма аб продажы або здачы ў арэнду часткі крамаў імпэрыі «Стральца». Аднак свае будаўнічыя праекты бізнэсовец не спыняе — будуе самы вялікі ў рэгіёне супэрмаркет, гэтым разам у Наваполацку.

**Васіль Кроква, Полацак**

# Не чакаюць у Горадні ні варагаў, ні грэкаў



СЯРГЕЙ МАКСІМОВІЧ

**11 ліпеня ў Горадні прышвартаваўся ўкраінскі дракар «Сварог».**

Гарадзенскія ўлады здолелі сарваць аранжавую рэвалюцыю. Памфлет **Сяргея Максімовіча**.

Дня 11 ліпеня ў слаўным месьце Горадні прышвартавалася вараская ладзьдзя са старажытным імем «Сварог». І хоць сто гадоў сюды не прыходзілі караблі, ды яшчэ з замежжа, на жыхароў гэта не зрабіла ніякага ўражаньня. Не зьдзівілі ні памеры, ні выгляд архаічны. Не ступілі на прыстань і ўлады, каб прывітаць мараплаўцаў, якія трапілі ў Нёман з Балтыкі, і нават хлеб-соль з дзяўчатамі не прыслалі.

Учынак мясцовага начальства інакш як дзіўным не назавеш. Бо толькі-толькі сама вярхоўная ўлада абвясьціла, што заманулася ёй аднавіць шлях з варагаў у грэкі. Не інакш, мелася на ўвазе, што гэным варагам надакучылі «скандынаўскія авіяліініі» — і яны жадаюць на міжземнаморскія курорты езьдзіць шляхам сваіх незабыўных продкаў. І кінуліся, не марудзячы, паглыбляць Аўгустоўскі канал, абвясьціўшы яго ледзьве ня «сталінскай будоўляй камунізму».

У гэты момант у Горадню прыплывае сапраўдная вараская ладзьдзя! Нельга ня зьняць капелюша перад нашымі слаўнымі памежнікамі, якія цярпліва чакалі на рачным-памежным беразе экзатычны вялікі човен. Зрабілі яны выгляд, што ладзьдзі ды дракары тут караванамі ідуць, і спрактыкавана праштэмпэлявалі пашпарты камандзе.

Дарма спадзяваліся сучасныя варагі на беларускую гасьціннасьць. Няпрошаным гасьцям далі зразумець, што іх прыезд нагадвае несанкцыянаваную акцыю. Бо каб яны ўсьвядомілі, дзе маюць апынуцца, дык павінны былі за пятнаццаць дзён асабіста падаць уладзе заяву, што хочуць прыбыць у горад і масава высадзіцца на прыстані. А гэтага зроблена не было! Тады хай радуюцца, што не сустрэў іх заўжды гатовы беларускі АМОН.

Можна ўявіць сабе думкі ўлады. Замест клясычных вікінгаў у рагатых шлемах і кальчугах у ладзьдзі плылі ўладальнікі пашпартоў са старадаўнім гербам — трызубам, з «Пагоняй», з арлом у кароне ды пару сваіх беларусаў. Непарадзе мясцовы сьцяг з арнамэнтам (каб, крый божа, не стралялі), ззаду — блакітнажоўты. Але ж гэткага суседзтва менавіта беларуская ўлада зь ейных ног да галавы баіцца сёньня горш ад агню. Бо ў яе палахлівай галаве, нібы ў альхімічнай рэторце, сумесь блакітнай фарбы з жоўтай перетварэцца нечакана ў аранжавую! А аранжавага ўлада папросту пужаецца.

У замежным Каўнасе ладзьдзя з камандай стала гваздом сьвята ўгодкаў каранацыі Міндоўга. У месьце Гарадзенскім каралёў таксама як агню баяцца, ня меней ад колеру апэльсінаў ды мандарынаў — уладзе ўсё болей цароў падавай. Вось, бывала, прыходзіла маскоўская навала, паліла горад, жыхароў у палон у любую Маскву забірала. Вось гэта ўгодкі, вось гэта сьвята! А калі Кацярына захапіла Горадню? Гэта для ўлады папросту цымус гістарычны, яна яго гатовая смакаваць ды смакаваць, нарабіўшы каўбасы «губэрнскай».

Сьніць мясцовая ўлада па начах гурты замежных турыстаў, бо гэтак загадана са сталіцы — любым гвалтам іх сюды цягнуць і валюту вытрасаць. Але ўжо мала замежнікаў засталося, якія не баяцца наведацца ў краіну сталінскіх умацаваньняў, а хто не баяўся, ужо пачаў баяцца. Мала таго што нядаўна несьвядомыя амэрыканцы візы беларускія пакуплялі, дык яшчэ мусілі рэгістравацца, а не зарэгістраваліся — міліцыя і пакараньне. А наступным разам — у кайданкі!

> Мала замежнікаў засталося, якія рашаюцца наведацца ў краіну сталінскіх умацаваньняў.

Гарадзенскай уладзе загадана вазіць замежных турыстаў па Аўгустоўскім канале, пачынаючы з наступнага году. Але, дапусьцім, захацелася беларусам на свой канал паглядзець, сядаюць яны ў машыны, едуць, а там іх сустракаюць доблесныя памежнікі і складаюць пратаколы, а потым цікаўных штрафуюць бязьлітасна, бо — памежная зона! Як у памежнай зоне развіваць замежны турызм, яшчэ болей незразумела — хіба што пад вартай, «пад канвоем», бо хто іх ведае — замежнікаў!

Вычытала яшчэ мясцовая ўлада ў кніжцы пра Аўгустоўскі канал, што тамака перад апошняй вайною будавалася «лінія Молатава», і пачала ўлада мроіць: чым молатаўскі «ўкрэпраён» горшы ад сталінскага, чаму б не аднавіць? Замежны турыст касякамі паедзе, адных матрошак ды ікры ўжо замала, каб прыцягнуць сэраў і містэраў. А спачатку пабудуем, зробім шоў з танкамі ды гарматамі.

Седзячы ў шкуры ўлады, пачынаеш міжволі падзяляць замежнікаў на сваіх і чужых. На поўначы — не свае, натаўскія, на поўдні — таксама ў тым кірунку пнуцца ды яшчэ аранжавай заразай спрабуюць заразіць. Нам такіх ня трэба. Тыя, што на захадзе, цяпер да нас самі не паедуць, бо дзеля чаго мы гэтак упарта і зацята душым Саюз нашых палякаў? Ну зразумела — каб тыя палякі сюды носу не паказвалі, не нанесьлі сваёй заразы натаўскай.

Складаная, вельмі нэрвовая служба ў мясцовай улады. Бо дзе ў такіх умовах браць замежнага турыста, плян па якім сталіца спускае зьверху? І раптам я раблюся відушчым паўладнаму: эўрыка! А фэст гарадзенскі нацкультур навошта, дзеля чаго? Дзеля гэтага! Дзеля свайго, бясьпечнага замежнага турыста!

Прыгадаў я вельмі дарэчы, як апошнім разам на адкрыцьці фэсту адзін армянін выклікаў замілаваньне і воплескі з боку ўлады, расказаўшы ў мікрафон, як, сустракаючыся з армянскім прэзыдэнтам, наш пахваліўся: у мяне ёсьць свае армяне, харошыя рабяты. Цяпер улада хоча зрабіць сваіх палякаў, украінцы некаторыя, бадай, ужо ёсьць, грэкі таксама, немцы, казахі і гэтак далей.

З заплюшчанымі вачыма, у шкуры ўладнай я пачаў марыць у патрэбным рэчышчы: урачыстае адкрыцьцё штучнай воднай артэрыі, на параходах вязуць уласных замежнікаў, ніхто не палохаецца варты, калючага дроту ды іншых абавязковых атрыбутаў зоны памежнай пад назвай «Аўгустоўскі канал», бо ўсе мы выйшлі з краіны сярпа і молата, усе мы з-за калючага дроту, з-за жалезнай заслоны, а хто здолеў вымкнуцца з абдоймаў Вялікага Брата, уцячы ад нашай дружбы народаў, той — ня наш…

Ладзьдзю вікінгаў у гарадзенскім порце пагрузілі ў фуру і павезьлі ў Берасьце. Начальства ўздыхнула з палёгкай: аранжавай рэвалюцыі пакуль удалося пазьбегнуць.

МУШТАРДА

# Прынясіце жмут паперы



Пакуль у прыбіральні Нацыянальнай бібліятэкі няма туалетнай паперы, нашы дзяды могуць спаць спакойна. Фэльетон **Алеся Белага.**

Раптам заўважыў, што ўвосень споўніцца 20 гадоў, як я карыстаюся Нацыянальнай бібліятэкай. На пару месяцаў менш, чым нашаму з жонкай «раману». На 3-м курсе пайшлі складаныя курсавыя, і давялося шукаць кніжкі, якіх у інстытуце не знайшоў. Але ў верасьні, калі юбілей мог бы адзначацца шырокай грамадзкасьцю, гэтага зрабіць ня ўдасца — бібліятэка будзе зачынена на пераезд. На гэтай думцы я злавіў сябе, седзячы… не, не ў чытальнай залі ці каталёгу. Мая глыбокая задумлівасьць была выкліканая тым, што — як бы гэта далікатней — у кабінцы не было туалетнай паперы. Не таму што скончылася, а таму, што ніколі і не было. Бо «не паложана». Ці не павешана. Не было яе там і 20 гадоў таму, калі бібліятэка была яшчэ не Нацыянальнай, а Ленінскай. Ленін пайшоў, а справа яго жыве. Хочаце пераканацца? Зайдзіце ў прыбіральню любой грамадзкай бібліятэкі або любой прэстыжнай дзяржаўнай ВНУ — туалетнай паперы вы там ня знойдзеце.

За 20 гадоў бібліятэка зазнала шмат перамен: паўсюды цяпер танныя і даступныя ксэраксы, нават на самаабслугоўваньні, сканэр, лямінатар. Замест бруднага, амаль прывакзальнага буфэту — досыць прыстойная піцэрыя ў стылі гай-тэк. Зьявіўся і шапік з канцтаварамі — усё як у нармальных эўрапейскіх бібліятэках, якія так уразілі калісьці сваім камфортам. Сама бібліятэка хутка пераедзе ва ультрамадэрнісцкі будынак, які каштаваў краіне шалёныя грошы (злыя языкі кажуць — дзеля таго, каб вызваліць стары пад службу аховы). А паперы як не было, так і няма. Нават цывіка табе зь нізкай гарэзаных на кавалкі газэт. І ў кіёску з канцтаварамі не прадаюць.

Як жа санстанцыя? Можа, гэта змова трацкістаў-шкоднікаў? Або таемны зьвяз асабліва кансэрватыўных этнакультуролягаў парупіўся: каб ня трацілі канчаткова сувязі-повязі з каранямі-вытокамі, кожнае чарговае маладое пакаленьне не павінна бачыць у прыбіральнях туалетнай паперы. Ініцыятыва! Знак, які мусіць глыбока ўесьціся ў падсьвядомасьць. Бо з такіх дробязяў і пачынаюць жа прадаваць Радзіму! Пакуль паперы няма і пакуль нікому ў галаву нават не прыходзіць спытацца «Чаму?», нашы дзяды могуць спаць спакойна. Эўрапейскія панышавіністы ня пройдуць, і цывілізацыйны вэктар ня зьменіцца. (Цікава, а як у прыбіральні на «Лініі Сталіна»?).

Трэба забегчы днямі зноў у бібліятэку, пакуль яна канчаткова не пачала пераезд. Папрашу кнігу скаргаў. Куплю ў шапіку клей-аловак і ўклею туды выразку з гэтым артыкулам. Газэты ж ня толькі на тое, каб вісець на цьвіку.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

# Першая доктарка багаслоўя

Ірына Дубянецкая — першая беларуская жанчына, якая пасьпяхова абараніла дысэртацыю на атрыманьне ступені доктара багаслоўя. «Вучылася, вучылася і зрабілася вялікай вучонай», — з гонарам за сваю вучаніцу кажа айцец Аляксандар Надсан.

Ірына Дубянецкая атрымала стыпэндыю на навучаньне ў Лёвэнскім каталіцкім унівэрсытэце (Бэльгія) дзевяць год таму. З таго часу яна працавала над некалькімі навуковымі працамі па сакральнай тэалёгіі і арыенталістыцы, вывучала старажытныя мовы Блізкага Ўсходу. Гэтыя працы — дасьледаваньні старажытных міталягічных тэкстаў Блізкага Ўсходу і Біbліі — сышліся ў адну — доктарскую на тэму «Космас і хаос у Біbліі і старажытных міталёгіях Блізкага Ўсходу» (яе аб'ём пад 400 старонак). У ёй Ірына прааналізавала больш за тры тысячы тэкстаў, але шкадуе, што не зьвярнула ўвагі на здабыткі ўсіх пяці цывілізацый Старажытнага Ўсходу.

Дзень абароны супаў са сьвятам Яна Хрысьціцеля. Ірына кажа, што надвор'е ў той дзень было цёплае, адпаведнай была і атмасфэра ў аўдыторыі. Сябры камісіі ў такую сьпёку сядзелі ў сярэднявечных мантыях, але выслухалі беларуску зь вялікай цікавасьцю і палічылі яе працу каштоўным навуковым дасьледаваньнем доктарскага ўзроўню.

Айцец Надсан прысутнічаў на абароне доктарскай дысэртацыі і адным зь першых павіншаваў Ірыну. Радасьці за сваю былую вучаніцу не хавае: «Ірына так разумна і разгорнута напісала, што некаторых рэчаў і сам не разумею», — жартуе ён.

Пасьля цырымоніі наданьня беларускаму тэолягу доктарскай ступені айцец Надсан разам з парахам беларускага ўніяцкага прыходу ў Антвэрпэне Янам Майсейчыкам наладзілі мшу падзякі. Посьпех беларускі падзялілі яе сябры: у акадэмічным храме гучалі беларускія гімны і малітвы, ангельскія чытаньні, грэка-каталіцкія трапары і ўкраінская літанія.

Праз тыдзень першая доктарка багаслоўя прыяжджае на Радзіму. Яна не ўяўляе, чым будзе тут займацца, — унівэрсытэтаў, дзе можна выкладаць па гэтай спэцыялізацыі, у нас няма. «У Беларусі ніколі не займаліся дасьледаваньнем цывілізацый Старажытнага Ўсходу, — кажа Ірына, — але гэта і наша гісторыя, нашы карані, і калі мы іх ня будзем вывучаць, то ніколі ня ўключымся ў сусьветны кантэкст. Час жа мы дагэтуль адмяраем па-шумэрску».

**Сяргей Будкін**

## НАД ШУМАМ ДЗЁН

# Back in Biełaje Bałota



**СЯРГЕЙ БАЛАХОНАЎ**

Як грэшніка да сваіх грахоў, гэтак мяне часам цягне ў мясьціны колішніх творчых хуліганстваў. Бывае, гатовы кінуць усё, сесьці на цягнік і выправіцца ў вёску Белае Балота, куды быў некалі закінуты сьцюдзёнымі вятрамі ўнівэрсытэцкага разьмеркаваньня. Цікава паглядзець на калегаў і былых вучняў. Але прывідныя павукі пачынаюць цьвеліць мне сумленьне махнатымі лапкамі: пачуваю перад Белым Балотам пэўную віну.

Мінула шэсьць гадоў. Наймалодшыя з тагачасных маіх вучняў скончылі школу. Саму школу перарабляюць у базавую. Дэмаграфічная сытуацыя — абы-што, хоць дзьве белабалоцкія жанчыны атрымалі ад прэзыдэнта ордэн Маці за выхаваньне пяцярых дзяцей. Чарнобыльскае кляймо «зона пражываньня» не надае аптымізму, колькі б там ні было кюры на квадратны кілямэтар. Хто здатны, бяжыць ад такога шчасьця.

Былых вучняў-балацян выпадала сустракаць у Гомелі. Сваім часам яны былі *best of the best* сярод раўналеткаў. Дзеці вясковай эліты. Ніхто зь іх пры цяперашніх сустрэчах не пасьмеў мяне ўпікнуць за мае ўцёкі зь іхняга балота. «Правільна зьдзелалі», — апраўдваюць яны ня столькі мяне, колькі саміх сябе і ўласны намер не вяртацца дадому. Яны кажуць, што вёска перажывае глыбокі заняпад, пра які пісалі і ў сачыненьнях. «Зусім цяжка жыць, таму людзі не маральныя, а напроціў агрэсіўныя, злыя, не дапамагаюць адзін аднаму», — канстатаваў тады нехта. І як тут не дасі веры таму, калі іхнія ўчорашнія аднакласьнікі ўжо маюць за плячыма судзімасьці?

У крымінальных зводках мне трапляліся паведамленьні пра злачынствы, учыненыя ў Белым Балоце зусім маладымі людзьмі. Выходзіць, я калісь апавядаў будучым злачынцам пра паўстаньне Каліноўскага і абвяшчэньне БНР. Дрэнна слухалі, захопленыя расейскай папсой, амэрыканскімі баевікамі і тутэйшым жаданьнем *жыць на дурніцу*. І вось дваццацігадовы дзяцюк прабіраецца праз цемру зімовай ночы да крамы, каб вырубіць сыгналізацыю і ўрэшце скрасьці нешта з харчаваньня. І вось малады балацянін напару з бацькам гвалтам забіраюць у аднавяскоўца на ягоным падворку 20 баксаў, а потым прыходзяць яшчэ раз, каб у якасьці «даважку» прыхапіць пляшку віна «Маладзецкае». Ды што там суседзтва, калі брат, спрачаючыся з братам, не знаходзіць іншага аргумэнта, апроч удару нажом у жывот?! Бандыцкі сьверб — зьява, якую можна разгледзець яшчэ ў дзяцінстве. І відавочна, усе гэта бачаць, але нічога з тым ня робяць. Не дапамагае і царква.

Паніжэньне ўзроўню культуры цягне за сабой і праблемы са здароўем. Белае Балота ўмудрылася пры канцы мінулага году апынуцца ў пераліку населеных пунктаў Рэчыцкага раёну, дзе былі выпадкі захворваньня на каросту. Можна было б усё сьпіхнуць на прыроду, але дактары катэгарычна заяўляюць, што адна з галоўных прычын хваробы — незахаваньне асабістай гігіены. Мыцца ня мыюцца людзі. Вось і пакрываюцца вяскоўцы каростай — своеасаблівым культурным слоем сучаснасьці. Сучаснасьці супярэчлівай, сучаснасьці падманлівай. А хто там ідзе? Балацяне.

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Струменскі Сымон. Страты Беларусі, або Доля беларускага народу**: Зборнік матэрыялаў / Пад рэд. С.В.Барыса. — Менск [б.в.], 2005. — 144 с.

**Białoruś** / Pod red. Bernarda S. Albina i Walentego Bulaka. — Wrocław: Arboretum, 2004. — 411 s. — (Europa Wschodnia. Dekada Transformacji).

Зборнік артыкулаў польскіх і беларускіх аналітыкаў пра актуальнае становішча ў Беларусі. Публікуецца таксама падборка дакумэнтаў па ідэалягічнай палітыцы ўладаў і новая ваенная канцэпцыя Беларусі.

**Deputaci Trybunału Głównego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1697—1794).** Spis / Pod redakcją Andrzeja Rachuby; Opracowali Andrzej Rachuba i Przemysław P. Romaniuk przy współpracy Andreja Macuka i Jewgienija Aniszczenki; Instytut Historii Polskiej Akademii Nauk. — Warszawa: DiG, 2004. — 448 s.

[Дэпутаты Галоўнага Трыбуналу Вялікага Княства Літоўскага (1697—1794)]

Кніга складаецца з геаграфічна храналягічна сыстэматызаваных сьпісаў дэпутатаў Трыбуналу ВКЛ. Гэты суд меў характар грамадзкага, а не спэцыялізаванага прафэсійнага, бо дэпутаты-судзьдзі абіраліся ў паветах на сойміках. Гэты цікавы досьвед самакіраваньня можа быць пасьпяхова скарыстаны ў далейшым. Сэсіі Трыбуналу, апроч Вільні, штогод пачаргова адбываліся ў Менску ці Навагрудку, а ад 1791 году — у Горадні.

**Иезуиты в Полоцке 1580—1820 гг.** В 2 ч. Ч. 2 / Сост., примеч. и вступ. ст. Л.Ф.Данько, — А.И.Судник. Полоцк: Издатель А.И.Судник, 2005. — 48 с. — (Наследие Полоцкой земли; Вып. 3).

**Moskwa w rękach polaków. Pamiętniki dowódców i oficerów garnizonu polskiego w Moskwie w latach 1610—1612** / Wybór i opracowanie pamiętników Marek Kubala i Tomasz Ściężor; Wstęp Andrzej Nowosiad. — Krakow: Platan, 2005. — 518 s.

[Масква ў руках палякаў. Дзёньнікі камандзіраў і афіцэраў польскага гарнізону ў Маскве ў 1610—1612 гадах.]

У час пагаршэньня адносінаў паміж афіцыйнымі Масквою ды Варшаваю польскае выдавецтва апублікавала кнігу, у якой самімі ўдзельнікамі падзей апісваецца знаходжаньне аддзелаў Рэчы Паспалітай у расейскай сталіцы. Сярод чатырох аўтараў месца нараджэньня толькі Мікалая Сьцібора Мархоцкага застаецца невядомым, але тры астатнія мэмуарысты дакладна зьвязаліся з грамадзянамі ВКЛ: Самуэль Мацкевіч належаў да навагрудзкай шляхты, Ян Пётра Сапега паходзіў са слаўнага роду ВКЛ, Язэп Будзіла быў мазырскім харунжым. Некалі нашы суайчыньнікі імкнуліся ўсталяваць сваю ўладу ў Маскве, і гэтая авантура закончылася для іх поўнай катастрофай. Ва ўзятым расейцамі ў аблогу Крамлі шляхта знаходзілася ў стане драматычнага голаду, пра які Язэп Будзіла пакінуў такія радкі: «раней [такі голад] быў нечуваны і цяжкі да апісаньня, пра яго ніводная хроніка ў гісторыі ня сьведчыць… бо калі ўжо травы, карэньчыкаў, мышаў, сабак, катоў, здыхляціны не засталося, тады вязьняў паелі, трупы, выкапаныя зь зямлі, зьелі, пяхота сама сябе паела і людзей, хапаючы, паела». Апакаліпсіс настае як плата за небясьпечныя амбіцыі.

**ADz**

# Сьвята паэзіі ў Ляўках

Нават Лукашэнка пачаў з Купалы.





У Ляўках пад Воршай адзначылі 123-ці дзень народзінаў Янкі Купалы. Нават прэзыдэнт па-свойму яго ўшанаваў. Сваё турнэ па Аршаншчыне 7 ліпеня ён пачаў з паходу ў Купалаўскі музэй. Што праўда, афіцыйныя СМІ гэты візыт замоўчалі: у музэй Лукашэнка пайшоў а восьмай раніцы, а «асьвятленьне» пачалося зь дзясятай — з Копысі, дзе ён нарадзіўся.

9 ліпеня пад Ляўкамі сабраліся аматары роднага слова на Сьвята вольнай беларускай паэзіі. Пераважна гэта былі ўдзельнікі Драздовіцкага літаратурна-мастацкага пленэру, што сёлета прысьвячаўся памяці Караткевіча. Далучыўся нават мясцовы жыхар, які на ровары праяжджаў паўз фэст: дзядзька не сумеўся, а прачытаў байку.

Спаленыя сонцам пленэраўцы зьехаліся на свае заняткі. Дысцыпліну й расклад пільнаваў сталёвы працаголік Андрэй Хадановіч, таму перакладчыцкая майстэрня скончалася нават пры ліхтары. І пасьля афіцыйнай часткі сьвята пачалася неафіцыйная. Каля вогнішча змог выступіць са сваімі вершамі ці песьнямі кожны ахвотны. Не абышлося без імправізаваных прызоў: падарункам ад Георгія Ліхтаровіча стала кніга «Ліхтарыкі», ад Зьмітра Вішнёва — «Трап для сусьлікаў», а ад Валянціны Гракун зь Бешанковіч — зборнікі вершаў тамтэйшых паэтаў ды кніга прозы Вольгі Іпатавай з аўтографам аўтаркі.

Ініцыятары пленэру — Ада Райчонак і Вадзім Баршчэўскі — выказалі надзею, што ў хуткай будучыні такія фэсты ўзьнікнуць па ўсёй Беларусі: дазвол на пікнік браць ня трэба, а паэты — соль нашай нацыі.

**Адам Воршыч,**
**фота Ігара Марачкіна**





**Дзякуючы Адзе Райчонак, не замірае нефармальнае культурнае жыцьцё на Віцебшчыне.**





**Сталёвы працаголік Андрэй Хадановіч (справа) з выхаванцамі ў «бел-чырвона-белым кутку» лягеру, дзе чыталіся вершы.**

# Азіяцкі Чэ Гевара

Сёлета Віетнам адзначае адразу тры важныя даты: 30 красавіка — трыццацігодзьдзе заканчэньня вайны з ЗША, 2 верасьня — 60-ю гадавіну абвяшчэньня незалежнасьці ад Францыі, 19 траўня — 115-ю гадавіну нараджэньня чалавека, зь якім зьвязаны гэтыя дзьве перамогі, — Хо Шы Міна. На гэтым фоне адбудзецца першы ў гісторыі візыт прэзыдэнта ЗША Джорджа Буша ў Ханой. Піша **Ўсяслаў Шатэрнік**.



МАЛЮНАК СЯРГЕЯ ХАРЭЎСКАГА

### Захоплены Амэрыкай

Будучы лідэр віетнамскіх камуністаў (сапраўднае імя Нгуен Тхань) нарадзіўся ў сям'і вучонага-канфуцыянца. Чамусьці ў нас распаўсюджана няправільнае ўяўленьне пра канфуцыянства як філязофію абсалютнай пакоры. Галоўны абавязак канфуцыянца — служыць свайму ўладару, але толькі калі той, у сваю чаргу, служыць падданым. У выпадку, калі ўладар не выконвае абавязкаў, а тым больш здраджвае Радзіме, супраціў цалкам дапушчальны. Апошняе было вельмі актуальным для Віетнаму пры канцы XIX ст., калі краіна аказалася захопленай французамі, а імпэратары ператварыліся ў марыянэтак каланізатараў.

Малады Нгуен востра перажываў з прычыны прыніжэньня краіны, разумеючы, што без засваеньня заходніх ідэй Віетнам ня знойдзе свайго месца ў сьвеце. Таму ён накіроўваецца ў ЗША, Дэклярацыя незалежнасьці якой зрабіла на яго вялікае ўражаньне. Новая краіна прыйшлася даспадобы. На ўсё жыцьцё Хо захаваў любоў да ўсяго амэрыканскага — цыгарэт, фільмаў, машын. Першым яго палітычным кумірам стаў амэрыканскі прэзыдэнт Вудра Ўілсан.

### Агент Камінтэрну

Аднак будучыня Віетнаму вырашалася ў мэтраполіі. Нгуен кіруецца ў Францыю, дзе ўступае ў Сацыялістычную партыю, а канчаткова вызначальным у лёсе нашага героя стала знаёмства з артыкулам Леніна «Першапачатковы накід тэзаў па нацыянальным і каляніяльным пытаньні».

У гэтай працы правадыр сусьветнага пралетырыяту абвяшчаў неабходнасьць падтрымкі камуністамі нацыянальна-вызваленчых і антыкаляніяльных рухаў. Дагэтуль лічылася, што нацыянальную праблему вырашыць рэвалюцыя ў мэтраполіі, а самастойнае яе вылучэньне шкодзіць справе пралетарыяту. Ленін, абвясьціўшы, што нацыянальнае пытаньне можа ігнараваць толькі чалавек, які знаходзіцца на Марсе, прывабіў шмат прыхільнікаў. Сярод такіх нэафітаў быў і Хо.

Так зьнікае Нгуен Тхань і зьяўляецца агент Камінтэрну Нгуен Ай Куок-Нгуен. Вяршыняй ягонай дзейнасьці стала ўтварэньне ў 1930 г. Кампартыі Індакітаю. Туды, акрамя віетнамскіх, увайшлі лаоскія і кхмэрскія камуністы. Пасьля гэтага Нгуен Ай Куок таксама таямніча зьнікае. Аб ягонай сьмерці напісалі францускія газэты, а Камінтэрн абвясьціў афіцыйную жалобу. Дзе знаходзіўся наш герой амаль дзесяць год, дакладна не вядома. Мяркуюць, што ў СССР.

### «Навучаны жыцьцём»

Толькі ў лютым 1941 г. нястомны рэвалюцыянэр вяртаецца на Радзіму, ужо пад новым псэўданімам — Хо Шы Мін, што можна перакласьці як «навучаны жыцьцём». Гэта былі складаныя часы: краіну акупавалі японцы, але захоўвалася і французская адміністрацыя, падпарадкаваная ўраду Вішы. Кампартыя Індакітаю фактычна перастала існаваць. Наўзамен Хо стварае Віетмінь — «Лігу незалежнасьці Віетнаму». Камуністычныя лёзунгі былі заменены на нацыянал-незалежніцкія.

Камінтэрнаўскі агент ператвараецца ў нацыянальнага лідэра. 2 верасьня 1945 г. Хо абвяшчае аб утварэньні Дэмакратычнай Рэспублікі Віетнам. На некаторы момант здалося, што ўсе віетнамцы аб'ядналіся ў нацыянальным парыве. Нават апошні імпэратар Бао Дай абвясьціў аб прызнаньні новай рэспублікі і ўвайшоў у яе ўрад.

Але незалежнасьці не прызнала Францыя. У 1946 г. Парыж распачынае вайну, якая доўжылася восем год і ўвайшла ў гісторыю як «брудная». У 1954 г. французаў зьмянілі амэрыканцы. У супрацьвагу камуністычнаму Ханою на поўдні краіны была створана Рэспубліка Віетнам з цэнтрам у Сайгоне.

Паўднёвы Віетнам быў разьяднаны, і канфэсійная неаднароднасьць насельніцтва (каталікі, будысты, прыхільнікі розных сэктаў) не дазваляла вылучыць адзінага лідэра. Спроба Вашынгтону зрабіць стаўку на каталікоў раздражняла іншыя канфэсіі. З другога боку, амэрыканцы недаацэньвалі камуністычных партызан-віеткангаўцаў, іхнюю арганізаванасьць, ролю няспыннай ваеннай дапамогі з боку СССР (пазьней Амэрыка ўлічыць савецкі вопыт у Віетнаме для стварэньня антыкамуністычнай «партызанкі» ў Аўганістане). Гэтыя і іншыя памылкі прывялі да ўзяцьця Сайгону камуністычнымі сіламі 30 красавіка 1975 году.

*Няма нічога даражэйшага за незалежнасьць і свабоду.*
*Хо Шы Мін*

Хо вызначаўся сапраўднай канфуцыянскай шляхетнасьцю. Але ў той жа час Хо быў адданым вучнем таварыша Сталіна. У Ханоі партрэты «бацькі ўсіх народаў» вывешваліся аж да пачатку 1980-х, і іх ніяк не хацелі заўважаць лібэральныя крытыкі вайны ў Віетнаме.

### Неадназначнасьць Хо

Супрацьстаяньне наймацнейшай у сьвеце дзяржаве ператварыла Хо ў легенду пры жыцьці. Яго параўноўвалі з Чэ Геварам, называлі ўвасабленьнем мудрасьці Ўсходу. Апроч таго, Хо вызначаўся сапраўднай канфуцыянскай шляхетнасьцю. Насіў сьціплы строй, жыў у невялікім дамку, бо зь дзяцінства засвоіў, што ня вонкавыя атрыбуты вызначаюць сапраўднага Ўладара.

Але ў той жа час Хо быў адданым вучнем таварыша Сталіна. У Ханоі партрэты «бацькі ўсіх народаў» вывешваліся аж да пачатку 1980-х, і іх ніяк не хацелі заўважаць лібэральныя крытыкі вайны ў Віетнаме. Паводле амэрыканскіх зьвестак, ахвярамі камуністычнай аграрнай рэформы 1954-га сталі сто тысяч чалавек. 1956 год стаў у Віетнаме падобным да 1937-га ў СССР. Каб прадухіліць уплыў хрушчоўскага рэвізіянізму, у Віетнаме былі расстраляны ці кінуты ў турмы сотні партыйных актывістаў і інтэлігентаў. Нарэшце, адразу пасьля перамогі камуністаў у 1975-м былі створаны канцлягеры, куды накіравалі салдат былога сайгонскага войска, рэлігійных і палітычных дзеячаў. Калі напярэдадні падзеньня Сайгону колькасьць палітзьняволеных складала 400 тысяч, то меней чым праз паўгоду гэтая лічба ўзрасла ўдвая.

### У жыцьці справядлівасьці мала

У сваім тэстамэнце Хо пісаў, што ягонае цела павінны спаліць і разьвеяць на чатыры бакі сьвету. Аднак пажаданьне не было выканана. Сёньня Хо разам з Кім Ір Сэнам, Мао Дзэ-дунам і Ўладзімерам Леніным складае камуністычную чацьвёрку «вечна жывых». Віетнамскія піянэры па-ранейшаму прыносяць кветкі да маўзалею «дзядзькі Хо», партыйныя зьезды клянуцца ў вернасьці яго ідэям.

Толькі Віетнам стаў іншым. Сёньня краіна ўваходзіць у АСЭАН — азіяцкі аналяг NATO, а партыйнай задачай №1 зьяўляецца пераўтварэньне краіны ў разьвітую капіталістычную дзяржаву. Галоўнай падзеяй гэтага году мае стаць першы ў гісторыі візыт прэзыдэнта ЗША Джорджа Буша ў Ханой — падзея сапраўды гістарычная.

Як кожны вучоны муж, Хо ў вольныя часіны аддаваў даніну паэзіі. Асобнае месца ў яго літаратурнай спадчыне займае вершаваны турэмны дзёньнік 1942 г., які вылучаецца пачуцьцём уласнай годнасьці і самаіроніяй. Яго пераклалі на розныя мовы сьвету. Беларускі пераклад належыць Янку Сіпакову. Урыўкі зь яго мы прыводзім ніжэй:

Мне кажуць, што хварэю ад клімату чужога,
Я ж знаю: па Радзіме сум раніць, нібы нож:
Як у турме хварэць — няма страшней нічога,
Павінен плакаць я, а я сьпяваю ўсё ж.

Побач з турмою ружа была расьцьвіла,
Расьцьвіла, паквітнела і ціха завяла.
Яна камэрам водар увесь аддала,
Нагадала: ў жыцьці справядлівасьці мала.

Самае горшае — волю згубіць,
У прыбіральню і то тады трапіць складана:
Калі адчынена — жывот не баліць,
А жывот разбалеўся — ўсё пазачыняна.

# Галісія разьвітваецца з каўдыліё

Сёлетнія выбары ў Галісіі выклікалі вялікую цікавасьць у Гішпаніі. Нацыяналістычныя настроі ўзмацняюцца ў рэгіёне, які культурна адметны, але палітычна доўгі час самы ляяльны Мадрыду. Ці гальега сфармуюць сваю паўнавартасную нацыю? Піша **Вацлаў Шаблінскі**.




Галісія — пятая паводле насельніцтва і адна з самых бедных правінцый Гішпаніі. Яна знаходзіцца на ўзьбярэжжы Атлянтыкі (галісійцы жартуюць, што Амэрыка ім бліжэйшая, чым Мадрыд), на поўнач ад Партугаліі.

Галісійцам, самі яны сябе называюць «гальега», належыць важная культурна-гістарычная роля на Пірэнэях. Менавіта мова гальега стала першай пасьля лаціны літаратурнай мовай Гішпаніі — на ёй складалі свае творы мясцовыя трубадуры, сярод якіх былі каралі Партугаліі, Кастыліі, Леону. Тут знаходзіцца труна сьвятога Якуба (Сант'яга) — галоўная сьвятыня гішпанскіх каталікоў. Гэта прадвызначыла барацьбу за краіну з боку суседзяў, якая скончылася перамогай Кастыліі.

Перамога Мадрыду зьмяніла статус галісійскае мовы. Яна пачала лічыцца мужыцкай. Некультурны, няздольны як трэба гаварыць гальега — пастаянны аб'ект кепікаў у партугальскай, гішпанскай, францускай літаратурах. З прычыны беднасьці шмат гальега вымушаны былі шукаць лепшай долі за акіянам. Вядомыя нашчадкі гальега за межамі краіны — камандантэ Фідэль Кастра і расейскі пісьменьнік Рубэн Гальега.

Адсталая Галісія адыгрывала ў найноўшай гісторыі Гішпаніі ролю вандэі і была адным з апірышчаў франкістаў. Сам Франка, хоць і быў нашчадкам хрышчаных габрэяў, паходзіў з Галісіі. Нават пасьля сьмерці генэралісімуса традыцыі франкізму маюць тут моцныя пазыцыі. Іх увасабленьне — Мануэль Фрага, ужо 16 год як кіраўнік мясцовага ўраду — шунты. Дон Мануэль успрымаецца як спадкаемца былога каўдыльё — ня толькі таму, што быў міністрам турызму ў яго ўрадзе. Каўдыліё — ня проста дыктатар, а чалавек ад зямлі, патрыярхальны кіраўнік. Гэткі «бацька» падданых. Такі імідж дапамагаў дону Мануэлю шмат год трымаць уладу ў родным краі. Ён так звыкся з роляй бацькі гальега, што нават не перапыніў паляваньня, калі на галісійскае ўзьбярэжжа вылілася нафта. Такая няўвага да экалягічных праблем аказалася для яго фатальнай. Калі першапачатковыя вынікі выбараў пацьвердзіцца, яму прыйдзецца саступіць мясцоваму блёку сацыялістаў і нацыяналістаў. Лідэр апошніх ужо выказаў надзею, што зьмена ўлады будзе спрыяць прагрэсу краіны і ўвядзе гальега ў лік паўнацэнных нацый Эўропы. Пажывём — пабачым.

# Хто разбамбіў Лёндан, або Ці існуе «Аль-Каіда»?

Працяг са старонкі 1.

Звычайна пасьля кожнага тэракту сувязь з «Аль-Каідай» давводзяць празь яе почырк. Іншых доказаў бракуе, і таму, каб абвергнуць «тэорыю «Аль-Каіды», дастаткова аднаго пытаньня. Калі «Аль-Каіда» — магутная сетка з мноствам філіялаў, якая ажыцьцяўляе актыўную тэрарыстычную дзейнасьць сусьветнага маштабу, дык у працэсе сваёй дзейнасьці яна мусіць пакінуць па сабе сьляды. Тым часам спэцслужбы ня могуць здабыць рэальных доказаў яе існаваньня.

### Тэрарыстычныя глябалісты

Рыторыка наконт пагрозы з боку «Аль-Каіды» ўсё часьцей нагадвае канcьпіралягічнае трызьненьне аб сусьветнай ісламісцкай змове. Канcьпіралёгія існавала заўжды, але ці варта тлумачыць навакольны сьвет яе мэтадамі? Сто гадоў таму сьвет быў ахоплены пошасьцю іншага канcьпіралягічнага сюжэту, і тагачасныя нягоднікамі былі габрэі. На зьмену жыдамасонскай змове прыйшла занепакоенасьць пагрозай сусьветнага камунізму, калі любы выбух і стрэл — ад Сайгону да Рыму — зьвязваўся з падкопамі чырвоных. Чалавецтва заўжды было схільнае ствараць тэорыі, каб вытлумачыць сьвет. Пазьней — каяліся.

### Тэорыя «Аль-Каіды»

Брытанскі журналіст Джэйсан Борк у кніжцы «Аль-Каіда: Праява ценяў жаху» адсачыў гісторыю панятку. У 1987 г. інтэлектуал Абдулаг Азам заклікаў да стварэньня «Аль-Каіда аль-сульба» (авангарду моцных). Ён меў на ўвазе байцоў, якія, дзейнічаючы самастойна, стануць узорам для астатніх вернікаў і натхняць паспаліты люд на барацьбу супраць прыгнятальнікаў. Азамавы спэкуляцыі трапілі на вочы ФБР, якое міжволі забясьпечыла рэкляму: расьследуючы выбухі ў амэрыканскіх пасольствах у Афрыцы ў 1998 г., ахрысьціла «Аль-Каідай» досыць адвольную групу падазраваных у зьдзяйсьненьні тых тэрактаў на чале з бэн Ладэнам.

Але няма доказаў існаваньня «Аль-Каіды» як арганізацыі і за часамі талібскага панаваньня ў Аўганістане. Бэн Ладэн ажыцьцяўляў там сваю дзейнасьць, але ішла яна зьбольшага ў рамках іншых ісламісцкіх груп. Даўні знаўца Аўганістану Войцех Ягельскі ў кнізе падарожных нататак «Малітва пра дождж» падае вобраз бэн Ладэна як своеасаблівага мэнэджара муджагедаў за часамі савецкай акупацыі і спрытнага дзялка за часамі талібаў. Ён умеў адкрываць канторы па дапамозе муджагедам, шукаць грошы і прыгожа прамаўляць. Ані баявымі, ані інтэлектуальнымі, ані арганізацыйнымі якасьцямі Ўсама не вылучаўся. Дзіўны вобраз як для ўладара глябальнай імпэрыі тэрору.

Дый наўрад ці магчыма незаўважна кіраваць гэтай імпэрыяй з пячораў Гіндукушу. Сучасныя тэхналёгіі, вядома, даюць магчымасьць такой камунікацыі, але ультрановыя цацкі ў пячорах сваім выглядам і выпрамяненьнем дэмаскавалі б любыя сур'ёзныя рухі. Зрэшты, недарэчна глядзелася б кіраваньне глябальнай тэрарыстычнай сеткай, высылаючы зь цясьнін пасыльных на аслах, таксама было б недарэчна. Апроч таго, недаступныя для амэрыканскага спэцназу раёны (дзе нібы хаваецца Ўсама) зьяўляюцца малапрыдатнымі нават для простага выжываньня чалавека, ня кажучы ўжо пра магчымасьць каардынацыі адтуль глябальных дывэрсій.



Трывожнае чаканьне ў лёнданскім мэтро. Пасьля тэрактаў рух цягнікоў спыніўся на ўсіх лініях.

### Галеча філязофіі і філязофія галечы

Тэорыю «Аль-Каіды» разьвілі ў напрамку вытлумачэньня арганізацыі як ідэалёгіі і сьветапогляду. Іян Бурума назваў бэн Ладэна «сьвятаром-аматарам», Джэйсан Борк — «прапагандыстам». Лягічна — калі Ўсама не спраўляецца з апэрацыйна-каманднай роляй, дамо яму ролю ідэоляга.

Але ідэалягічны даробак самога бэн Ладэна не вылучаецца ні арыгінальнасьцю, ні аб'ёмам. Стваральнікам ідэалёгіі за яго заўсёды займаўся нехта іншы — некалі суданскі шэйх Турабі, а цяпер — выдатныя заходнія публіцысты на старонках рэспэктабельных выданьняў. Таму варта задумацца, а ці ёсьць гэтая самая ідэалёгія? Прэзыдэнт Буш назваў яе «ідэалёгіяй нянавісьці», але пастаянны стан нянавісьці — гэта, хутчэй, шаленства, а не ідэалёгія. Бэн Ладэн — не ідэоляг. Але гэта — фігура на экране. Выключыце тэлевізар — і яго няма.

Няма і «ідэалёгіі «Аль-Каіды», «ісламізму» ці «джыгадызму». Гэтымі мянушкамі азначаюць вялізны канглямарат розных калярэлігійных плыняў, маларасцпрацаваных і падазрона блізкіх да іншых нерэлігійных радыкальных плыняў «трэцяга сьвету» ды антыглябалізму. Меркаваныя «чальцы» «Аль-Каіды» пераймаліся вельмі рознымі рэчамі. Эгіпцянін Завагіры абвясьціў крыніцай усякага ліха транснацыянальныя кампаніі, Мухамада Ату (што загінуў 11 верасьня) і цяпер памятаюць дзякуючы ягоным рэфлексіям на тэмы несправядлівасьці сусьветнай эканамічнай сыстэмы, а сам бэн Ладэн яшчэ нядаўна лічыў сваёй асноўнай задачай заваліць саудаўскі рэжым. Зрэшты, ёсьць і дакумэнты, прыпісваныя бэн Ладэну, якія выкрываюць «д'ябальскую» сутнасьць ЗША, што душаць сьвет, не падпісваючы Кіёцкага пратаколу. Словам, гэта філязофія галечы, абвешчаная ад імя ісламскага «трэцяга сьвету».

### Хто ваюе з амэрыканцамі?

Аўганскі селянін мог страляць з дубальтоўкі па ангельцах ці ўзрываць гранатамі савецкія танкі, але ён ня здольны падарваць лёнданскае мэтро ці мадрыдзкі цягнік, бо ня ўмее. Гэта здолеюць зрабіць толькі дзецюкі з грунтоўнай адукацыяй, атрыманай на Захадзе. Не народныя масы падкладваюць выбухоўку, а групкі ідэалістаў, што жывуць абстракцыямі.

Найважнейшае пытаньне — ці маюць гэтыя групкі ідэалістаў супольную арганізацыю? На маю думку, гэтая супольная арганізацыя створана выключна занадта шырокімі абагульненьнямі. Праблема ў тым, што для некаторых дзяржаўных службаў пытаньне наяўнасьці лягічных сувязяў паміж асобнымі падзеямі і абагульненьне рэальных фактаў непасрэдна зьвязанае з пытаньнем фінансаваньня.

Так, бачачы ў газэце падагульненыя зьвесткі аб колькасьці выпадкаў хуліганства, абывацель ужо ня будзе скваппічаць у выдатках на паліцыю. Падагульненыя лічбы яго ўражваюць, але ніхто ня зьвязвае гэтае мноства нападаў з вынікам сусьветнай змовы з мэтай падарваць стабільнасьць у грамадзтве.

Спэцслужбам цяжэй апраўдваць сваё існаваньне. Калі паліцыянта абывацель бачыць, дык людзі «нябачнага фронту» маюць прафэсійную звычку хавацца. Гэтая звычка пастаянна выклікае дадатковыя падазрэньні ў грамадзкасьці і яе прадстаўнікоў. А таму і ствараюць такія аналітыкі грандыёзныя канцэпцыі неймаверных пагроз для краіны і сьвету, каб апраўдацца за сваю таямнічасьць. Грандыёзныя канцэпцыі — грандыёзнае фінансаваньне.

Карысьць для грамадзтва ад работы спэцслужбаў заўсёды заставалася вельмі няпэўнай велічынёй. Праколы амэрыканскіх і брытанскіх шпіёнаў у Іраку мелі гучны розгалас. Віной таму стаўленьне палітыкаў да вынікаў працы спэцслужбаў. Імідж шпіёна-ўсязнайкі прымушае разьведчыкаў бадзёра дакладваць сваім палітычным працадаўцам нават тады, калі дакладваць няма чаго.

Зрэшты, у іміджы «Аль-Каіды» вінаватыя ня толькі ЦРУ і ФБР. Алею ў агонь падлілі і іншыя аматары зарабіць грошы на красамоўных спэкуляцыях у этэры ці на газэтных старонках. Прыклад іракца Чэлабі, што добра «разьвёў» амэрыканцаў, пастаўляючы тым патрэбныя доказы



Бэн Ладэн — не ідэоляг. Але гэта — фігура на экране. Выключыце тэлевізар — і яго няма.

для іх тэорый, быў толькі самым гучным.

На жаль, людзі толькі зь вялікай цяжкасьцю вызваляюцца з палону тэорыяў. Некалі, страціўшы ў Віетнаме 57 тыс. жаўнераў, амэрыканцы вызваліліся ад веры ў тэорыю «камуністычнага даміно» і зьвярнуліся да рэальнасьці і пайшлі на вывад войскаў. Праз нейкі час Віетнам адышоў ад ваяўнічай пазыцыі, і сёньня ў Ханою з Вашынгтонам ці выдатныя стасункі.

Некалі Вашынгтон (а разам зь ім і шырэйшая заходняя супольнасьць) прыйдзе і да ўзважанага погляду на ісламісцкую праблему, «Аль-Каіду», Ірак і ісламскі сьвет. Трэба зразумець, хто вінаваты, каб ведаць, што рабіць. На жаль, цана разуменьню — кроў і трагедыі, накшталт лёнданскай.

# 7 ліпеня ў Лёндане вачамі беларуса

Я працую ў лёнданскім Сіці. 7 ліпеня выехаў з дому раней — заскочыць перад працай у трэнажэрную залю. Ехаў на цягніку з паўночнага Лёндану да станцыі «Moorgate». Усё як заўжды: Лёндан сьпяшаецца на працу.

Выйшаў з трэнажэрнай залі, а людзі кажуць, што адбыўся выбух на адной са станцый мэтро. Але быццам бы ня бомба, а сутыкненьне двух цягнікоў. Ахвяраў нібы не было. Ужо ў офісе прыходзіць навіна, што адбыліся шматлікія выбухі на розных станцыях мэтро і нават у аўтобусе. У тым ліку, кажуць, і на станцыі «Moorgate», на якой я быў за паўгадзіны да гэтага. Ну ўсё, думаю: каб не пайшоў раней у трэнажэрную залю, то быў бы ўжо на тым сьвеце (праўда, празь некалькі гадзін сказалі, што выбухаў было толькі чатыры і на станцыі «Moorgate» нічога не адбывалася).

Жонка тэлефануе:

— Як ты там?

— Пакуль жывы.

— Як будзеш да хаты дабірацца? Увесь транспарт у горадзе спынены.

— Ня ведаю, — кажу, — пакуль паліцыя загадала заставацца ў будынках і на вуліцу не выходзіць.

Інтэрнэт перагружаны, мабільная сувязь таксама. Цяжка знайсьці інфармацыю. Паступова прыходзяць жахлівыя навіны — дзясяткі забітых і параненых людзей недалёка ад нашага будынку.

Тэлефаную маці ў Гомель, каб зьняць напружанае хваляваньне. Маці, на шчасьце, яшчэ ня чула пра бомбы ў Лёндане. «Едзь, — кажа, — дадому, і беражыце сябе, а я буду за вас маліцца».

Потым пачалі прыходзіць электронныя лісты, а таксама тэлефанаваньні ад маіх кліентаў з розных краін. Зьвязваліся таксама мае сябры з Оксфарду і Лёндану.

У другой палове дня частку транспарту — аўтобусы і пару цягнікоў — зноў запусьцілі. Жонка ўжо дома. Яна працуе недалёка ад дому, а я сядаю ў аўтобус і рыхтуюся да доўгай дарогі.

Народ вакол маўклівы і сур'ёзны, але чытаю ў вачах рашучасьць. Маўляў, ворагі нас не запужаюць. Для Лёндану бомбы і тэрарызм ня новыя. У Другую сусьветную вайну горад няшчадна бамбіла нямецкая авіяцыя, а ў 1970—1980-я гады горад жыў з тэрарыстычнымі актамі IPA.

Адчуваецца, што сярод лёнданцаў ізноў ажывае той дух маўклівай стойкасьці. Жыцьцё будзе працягвацца, як і раней, тэрарызм і бомбы не пераможуць.

Ужо каля хаты сустракаю знаёмага баўгарына, які жыве ў брытанскай сталіцы пад 15 гадоў.

— Ну што, дружа, падумваеш, як усё тут кінуць і назад у Баўгарыю, далей ад тэрарызму, у якую ціхую вёсачку на Чорным моры?

— Можа, гадоў так праз 20—25, калі на пэнсію пайду, — усьміхаецца баўгарын.

**Павал Шаўцоў, Лёндан**

# Дом, які збудаваў кандыдат









Радавая сядзіба Аляксандра Мілінкевіча ў Берштах, што на Шчучыншчыне, на самай мяжы зь Літвой, — гэта амаль 18 сотак зямлі, дом, лазьня, гаспадарчыя прыбудовы і этнаграфічны музэй. З часоў Вітаўта Вялікага ў Берштах існаваў на працягу паўтысячагодзьдзя вялікакняскі паляўнічы палац. У 1496 годзе менавіта тут кароль Аляксандар надаў Горадні Магдэбурскае права.

Дом Аляксандар Мілінкевіч пачаў будаваць яшчэ ў 1991 годзе, на самым досьвітку беларускай незалежнасьці. Як сам кажа, «нібы і выпадкова, але мой дом стаў атаясамлівацца з нашай незалежнасьцю». Пытаньне, дзе будаваць, ніколі не стаяла. Толькі Бершты! Адсюль усе продкі, на гэтых землях прапрадзед і прадзед у атрадзе Людвіка Нарбута бралі ўдзел у паўстаньні 1863 году. Берштаўская пушча. Ледзь не за дзесяць мэтраў ад хаты Берштаўскае возера. Возера чыстае, бо ў Берштах ніколі не было добрага калгасу, не было калгасных палёў, адпаведна, вада ў возеры не забруджвалася рэшткамі ўгнаеньняў. Дом Мілінкевіч будаваў нясьпехам, «каб на гады і перад людзьмі сорамна не было». З вуліцы глядзіш — нібы і звычайны дамок, але ўнутры адчуваеш густ гаспадара і разьлік «на гады» — ладна апрацаваныя бярвёны, уласнаручна зробленыя дзьверы і вокны, палатняныя фіранкі, печка, камін з каванымі рагачамі, драўляны стол.

Этнаграфічны музэй у сваёй сядзібе Мілінкевіч стварыў супольна зь землякамі, дапамагалі таксама бард Віктар Шалкевіч, гарадзенскія мастакі Алесь Сураў і Ўладзімер Кіслы. Перавезьлі з Мастоўшчыны дзьве старыя хаткі, якія пасьля злучылі ў музэй. Бацька Кіслага Мікадзім, папрацаваўшы ў свой час страхаром, накрыў хату-музэй саломай.

Тры гады таму пасялілася ў хаце куніца. Уночы, раз на дзесяць дзён, яна абыходзіць свае ўладаньні. «Вэрхалу робіць багата», — прызнаецца Аляксандар Мілінкевіч, але ад спроб пагнаць яе з хаты ўжо адмовіўся. Нехта зь мясцовых сказаў, што куніца — гэта сымбаль заможнасьці, цеплыні і празорлівасьці.

**Тэкст і фота Юліі Дарашкевіч**





# Каб любіць Беларусь нашу мілую…

**Працяг са старонкі 2.**

З Табліцы 2 вынікае, што ў канцы 1990-х гадоў беларусы ў сэнсе нацыянальнага гонару былі сярод постсавецкіх нацый ня першымі і не апошнімі, сярод суседзяў відавочна саступаючы толькі палякам. Характэрна тое (глядзі Табліцу 2), што этнічныя меншасьці паўсюль ганарацца краінай пражываньня ў меншай ступені, чым тытульны этнас. Гэта справядліва і ў адносінах да Беларусі, і тут разрыў быў заўважным — большым, чым у Расеі і Літве, але меншым, чым у Латвіі і Ўкраіне.

Параўнаньне зьвестак па Беларусі, прыведзеных у Табліцы 2, з вынікамі травеньскага апытаньня, праведзенага пры спрыяньні НІСЭПД і «Понцісу» паказвае, што індэкс гонару беларускіх грамадзян застаўся прыблізна на ранейшым узроўні.

Калі параўноўваць гэтыя паказчыкі з амэрыканскімі, то ў траўні 2002 году падчас апытаньня, праведзенага службай Гарыса («The Harris Poll»), 84% амэрыканцаў адказалі, што вельмі ганарацца тым, што зьяўляюцца грамадзянамі ЗША, 12% — што толькі часткова ганарацца, 2% — што ня вельмі ганарацца, што зусім не ганарацца тым, што яны амэрыканцы, — менш за 1%. Адпаведна, індэкс гонару амэрыканцаў паводле гэтага апытаньня службы Гарыса складаў 2,8. Гэты паказчык мяняецца з часам, аднак і амэрыканцы, і палякі заўсёды адрозьніваліся велізарным патрыятызмам і гонарам за сваю Айчыну.

Кіраўнік дзяржавы — важны, але не адзіны і не галоўны сымбаль нацыі.

Летась міжнародная служба Гарыса правяла аналягічнае дасьледаваньне ў Эўропе, зьвесткі якога паказаны ў Табліцы 3.

**Табліца 3. Індэксы гонару 2004**

| | |
|---|---|
| Гішпанія | 2,41 |
| Італія | 2,34 |
| Вялікабрытанія | 2,23 |
| Францыя | 2,21 |
| Нямеччына | 1,72 |

З Табліц 2 і 3 відаць, што гонар за сваю краіну, гонар за сваё грамадзянства непасрэдна ня зьвязаны з дабрабытам. Калі палякі ў канцы 1990-х маглі ганарыцца, апроч усяго іншага, і посьпехамі нацыянальнай эканомікі, то эканамічнае становішча, напрыклад, грузінаў ці сэрбаў было даставаткова бядотным, аднак гэтыя народы дэманстравалі даволі высокі ўзровень нацыянальнага гонару. З другога боку, цалкам пасьпяховая ў эканамічным сэнсе Літва выклікала стрыманае пачуцьцё гонару ў сваіх сыноў і дачок. Цяперашні драматычна нізкі ўзровень нацыянальнага гонару немцаў таксама тлумачыцца ня нейкімі жахлівымі праваламі нямецкай эканомікі.

Табліца 4, паданая ніжэй, атрымаmaking на падставе зьвестак травеньскага апытаньня, паказвае, што цяперашні ўзровень гонару беларускіх грамадзян за сваю краіну ў малой ступені абумоўлены канкрэтнымі зьдзяйсьненьнямі іх Айчыны.

**Табліца 4. Калі Вы ганарыцеся тым, што Вы грамадзянін Беларусі, то чым менавіта Вы ганарыцеся? (Адкрытае пытаньне, магчыма некалькі адказаў.)**

| Варыянт адказу | % |
|---|---|
| Добрая краіна і людзі | 40,3 |
| Гэта мая Радзіма, зямля маіх продкаў | 24,6 |
| Культура | 6,9 |
| Высокі ўзровень эканомікі | 5,4 |
| Моцная ўлада | 4,7 |
| Незалежнасьць краіны | 2,2 |
| Іншае | 3,7 |
| Цяжка адказаць | 2,4 |

З аднаго боку, такая карціна ў вядомай ступені зьяўляецца абвяржэньнем страхаў, што нацыянальная еднасьць краіны можа пахіснуцца з прычыны нейкіх катаклізмаў, напрыклад, эканамічных, бо і цяпер яна не эканамічным дабрабытам абумоўлена. З другога боку, Табліца 4 нічога не гаворыць пра прычыны адсутнасьці гонару быць грамадзянінам Беларусі.

Больш дэталёвае дасьледаваньне паказвае, што сытуацыя не такая й ідылічная. (глядзі Табліцу 5.)

Зьвесткі Табліцы 5 дужа насьцярожваюць як паказчык стану беларускага грамадзтва. Гэтыя зьвесткі сьведчаць пра існаваньне моцнай адмоўнай сувязі паміж гонарам за беларускае грамадзянства і стаўленьнем да прэзыдэнта Лукашэнкі — ягоныя прыхільнікі ў значна большай ступені, чым праціўнікі, схільны ганарыцца сваім беларускім грамадзянствам. Сувязь ня стоадсоткавая, але моцная, прычым пры пераходзе да больш канкрэтных пытаньняў, што непасрэдна адлюстроўваюць стаўленьне да кіраўніка дзяржавы, разрыў ва ўзроўнях гонару павялічваецца, ён істотна большы, чым быў у канцы 1990-х гадоў паміж беларусамі і прадстаўнікамі этнічных меншасьцяў (гл. Табліцу 2).




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Наагул, кіраўнік дзяржавы — важны, але не адзіны і нават не галоўны сымбаль нацыі. Але ў некаторых выпадках, калі лідэр запаўняе сабой усю палітычную прастору краіны, калі псыхалягічна, а то і фактычна мноства сфэр грамадзкага жыцьця аказваюцца непасрэдна зьвязанымі зь ягонай пэрсонай, то стаўленьне да яго генэралізуецца, пашыраецца на ўсе гэтыя сфэры.

У адной з папярэдніх публікацый НІСЭПД было паказана, як стаўленьне да Лукашэнкі аказваецца зьвязаным са стаўленьнем да іншых грамадзкіх інстытутаў — парлямэнту, ураду, міліцыі, судоў, партый і г.д. Згодна з Табліцай 5, гэтая сувязь мае больш глыбокі характар: у прыватнасьці, адмоўнае стаўленьне да кіраўніка дзяржавы пашыраецца ў выніку на ўсё грамадзтва і на краіну. Тыя, каго не задавальняе Лукашэнка, сустракаюцца з праявамі ягонага ўплыву на кожным кроку свайго будзённага жыцьця, на кожным кроку яны сутыкаюцца зь перавагай ягоных прынцыпаў і ігнараваньнем, таптаньнем ды прыніжэньнем сваіх каштоўнасьцяў і памкненьняў. Для многіх зь іх Беларусь — гэта краіна Лукашэнкі, у якой ім, па вялікім рахунку, проста няма месца.

І наадварот — прыхільнікі прэзыдэнта, якія падзяляюць ягоныя каштоўнасьці, паўсюль бачаць ажыцьцяўленьне гэтых каштоўнасьцяў, што ўзмацняе іх гонар за краіну наагул.

У выніку Беларусь аказваецца глыбока расколатай краінай — расколатай па прымеце каштоўнасьцяў, прычым раскол закранае ня толькі праблемы палітыкі, эканомікі і сацыяльнага жыцьця, але даходзіць і да вышэйшага ўзроўню каштоўнасьцяў грамадзтва — стаўленьня да яго самога.

**Табліца 6. Сувязь паміж узроўнем гонару быць грамадзянінам Беларусі і поглядамі на месца Беларусі ў сьвеце***

| | Ці ганарыцеся Вы тым, што Вы — грамадзянін Беларусі? Пэўна так (42,6%) | Хутчэй так (23,4%) | Хутчэй не (15,1%) | Пэўна не (5,2%) | Групавы індэкс гонару |
|---|---|---|---|---|---|
| **Ці павінна Беларусь стаць членам Эўрапейскага Зьвязу?** | | | | | |
| Пэўна так (15,5%) | 31,4 | 17,7 | 28,3 | 13,8 | 1,73 |
| Хутчэй так (31,9%) | 33,8 | 28,2 | 21,0 | 5,2 | 2,02 |
| Хутчэй не (19,8%) | 47,2 | 30,6 | 10,1 | 3,1 | 2,33 |
| Пэўна не (15.6%) | 71,3 | 12,0 | 4,0 | 0,9 | 2,74 |
| **Якая замежная палітыка для Беларусі найлепшая?** | | | | | |
| Лепшыя адносіны з РФ (30,7%) | 57,3 | 26,8 | 10,6 | 13,4 | 2,55 |
| Лепшыя адносіны з ЭЗ і ЗША (6,4%) | 28,2 | 16,5 | 29,2 | 18,3 | 1,59 |
| Лепшыя адносіны з РФ, ЭЗ і ЗША (52,3%) | 37,5 | 26,2 | 19,1 | 6,2 | 2,03 |
| У нас хапае ўласных рэсурсаў для разьвіцьця (8,0%) | 32,6 | 24,8 | 15,2 | 7,6 | 2,02 |

* Табліца чытаецца па радках.

**Табліца 5. Сувязь паміж узроўнем гордасьці грамадзянствам Беларусі і стаўленьнем да Аляксандра Лукашэнкі ***

| | Ці ганарыцеся Вы тым, што Вы — грамадзянін Беларусі? Пэўна так (42,6%) | Хутчэй так (23,4%) | Хутчэй не (15,1%) | Пэўна не (5,2%) | Групавы індэкс гонару |
|---|---|---|---|---|---|
| **Ці лічыце Вы, што ў Беларусі ёсьць людзі, якія кіравалі б краінай лепш?** | | | | | |
| Так (37,6%)** | 33,1 | 24,5 | 23,0 | 9,0 | 1,91 |
| Не (35,9%) | 59,0 | 22,5 | 7,9 | 0,9 | 2.54 |
| **Уявіце, што ў 2006 годзе адбудуцца свабодныя і справядлівыя выбары прэзыдэнта, як у 1994 г. Хто на іх пераможа?** | | | | | |
| **Будзе зноў выбраны Лукашэнка (55,0%)** | **52,5** | **23,5** | **9,5** | **2,5** | **2,43** |
| Будзе выбраны нехта іншы (25,7%) | 29,7 | 26,5 | 24,8 | 10,1 | 1,82 |
| **За каго Вы будзеце галасаваць у 2006 годзе?** | | | | | |
| За Лукашэнку (40,7%) | 60,1 | 22,3 | 5,3 | 0,6 | 2,61 |
| За кандыдата ад дэмапазыцыі (23,2%) | 27,9 | 21,9 | 29,6 | 11,9 | 1,72 |
| Ні за кога зь іх (19,0%) | 33,3 | 27,4 | 19,5 | 8,9 | 1,83 |

* Табліца чытаецца па радках, першая лічба ў асноўнай частцы табліцы азначае, што з тых, хто лічыць, што ёсьць людзі, якія кіравалі б краінай лепш за Лукашэнку, 33,1% пэўна ганарацца тым, што зьяўляюцца грамадзянамі Беларусі.
** Лічбы ў дужках — адсотак тых, хто даў адпаведны адказ сярод усіх апытаных.

Наступная Табліца 6 дэманструе сувязь паміж гонарам быць грамадзянінам Рэспублікі Беларусь і поглядамі на геапалітычныя прыярытэты краіны.

Тут мы назіраем істотны разрыў ва ўзроўнях гонару беларускім грамадзянствам паміж прыхільнікамі заходняй і ўсходняй арыентацыі краіны. Асабліва ўражвае разрыў паміж гарачымі прыхільнікамі і праціўнікамі далучэньня Беларусі да ЭЗ — апошнія па ўзроўні гонару за сваю Айчыну пераўзыходзяць палякаў і амаль дасягаюць чэмпіёнскага ўзроўню амэрыканцаў. Хаця ня менш уражвае і разрыў ва ўзроўнях гонару між прыхільнікамі добрых стасункаў толькі з Расеяй і толькі з Захадам.

Усё сказанае вышэй дапускае цалкам апалягетычную інтэрпрэтацыю: маўляў, прыхільнікі прэзыдэнта і Расеі — сапраўдныя патрыёты, а праціўнікі гэтых адвечных беларускіх каштоўнасьцяў ня любяць і «Беларусь нашу мілую».

Але гэтых «нялюбчых» аказваецца неяк ненатуральна шмат: напрыклад, пасьлядоўныя прыхільнікі і праціўнікі інтэграцыі Беларусі ў ЭЗ амаль роўныя па колькасьці, і гаварыць пра каштоўнасьці, якія падзяляюцца пераважнай большасьцю, у гэтым выпадку не даводзіцца. І па пытаньнях, датычных стаўленьня да Лукашэнкі, групы ягоных праціўнікаў знаходзяцца калі і ў меншасьці, то ў вельмі ўнушальнай, каб гаварыць пра іх адхі-



**Юры Дракахруст** — палітычны аналітык радыё «Свабода». Жыве ў Празе.

леньне ад пануючых уяўленьняў.

Тут таксама трэба адзначыць, што, хаця пытаньне пра нацыянальны гонар часта выкарыстоўваецца ў апытаньнях, якія праводзяцца ў розных краінах як індыкатар партыятызму, у нашай культурнай традыцыі гэта не зусім аднолькавыя паняткі.

Можна любіць Айчыну «дзіўнай любоўю», пра якую пісаў расейскі клясык, — любоўю, якая знаходзіць няшмат прадметаў гонару ў «стране рабов, стране господ». Тое, што ў нашым выпадку бліжэй да рэчаіснасьці менавіта такое тлумачэньне, можна давесьці вынікамі апытаньня.

Людзі, якія сапраўды ня любяць сваёй Айчыны, усьведамляюць, што знаходзяцца ў меншасьці. У той жа час прыведзеная ніжэй Табліца 7 сьведчыць аб тым, што ні апанэнты прэзыдэнта, ні нават людзі, што не адчуваюць гонару за сваё беларускае грамадзянства, у меншасьці сябе не адчуваюць.

**Табліца 7. Сувязь паміж гонарам быць грамадзянінам РБ, меркаваным галасаваньнем на выбарах 2006 году і адказамі на пытаньне: «Як вы думаеце, Вашы погляды падзяляе меншасьць ці большасьць людзей у Беларусі?»***

| | Думаю, што большасьць (67,5%) | Думаю, што меншасьць (9,9%) |
|---|---|---|
| **Галасаваньне на выбарах 2006 году** | | |
| За Лукашэнку (40,7%) | 73,5 | 6,2 |
| За кандыдата ад дэмапазыцыі (23,2%) | 69,8 | 14,2 |
| Ні за кога зь іх (19,0%) | 63,8 | 15,6 |
| Цяжка адказаць/ не адказалі (17,1%) | 53,0 | 6,1 |
| **Ці ганарыцеся Вы тым, што Вы — грамадзянін РБ?** | | |
| Пэўна так (42,6%) | 77,0 | 7,3 |
| Хутчэй так (23,4%) | 66,4 | 11,9 |
| Хутчэй не (15,1%) | 63,1 | 12,8 |
| Пэўна не (5,2%) | 59,8 | 17,0 |

* Табліца чытаецца па радках.

Як бачым, большасьцю адчуваюць сябе ня толькі прыхільнікі прэзыдэнта, праціўнікі — таксама і прыблізна ў такой жа ступені. Першая частка Табліцы 7 тлумачыць другую: сярод тых, хто не ганарыцца сваёй Айчынай, так шмат тых, хто лічыць, што іх погляды падзяляе большасьць, таму што сярод іх мала людзей, што наагул ня любяць «гэтую краіну», а шмат людзей, што любяць Беларусь лермантаўскай «дзіўнай любоўю».

Зьвесткі Табліц 5 і 6 паказваюць: пад вонкавым спакоем беларускага грамадзтва хаваюцца напружаньне, глыбокі разрыў каштоўнасьцяў і памкненьняў.

Гэта сытуацыя надзвычай неспрыяльная для дэмакратычнага разьвіцьця Беларусі. І справа ня толькі ў тым, што цяпер наша краіна ад гэтага дэмакратычнага шляху прыметна аддалілася. Згодна з клясыкамі паліталёгіі, самай важнай перадумовай дэмакратыі зьяўляецца нацыянальная еднасьць, моцнае пачуцьцё прыналежнасьці да адзінай палітычнай супольнасьці. Для таго каб меншасьць прызнала ўладу большасьці, іх павінна аб’ядноўваць нешта важнае для абедзьвюх груп, меншасьць павінна адчуваць, што большасьць — гэта большасьць з нас, большасьць ад «мы», у якую ўключаецца і меншасьць. Да таго ж меншасьць павінна быць упэўнена, што яна і насамрэч меншасьць. Калі няма ні гэтай унутранай еднасьці, ні гэтай упэўненасьці, сытуацыя пагражае выбухам.

## Падвучыце тапаніміку

**У допісе Я.Белакрыўскага «Новая менская тапаніміка» (№25, 8 ліпеня)** засмуціла безапэляцыйнасьць аўтара, які паставіў у адзін шэраг Мясьнікова і Мельнікайтэ, Сьвярдлова і Харужую. Героі і гераіні апошняй вайны сваёй мужнасьцю і пакутніцкай сьмерцю заслужылі, каб менскія вуліцы насілі іх імёны. Вера Харужая, апроч таго, змагалася за правы беларусаў у даваеннай Польшчы.

Няслушна казаць, што Талстой, Маякоўскі ня мелі «ніякага дачыненьня да беларускай культуры». У 1910 г. «Наша Ніва» называла Талстога «сумленьнем цэлага сьвету» (№46), а Якуб Колас напісаў верш «Памяці Талстога». У 1920-я Маякоўскі ўплываў на літаратараў-маладнякоўцаў і творчасьцю, і жывым прыкладам, выступаючы ў Менску.

Што да заклiку ўшанаваць імёны В.Ваньковіча і І.Буйніцкага, дык у раёне станцыі мэтро «Ўсход» ёсьць вуліца Ваньковіча, вуліца і завулак Буйніцкага.

Таксама моцна зьдзіўляе, што ў чэрвеньскім нумары «Навін БНФ» сп.Вячорка прапануе перайменаваць Трактарную і Танкавую. Дзе тыя вуліцы шукаць? Ім яшчэ ў канцы XX ст. нададзены імёны Азгура і Танка.

**Уладзімер Паўловіч, Менск**

## Заява Алеся Анціпенкі

**1 ліпеня газэта «Głos znad Niemna» перадрукавала мой артыкул «Звычайны беларус»,** які ўпершыню зьявіўся ў 1995 г. у кнізе «Стэрэатыпы і нацыі», выдадзенай па-ангельску і па-польску.

Гэта абуральны факт, бо ніхто з рэдкалегіі газэты не зьвяртаўся да мяне па дазвол на перадрук. А таму зьяўленьне артыкулу без майго дазволу выглядае як парушэньне аўтарскіх правоў. Гэта тым больш прыкры для мяне факт, што на сёньня газэта набыла скандальную вядомасьць. У выданьнях з падобнай рэпутацыяй я ніколі не друкую сваіх артыкулаў і ніколі не пагадзіўся б надрукаваць, калі б да мяне зьвярнуліся па дазвол. У гэтай справе я пакідаю за сабой права звароту ў суд.

**Алесь Анціпенка**

## Стужкі патрыётаў

**Падчас сьвяткаваньня Дня незалежнасьці ў Баранавічах чальцы БРСМ раздавалі мінакам чырвона-зялёныя стужкі** з заклікам навязваць іх на адзеньне ці антэны аўто. Гэткім чынам можна было выказаць сваю любоў да Бацькаўшчыны. Новай уладзе давядзецца добра папрацаваць, каб вярнуць на пачэснае месца бел-чырвона-белы сьцяг і «Пагоню». Простага дэкрэту будзе недастаткова.

Давядзецца ажыцьцяўляць розныя рэклямныя захады і весьці тлумачальную працу. У Баранавічах ведаю хлопца, які яшчэ некалькі год таму шпацыраваў па горадзе з чырвона-зялёным значком, спрабуючы размаўляць па-беларуску. На пытаньне, чаму ён носіць такі значок, шчыра зьдзівіўся: «А які яшчэ?» Хапіла невялікай тлумачальнай гутаркі ды некалькіх кніжак па гісторыі, каб ён стаў бел-чырвона-белым нацыяналістам. Зрэшты, ён ім ужо быў, проста ня меў сапраўднай інфармацыі.

Ня будзе сакрэтам, што за дзесяць год вырасла новае пакаленьне. Пакаленьне, якое любіць Беларусь, хоча яе незалежнасьці, але ні халеры не ўяўляе пра сапраўдную гісторыю краіны і сымболіку. Гэтак склаўся лёс, і гэтак не дапрацавала настаўніцтва — наш праслаўлены ў СМІ выкладчыцкі склад, які пастаянна наракае на дурных навучэнцаў і іх сварлівых бацькоў. Настаўніцтва, якое выйшла зь вёскі і збольшага ненавідзіць сваю прафэсію і лёс. Настаўніцтва, з дапамогаю якога праводзяцца ўсе выбары і рэфэрэндумы. Тыя сейбіты разумнага і вечнага, што маглі б даць (і даюць, але толькі 1% адданых і няўрымсьлівых) маладым беларусам сапраўдныя веды.

Магчыма, усім, каму баліць за нашу Беларусь, усім патрыётам і нацыяналістам некалі трэба было ісьці ў настаўнікі…

**Руслан Равяка, Баранавічы**

## Новыя словы і новы час

**У аповесьці «Хаджы-Мурат» Л.Талстой прымяніў нерасейскае слова *паскароджаная*.** Мабыць, у той час агратэхнічнаму прыёму, запазычынаму зь Літвы, у расейскай мове не было адпаведніка. Пазьней расейскія філёлягі знайшлі адпаведнік: *паскароджаны — пабаранаваны*, *скарада — барана*. Да сёньня расейскія пісьменьнікі карыстаюцца словам *літоўка*. Слова прыйшло некалі разам з прыладай працы. Такіх прыкладаў можна прывесьці мноства. Мы ж маем і адваротныя цяжкасьці, беларускія адпаведнікі.

У сваіх тэкстах стараюся максымальна прымяняць беларускія словы. І вось пішу ў «Воклічы» *габінэт* (паводле Байкова і Некрашэвіча), *палікі*, у іншых апавяданьнях — *цытрыны*, *лекар*, але карэктар рашуча мяняе іх на *кабінэты*, *пагоны*, *лімоны*, *доктар*…

Чытаю ў Арлова слова *чыюк* ‘папугай’ — слова кладзецца ў памяці зразу. У «Нашай Ніве» студэнткі МДМУ агучваюць наватвор — *цэля* ‘клетка’. Сам прыдумляю словы: *гуза* ‘кнопка’, *дзеявод* ‘плян, праграма’. Адкопваю ў чэскім слоўніку слова *выбойны* ‘энэргічны’.

Цяжкасьці з адпаведнікамі ўзьнікаюць таму, што ніхто прафэсійна не займаецца пошукам і стварэньнем новых беларускіх слоў і паняткаў. І таму магутны патэнцыял мовы не раскрываецца так, як можна было б яго раскрыць. З асалодай чытаю такіх выдатных знаўцаў мовы, як Акудовіч, Глёбус, Мудроў, Юры Станкевіч.

Праблема ў тым, што мова выведзена з ужытку, са СМІ. І выйсьце бачу ў тым, каб ствараць нашым пісьменьнікам такія тэксты, безь якіх разумны чалавек ня можа аніяк абысьціся. Не прачытаць — значыць сябе абрабаваць. Як, напрыклад, эсэ В.Акудовіча «Вялікая здрада» ў «Дзеяслове» №10—12 за 2004 год ці аповесьць І.Клімянкова «Корак з-пад шампанскага». Гэтыя творы — ужо эўрапейскі ўзровень. Не прачытаць гэтыя тэксты — значыць затрымацца ва ўласным разуменьні сучаснага складанага і супярэчлівага гістарычнага часу. Вяртаючыся да праблем наватвораў, адзначу, што існуе патрэба ў энтузіястах-філёлягах, якія б сыстэматызавалі стыхійную працу і на старонках часопісаў ці «Нашай Нівы» раз у год друкавалі вынікі сыстэматызацыі.

**Кастусь Травень, Менск**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб’ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

## Найтаньнейшая падпіска: сьпіс шапікаў

Найтаньнейшая падпіска на «НН» — на шапікі «Менгарсаюздруку». Каштуе такая падпіска на месяц усяго 3440 рублёў. Забіраць сваю газэту можна ў любой зручнай для вас гандлёвай кропцы «Белсаюздруку» ўжо ў чацьвер па абедзе. Друкуем адрасы пунктаў, дзе можна аформіць падпіску «Да запатрабаваньня».

**Участак падпіскі «Белсаюздруку»:**

| | |
|---|---|
| вул.Валадарскага, 16, пак.200 | 227-88-41 |
| **Пункты прыёму падпіскі:** | |
| вул.Жукоўскага, 5, корп.1 | 224-32-03 |
| вул.Раманаўская Слабада, 9 | 200-83-04 |
| вул.Кашавога, 8 | 230-29-20 |

**Крамы:**

| | | |
|---|---|---|
| №1 | вул.Жукоўскага, 5 | 224-03-76 |
| №2 | пр.Скарыны, 44 | 284-83-59 |
| №3 | пр.Скарыны, 76 | 232-46-23 |
| №4 | вул.Леніна, 15 | 227-11-92 |
| №5 | вул.Енісейская, 6 | 243-16-30 |
| №6 | вул.Філімонава, 1 | 235-63-11 |
| №7 | вул.Коласа, 69 | 288-30-20 |
| №8 | вул.Сурганава, 40 | 232-45-10 |
| №9 | пр.Ракасоўскага, 140 | 247-30-15 |
| №10 | бульвар Шаўчэнкі, 7 | 233-74-88 |
| №11 | пр.Пушкіна, 77 | 255-80-71 |
| №12 | вул.Кіжаватава, 80 | 278-77-61 |
| №13 | вул.Каліноўскага, 82/2 | 264-06-42 |
| №14 | вул.Валадарскага, 22 | 227-75-55 |
| №15 | вул.Танка, 16 | 203-82-39 |
| №16 | вул.Харужай, 24 | 234-27-25 |
| №17 | вул.Някрасава, 35 | 231-03-28 |
| №18 | ст.м. «Плошча Перамогі» | 284-31-06 |
| №19 | пр.Машэрава, 5/1 | 223-81-66 |
| №20 | вул.Ясеніна, 16 | 271-87-21 |
| №21 | ст.м. «Пушкінская» | 255-57-20 |
| №22 | вул.Ілімская, 10, корп.2 | 243-16-83 |
| №23 | вул.Славінскага, 39 | 264-36-33 |
| №24 | вул.Жылуновіча, 31 | 295-05-74 |
| №25 | вул.Маркса, 21 | 227-08-52 |
| № 26 | пр.Скарыны, 113 | 264-22-91 |

**Шапікі:**

| | |
|---|---|
| №18 | БДТУ, вул.Сьвярдлова, 13/4 |
| №18 | Пэдунівэрсытэт, вул.Савецкая, 18 |
| №78 | Гатэль «Юбілейны», пр.Машэрава, 19 |
| №95 | Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, вул. Мясьнікова, 39 |
| №136 | ст.м. «Плошча Якуба Коласа», выхад да Акадэміі фізвыхаваньня |
| №187 | Гатэль «Беларусь», вул.Старажоўская, 15 |
| №189 | Аўтавакзал «Маскоўскі» |
| №198 | БДЭУ, пр.Партызанскі, 26 |
| №209 | Прахадная МАЗу, вул.Сацыялістычная, 2 |
| №228 | Унівэрсытэт культуры, вул.Рабкораўская, 17 |
| №232 | Менскі з-д халадзільнікаў, пр.Машэрава, 61 |
| №245 | Больніца хуткай дапамогі, вул.Кіжаватава, 56 |
| №259 | Менскі гандлёвы каледж, вул.Усходняя, 183 |
| №260 | пр.Скарыны, 169 |
| №262 | Гатэль «Плянэта», пр.Машэрава, 31 |
| №298 | пр.Машэрава, 75/1 |
| №302 | 9-я больніца, вул.Сямашкі, 8 |
| №313 | Слабадзкі праезд, 24 |

# Моладзь ратуе Крэўскі замак



Славуты Крэўскі замак апынуўся пад пагрозай зьнікненьня — каменьне растае на вачах, з кожным годам замак усё больш разбураецца, і з часам мы рызыкуем страціць унікальны помнік беларускай абарончай архітэктуры XIV ст. — сьведку гісторыі ВКЛ. Тут паводле загаду Ягайлы быў задушаны Кейстут, у 1385 г. падпісаная Крэўская унія, 620-годзьдзе якой будзе адзначацца ў жніўні. Пабачыла Крэва і набегі крымскіх татар і Першую сусьветную вайну.

Прыедзьце ў Крэва, і мясцовыя жыхары раскажуць вам мноства легендаў: пра царкву, што правалілася пад зямлю з прычыны грахоў людзкіх, пра падземны лаз, што вядзе да самай Вільні, пра прыгажуню, якую замуравалі ў замкавай сьцяне. Пасьля захаду сонца замак нібыта ажывае. Можна пачуць удары молата, бразганьне ланцугоў пад’ёмнага мосту, якога даўно не існуе. Калі прыкласьці вуха да сьцяны, то можна пачуць конскае ржаньне і грукат капытоў і пабачыць дзіўныя цені на сьценах. Відаць, ніяк не суцішыцца падмануты Ягайла і сабраная ім пагоня за слаўным Вітаўтам.

Таму замак ня мусіць зьнікнуць. У жніўні ў Крэве будзе наладжаны новы добраахвотны летнік. Моладзь зьвяртаецца да грамадзтва з просьбай аб дапамозе. Кожны можа ўзяць удзел у справе яго выратаваньня. Для правядзеньня работ патрэбны будаўнічыя матэрыялы (дошкі, цьвікі, вапна, рубэройд, цэмэнт, фарба), транспарт, працоўны інвэнтар, харчовыя прадукты. Юныя ахвотнікі разумеюць, што бяз спонсарскай падтрымкі дарослых ім будзе цяжка. Аптымізм і энэргія здольны рушыць зь месца вялізныя камяні. Гісторыя ведае прыклады, калі помнікі сусьветнага значэньня аднаўляліся дзякуючы ініцыятыве грамадзкай супольнасьці. Так былі адбудаваны замак у Троках, Вавельскі замак у Кракаве.

**Павал Каралёў, Раман Абрамчук**

**P.S. Усіх, хто можа дапамагчы ў добрай справе выратаваньня замку, просім зьвязвацца па тэл.: 8-029-776-24-35 — Павал Каралёў, старшыня праўленьня дабрачыннага фонду «Крэўскі замак», 8-029-568-05-69 — Вольга Кастрамінава, дырэктар дабрачыннага фонду «Крэўскі замак».**

# Паршавічы. Загародзьдзе

Якія шэксьпіраўскія жарсьці мне прыйшлося назіраць! Успаміны **Міколы Сьцебуракі** запісаў ягоны сын **Усевалад**.

### Харугва

По кудзелі я пінчук з Загародзьдзя зь вёскі Паршавічы. Вёска згадваецца ўпершыню яшчэ ў XVII ст. Але калі будзеце шукаць яе на сучаснай мапе, паселішча ня знойдзеце. У 1964 г. улады перарабілі назву на Бярозавічы.

У цэнтры сялібы і цяпер стаіць царква, якую зрубілі і аздобілі вясковыя майстры. За 130 год яна ніколі не зачынялася, за савецкім часам вернікі не далі вынесьці з царквы абразы, начыньне, перашкодзілі зьняць званы. Бажніца ва ўсе часы заставалася сэрцам паселішча, зьбірала з ваколіц на набажэнствы і асабліва на сьвяты вялікую колькасьць людзей.

На Вялікдзень я быў у Бярозавічах. У храме мелася восем старадаўніх харугваў, якія на хросны ход па традыцыі выносілі добрыя прыхаджане зь ліку мясцовых мужыкоў. Гэтым разам адну харугву староста даручыў несьці мне — ва ўсёй царкве не знайшлося васьмёх сваіх мужчын.

### Перамога цывілізацыі

У Бярозавічах мой дзед Васік быў вядомы як спраўны сталяр. Пры патрэбе рабіў розныя неабходныя прылады. Апроч таго, майстраваў ён ладныя труны, і праз тое ў свой час ніводзін аднавясковец не абыходзіўся бязь дзедавага вырабу.

На сваім гарышчы дзед Васік заўсёды меў невялікі запас нарыхтаваных дошак, што сушыліся там, чакаючы, калі майстар выцягне іх на сьвятло з чарговае сумнае нагоды. Так рабіў ён дамавіны сябрам, суседзям, і было нешта такое ў гэтым апошнім дарунку свайму земляку, чаго пасьля ня стала.

Калі хавалі старога Васіка, сышліся ўсе жыхары вёскі — разьвітацца і падзівіцца на раней нябачаную дзіўную рэч. Зь Пінску дзеду прывезьлі абабітую прыгожай тканінай труну з бліщчастымі ручкамі дзеля лацьвейшага перасоўваньня. Ля гэтага дзіва людзі стаялі моўчкі і, нават калі прыклалі вечка, цішыню не парушыў звычайны грукат малатка, што заганяў цьвікі. Хітрыя балты бязгучна прыцягнулі накрыўку дамавіны, у якой ляжаў апошні бярозавіцкі сталяр.

### Белы пух

За некалькі дзесяцігодзьдзяў жыцьцё ў вёсцы непазнавальна зьмянілася. На ўезьдзе ў паселішча ля крамы з самага ранку стаіць купка мужчын. У зашмальцаваных ватоўках, гумовых ботах, няголеныя, зь сізымі насамі, яны жывуць адным інтарэсам — набыць пляшку віна. І сама вёска, сьцішэлая, напаўпустая, глядзіць на гэтае беспрасьвецьце забітымі вокнамі занядбаных хат.

А раней тут будаваліся немалыя гаспо-






**Дзедава хата, збудаваная ў Паршавічах, у 1964 г., не кранаючыся зь месца, «перамясьцілася» ў Бярозавічы.**



МІКОЛА СЬЦЕБУРАКІ

**Дзед Зьміцер і баба Зіна, сьведкі апошніх бярозавіцкіх жарсьцяў.**

ды, людзі жаніліся, нараджалі шмат дзяцей. Моладзі ў клюбе не хапала месца на танцах. Паселішча жыло сапраўдным паўнавартасным жыцьцём, якое часам ажно пералівала цераз край.

Аднойчы, прыехаўшы ў Бярозавічы сярод лета, з дарогі я ўбачыў фантасмагарычнае відовішча. Уся вёска патанала ў белым пусе. Пух ляжаў пад платамі, лётаў у паветры, кружляў па дварах, чапляўся за дрэвы і прысады. Белы пух невядомага паходжаньня плаваў па паверхні вялікіх калюг, прыставаў да вопраткі вяскоўцаў і ўтвараў дзівосную і невытлумачальную карціну. Выявілася, што карані дзіўнае зьявы палягалі ў сфэры гарачых пачуцьцяў мясцовых жанчын. Белае покрыва сталася вынікам помсты разьюшанае кабеты Каштаніхі, што парэзала ў запале рэўнасьці ўсе падушкі суседкі Ракошы, выкладзеныя на сонейка. Казалі, што апошняя была спакусьніцай ахвочага да прыгод мужа раўнівіцы.

Калі іду паўз сумных і абыякавых да ўсяго п'янтосаў, праз мёртвую вёску, ня верыцца, што так нядаўна тут віравала жыцьцё з амаль шэксьпіраўскімі жарсьцямі.

### 64 гады таму

Для маёй бабулі Зіны, што жыла ў палескай вёсцы Бярозавічы, вайна пачалася ранкам 22 чэрвеня — але не з выступленьня Молатава па радыё, а зь цяжкога басавітага гудзеньня самалётаў, што нечакана павісла над навакольлем.

Людзі займаліся звычайнымі гаспадарчымі справамі: жывёла была ў полі, у дварах завіхаліся гаспадары, — калі з захаду з-за лесу паказаліся самалёты. Дзьве вялікія няўклюдныя машыны, падобныя да стомленых птушак, з гудзеньнем, што адчувалася скурай, павольна рухаліся па чыстым ранішнім небе. Гэтыя два бамбавікі з чырвонымі зоркамі на падкрыльлі дзіўным чынам прыцягвалі ўвагу. У іх нечаканым зьяўленьні было нешта трывожнае, і неспакой адразу перадаўся ўсім, хто быў на зямлі, прымусіўшы пакінуць працу і, не адрываючыся, глядзець на гіганцкіх чмялёў.

Праз колькі імгненьняў за дзьвюма вялікімі машынамі вылецелі некалькі маленькіх жвавых самалёцікаў з крыжамі. Адлегласьць паміж імі хутка скарачалася, і маленькія самалёты распачалі атаку. Безабаронныя «сталінскія сокалы» нічога не маглі супрацьпаставіць зьнішчальнікам. Машыны гэтага тыпу, прызначаныя для зьнішчэньня наземных аб'ектаў, былі проста не прыстасаваныя для вядзеньня паветранага бою. З бамбавікоў пайшоў густы чорны дым, і яны сталі зьніжацца. З нутра пачалі выскокваць чалавечыя фігуркі, спрабуючы ўратавацца. Над іх галовамі адзін за адным раскрываліся белыя купалы парашутаў, і дзіўныя дзьмухаўцы нібы застылі над полем. Зьнішчальнікі, не задаволіўшыся перамогай, робячы новыя і новыя кругі, пачалі паляваць на лётчыкаў, расстрэльваючы іх з кулямётаў. Некалькі парашутаў загарэліся, і фігуркі, што былі пад імі, хутка паляцелі на зямлю. Іншыя апусьціліся павольна. Машыны з крыжамі зьніклі гэтак жа хутка, як і зьявіліся.

Сяляне, справіўшыся зь першапачатковай разгубленасьцю, рушылі грамадой да месца падзеньня лётчыкаў. У высокім жыце знайшлі целы. Некаторыя вайскоўцы загінулі яшчэ ў паветры ад куль, іншыя — ад удару аб зямлю пры падзеньні. Запрогшы калёсы, мужыкі пазвозілі памерлых да вясковае царквы, за агароджай якой іх і пахавалі.

Падбітыя самалёты адшукалі за некалькіх кілямэтраў за вёскай. Гаспадарлівыя палешукі паціху паразьбіралі парэшткі машын на свае патрэбы. Сёе-тое пайшло кавалям, нешта проста расьцягнулі хлопцы. І ўся вёска рабіла лыжкі і пасудзіны з алюміну фюзэляжаў ды чуні з гумы колаў шасі. Шоўк парашутаў падзялілі тыя, хто звозіў нябожчыкаў. Урэшце засталіся ў лесе ад самалётаў толькі непад'ёмныя рухавікі ў варонках, а пра вайскоўцаў нагадвалі безыменныя пагорачкі з крыжамі ля царквы.

Праўда, праз пэўны час паветраны бой прыгадалі яшчэ раз, калі ў аднае сям'і, што не была сярод удзельнікаў падзелу парашутаў, аднекуль зьявіліся шаўковыя кашулі. Выявілася, што гаспадар знайшоў яшчэ аднаго забітага лётчыка, што ўпаў далей за іншых, але не прывёз яго, каб пахаваць, а проста абрабаваў і пакінуў у жыце.

Гэты паветраны бой быў толькі адным са шматлікіх эпізодаў вайны, якая доўгія чатыры гады валадарыла над людзкімі лёсамі. Неўзабаве ўсталявалася новая ўлада, зьявіўся і партызанскі супраціў ёй, а пасьля прыйшло і вызваленьне.

Паціху зьеліся лыжкі і знасіўся шоўк. Гісторыя пачала адыходзіць у нябыт і, чутая неадноўчы ад старых людзей, паступова стала ператварацца ў мясцовую легенду. Чуўшы гэты аповед у дзяцінстве, я сам яго стаў успрымаць як паданьне і ніколі не чакаў, што сутыкнуся з гэтай гісторыяй яшчэ недзе, апроч бабуліных расказаў. Год колькі таму ў пэрыядычным друку мне трапіў на вочы артыкул, у якім сухой мовай публіцыстыкі быў пераказаны ня раз чуты мной выпадак.

Я даведаўся, што тыя два савецкія бамбавікі, што загінулі ля вёскі, былі рэштай 39-га бамбавіковага палка маёра Захарычава. Гэты полк складаўся зь сярэдніх бамбавікоў (СБ) ды новых ПЕ-2 і базаваўся ў Пінску. Раніцай 22 чэрвеня полк быў чатыры разы запар атакаваны на сваім аэрадроме і страціў 25 машын, але астатнія машыны здолелі падняцца і нанесьці пасьпяховы і нечаканы ўдар па нямецкіх танках у раёне пераправы цераз раку Буг ля Мельніку. Пры вяртаньні з заданьня ўсе 18 самалётаў былі зьбітыя. Бамбавікі, вылецеўшы без жыцьцёва неабходных ім самалётаў суправаджэньня, пайшлі на сьвядомую сьмерць і знайшлі яе як адзін, вяртаючыся на свой аэрадром. Дзьве машыны зрабілі сваю апошнюю пасадку, не дацягнуўшы 15 кілямэтраў да роднага аэрадрому.

Выйшла так, як, на жаль, выходзіць вельмі рэдка — скупыя дакумэнтальныя факты з вайсковых архіваў пацьвердзілі асабістыя ўспаміны з памяці выпадковага і неабазнанага сьведкі ды склаліся ў жывую гісторыю вайны.

* * *

Пасьля вайны ў вёску прыяжджалі сваякі лётчыкаў, каб распытаць пра апошнія хвіліны жыцьця і падзякаваць за ўшанаваньне памяці іх родных.

Калі ваенная тэма пачала асабліва жорстка эксплюатавацца ў ідэалягічных мэтах, зь Пінску прыехалі вайсковыя начальнікі і забралі парэшткі лётчыкаў зь цьвінтара ў брацкую магілу ў горадзе.

# Смажні, кнышы, кулябякі

Сучасны беларускі смажань куды маладзейшы за гамбургер. Кныш куды больш гістарычны смажань. Кулябяка ж прыйшла да нас з усходу. Новыя порцыя смакаты ад Алеся Белага.



МАЛЮНАК СЯРГЕЯ ХАРЭЎСКАГА

Кожны народ мае адмысловы нацыянальны пірог зь мясной, рыбнай або посьнай начынкай. Грэцкая піта, сярэднеазіяцкая самса, крымскія чабурэкі… Амэрыканскі гамбургер, які пару гадоў таму адзначыў 100-годзьдзе — адзін з самых прымітыўных варыянтаў гэтай унівэрсальнай стравы.

А вось французы ў свой час настолькі сур'ёзна ставіліся да паштэтаў (якія, насамрэч, ёсьць пірагамі з начынкай), што гэтая галіна мастацтва лічылася разьдзелам не кулінарыі, а архітэктуры. Прынамсі, на гэтым настойваў Антанэн Карэм — вялікі кулінар, паштэтнік і філёзаф. Мы сёньня ведаем паштэт толькі як начынку. Што ж, гэта ня самы горшы выпадак — значна часьцей у гісторыі беларускай культуры ад зьявы застаецца толькі абалонка, а якраз зьмест беззваротна губляецца.

Сучасны беларускі смажань, мусіць, куды маладзейшы за гамбургер. Генэалёгія ў яго цьмяная, як у Чабурашкі. Зьявіўся ён недзе пры канцы 1970-х, але адкуль прыйшоў, з чым спалучаецца, што сымбалізуе — ніхто ня ведае. Філёлягі кажуць, што слова ўтворана па ўсіх канонах беларускай мовы, але чамусьці ў акадэмічныя слоўнікі ўключаць яго асьцерагаюцца. Відаць, падсьвядома смажню ўсё ж не давяраюць, як і яго аналягам у іншых галінах культуры — полечцы-трасусе, сакавітаму народнаму гумару з Аўцюкоў, дзяржаўнаму сьцягу, вынікам выбараў. Сапраўды, атруціцца нясьвежым смажнем надзвычай лёгка, як ня раз давялося пераканацца аўтару гэтых радкоў у бесклапотныя студэнцкія гады. Але ня будзем занадта шчыраваць з самабічаваньнем: «junk food» як і ўсе, ня горшы за паспаліты гамбургер. «Хутка-смачна» — што яшчэ ад фастфуду чакаць?

Кныш куды больш гістарычны за смажань, але які сэнс у той гістарычнасьці, калі яго немагчыма ня тое што пакаштаваць — убачыць муляж за пыльнай вітрынай? Кныш — сваяк расейскай ватрушкі і нямецкага бэрлінэра. Так называўся колісь невялікі круглы піражок з запечаным унутры (або выкладзеным на паверхні, паміж прыўзьнятымі краямі, як фарш у смажні) тварагом. Або варэньнем, або пасэраванай цыбуляй. Кнышы з цыбуляй і грэцкай кашай у XIX ст. падаваліся ў сярэднезаможных дамах як дадатак да мясных страў. На пачатку мінулага стагодзьдзя слова спрабаваў зьберагчы Ластоўскі, абараняючыся ад экспансіі ватрушкі. Паводле яго, «кнышы пякуцца з тварагом, макам, каноплямі і канфітурамі». Страва гэтая чыста наша, ня польская; даўней палякі казалі: «Русь пячэ кнышы памерлым»; але ў нас не засталося ані слова, ані зьявы, то цяпер толькі дзякуючы палякам і захавалася нейкая памяць пра кнышы.

Будзем спадзявацца, што пакаштуем яшчэ сваіх кнышоў, і ня толькі жалобных. Для пачатку можна было б перайменаваць у кнышы наяўныя ватрушкі. І нават бэрлінэры.

Яшчэ адна страва гэтага кшталту — кулябяка, або кулябяк. Можа, і не зусім наша, але папулярная калісьці і ў нас. Гісторыя кулябякі вельмі заблытаная. У XVII ст., у часы Аляксея Міхайлавіча, які дасягнуў вялікіх (але часовых) посьпехаў у расейска-беларускай інтэграцыі, зьяўляецца гэты пірог з начынкай у нашых усходніх суседзяў. Пачаткова кулябякі пякліся выключна з дражджавога цеста, зь некалькімі праслойкамі фаршу — з капусты, грэцкай кашы, крутых яек, сушанай і варанай рыбы, грыбоў, цыбулі і інш. Менавіта такімі пірагамі гандляваў на маскоўскіх рынках да пачатку сваёй неймавернай кар'еры будучы найсьвятлейшы князь, «мін херц» Аляксандар Меншыкаў, як кажуць, выхадзец зь Беларусі. А сама кулябяка — выхадзец ці не зь Нямецкай слабады, бо загадкавую назву выводзяць ня зь фінскіх або цюрскіх моў, але ад нямецкага «Kohlgebäck» — «запечаная [ў цесьце] капуста». На пачатку XIX ст. французскія кулінары, якія працавалі ў Расеі, надалі кулябякам міжнародную вядомасьць і адаптавалі іх рэцэптуру пад патрабаваньні «высокай кулінарыі»: іх сталі гатаваць з больш далікатнага слоенага, ці, як казалі тады, «французскага» цеста, у якасьці начынкі ўжываць дзічыну, шампіньёны, рыс, ласося. Мода на кулябякі, ужо пад французскім уплывам, трапіла і ў арыстакратычныя двары шляхты Польшчы, Беларусі, Літвы, дзе кухмістры мясцовых магнатаў стварылі свае арыгінальныя рэцэпты кулябяк. Такая арыстакратычная неразборлівасьць у густах была магчымая толькі да 1830 г., калі рамантычным ілюзіям бліскучых касмапалітычных лайдакоў зь Дзярэчына ды Нясьвіжу быў падкладзены канец. Але кулябяка ўжо прыжылася, заваявала давер тагачаснай сярэдняй клясы і дажыла да трыюмфу гістарычнага матэрыялізму, уцёкшы за Буг разам зь іншымі недабіткамі толькі ў 1944 г. На радзіме ж, здаецца, асаблівых рэпрэсій супраць яе не было.

Традыцыйная кулябяка робіцца са слоенага або дражджавога цеста, раскачанага ў прастакутнік таўшчынёй 1 см; у цэнтар выкладаецца фарш, часта зь некалькіх розных пластоў, загортваецца, старанна зьляпляецца. Згорнутая кулябяка выкладаецца швом уніз на нашмараваную тлушчам бляху, пакідаецца на пэўны час, каб цеста паднялося. Перад запяканьнем у духоўцы нашмароўваецца яйкам і наколваецца ў некалькіх месцах відэльцам. Кулябякі звычайна падаюць парэзанымі на кавалкі, палітыя топленым маслам — як самастойную страву і як дадатак да булёнаў, супоў. Магчыма, кулябякі па-сапегаўску і па-радзівілаўску — ідэальны пачастунак на шматлікія сьвяты ўсходнеславянскай інтэграцыі: аддаўшы належнае арыстакратычнай кулінарыі нашых усходніх *браткоў*, можна прачытаць ім і лекцыю пра нашых арыстакратаў.

### Слоенае цеста на кулябякі:

Асноўныя складнікі цеста — мука і масла ў суадносінах 1:1, дадатковыя складнікі — яйкі ці яечны жаўток, лімонны сок ці вінны воцат, якія перашкаджаюць тлушчу пранікаць у цеста, ці раздробнены кіслы тварог.

Найперш належыць замяшаць цягучае цеста, як на пірагі, з дабаўленьнем яйка, лімоннага соку ці тварагу. Раскачаць яго на пасыпанай мукой дошцы, абшмараваць маслам, скласьці напалам, зноў раскачаць, зноў абмасьліць і зноў скласьці; так рабіць да таго, пакуль масла цалкам не ўкачаецца ў цеста. Пры раскочваньні на качалку трэба націскаць лёгка і раўнамерна, захоўваючы адзін напрамак — ад сябе вонкі. Нельга таксама цеста пераварочваць, каб не пашкодзіць яго структуры. Французскае цеста запякаецца пры высокай — 250°C — тэмпэратуры 15—30 хвілін, прычым прыблізна праз 10 хвілін запяканьня, калі цеста паднімецца, тэмпэратуру належыць зьменшыць.

Заўвага: слоенае цеста вельмі працаёмкае, але большасьць традыцыйных «ліцьвінскіх» кулябяк можна пячы і з дражджавога цеста.

### Кулябяка па-сапегаўску

**Начынка:** 400 г квашанай капусты, 30 г сушаных грыбоў, 100 г вэнджанай шынкі ці грудзінкі, 1—2 цыбуліны, 1,5 лыжкі тлушчу, яйка для шмараваньня, соль і перац на смак.

Грыбы памыць, вымачыць і згатаваць. Капусту пашынкаваць, заліць грыбным адварам, даць пакіпець, не накрываючы. Цыбулю абабраць, парэзаць і падсмажыць, перамяшаць з капустай, нарэзанымі грыбамі і пакроенай на палоскі шынкай, заправіць прыправамі. Цеста падзяліць на дзьве часткі: адну меншую, другую большую. Сфармаваць зь іх прастакутнікі таўшчынёй 1 см. На меншы прастакутнік цеста выкласьці слаямі начынку, не забываючы пакінуць вакол кант шырынёй 1—2 см. Затым накрыць усё вялікім кавалкам цеста, зьляпіць берагі, пашмараваць узьбітым яйкам і запячы ў гарачай духоўцы.

### Кулябяка па-радзівілаўску

**Начынка:** 300 г смажанай курацыны без касьцей, два яйкі, звараныя ўкрутую, 150 г вэнджанай шынкі, бацьвіньне пятрушкі, соль і перац на смак, сырое яйка для шмараваньня.

Мяса, шынку і вараныя яйкі нарэзаць кубікамі, перамяшаць з пашынкаваным бацьвіньнем пятрушкі, дадаць соль і перац. Далей гатаваць, як у папярэднім рэцэпце.

**Вышэйшая адукацыя ў Польшчы**

Дыплёмы Польшчы і Вялікабрытаніі

Вышэйшая школа камэрцыі і права імя Р.Лазарскага ў Варшаве прапануе 3 бясплатныя месцы для студэнтаў зь Беларусі

**Школа Лазарскага — гэта:**

- пазыцыя лідэра ў ранкінгах ВНУ;
- найлепшыя навуковыя кадры, прафэсары з Польшчы, Заходняй Эўропы, Паўночнай Амэрыкі, выкладаньне папольску, ангельску, нямецку;
- няспынная вывучэньне замежных моваў;
- больш за 8,6 тысячаў студэнтаў, 12,8 тысячаў выпускнікоў;
- польскія і замежныя стажыроўкі;
- дапамога ў пошуку працы;
- неабмежаваны доступ да кампутараў і Інтэрнэту;
- інтэнсіўны курс польскай мовы для замежнікаў.

**Прапануем наступныя кірункі:**

Эканоміка
Кіраваньне і маркетынг
Фінансы і банкаўская справа
Інфарматыка
Міжнародныя стасункі
Права
Адміністраваньне

**Кантакт у Беларусі:**
**029-733-26-72,**
**E-mail: lazarski@tut.by**
**Кантакт у Варшаве:**
**+48 22 543 55 55,**
**www.lazarski.pl**



## Юры Дзенісюк

ЛЯ РОДНАЙ СЯЛІБЫ

Мінаю апошняе ляда…
Вітае сасна з бусьлянкай,
Дзе брат барану прыладзіў
Калісьці вясновым ранкам.

Узьнікла з-за птушак сварка —
Сусед да сябе іх вабіў.
Ды ўсіх прымірыла чарка,
Дарослым і нам на радасьць.

За склепам куст барбарысу,
Як і ў дзяцінстве, родзіць.
Ягады — вогненны прысак,
Каралі вясковых модніц.

Смак іх з лагоднай кісьлінкай —
Птушак лясных спакуса —
У хлопчыкаў і дзяўчынак
І сёньня гарыць на вуснах…

Сінічкі, дразды, амялушкі —
Маленства майго папялушкі,
Я перад вамі вінен,
Мы хлебам жылі адзіным.

Вось тут я садзіў рабіну
Побач зь сьлівовым плотам.
Бружмель ля старой адрыны —
Таксама папас істотны.

І сэрца маё гаруе
Аб родных, аб даўнім леце…
Жыцьцё на сялібе вірue —
Гуляюць пляменьніка дзеці.

## Паліна Грычык

***

Гарэлка, булькочучы з рыла,
Булькочучы загаварыла:
— Я на зямлі такая сіла,
Што пад сябе усё падбіла!
Я для людзей — здароўю шкода,
А для дзяржавы я выгода.
Мяне урад высока цэніць
І нінавошта не заменіць.
Відаць, усё на сьвеце дрэнь,
Я ж даражэю кожны дзень.
І не баюся я нікога,
Мне ўсюды сьветлая дарога.
Заўсёды ў мяне кліентаў шмат —
Мужчын, жанчын, хлапцоў, дзяўчат.
Дабро зрабіць я не магу,
А вось бядзе дапамагу!
Не абыду нідзе нікога:
Зраблю з разумнага дурнога.
Па-свойму кожнага пацешу:
Каго ўтаплю, каго павешу.
З кішэні выцягну зарплату,
Дашчэнту апустошу хату.
Усё зраблю, што захачу:
І адарву, і адкручу,
Каму нагу, каму руку,
І скабы выламлю ў баку.
Я й ажаню, і разьвяду,
За дрот калючы завяду.
Калі прыедзе хто адкуль,
Шафёра п'янага за руль
Я пасаджу — каб лоб у лоб,
Інакш здарэньняў не было б.
Нядоўга жыць таму на сьвеце,
Хто на маёй жыве дыеце.
Да трох лічу і на хаду
У дамавіну ўсіх кладу.

## Юрась Нераток

АПОШНІ ПАЭТ

У яго чаравікі нямодныя,
Ён выходзіць у дождж без плашча,
Ён ня верыць, што зоркі — халодныя,
А зямля — гэта сплюшчаны шар.

Ён ня ў час да знаёмых зьяўляецца



WWW.WORLDPRESSPHOTO.COM

**Ірак. Паала Вудз (Нідэрлянды). Трэцяе месца на сусьветным конкурсе World Press Photo 2005 у катэгорыі «Галоўныя навіны».**

І заўсёды ня сьпіць дапазна,
Кожны год непрытворна зьдзіўляецца,
Калі зноўку прыходзіць вясна.

Любіць ён назіраць за стракозамі
І ня бачыць мігценьня гадоў.
Размаўляць ён умее зь бярозамі
І шкадуе бяздомных катоў.

Пастаянства ня лічыць руцінаю
І хавае пачуцьці свае.
Безнадзейна кахае адзіную,
Хоць зь юнацтва ня бачыў яе.

Ён зласьліўцам жадае найлепшага
І злачынцаў ня хоча караць.
І пакуль што ніводнага вершыка
Не стварыў… І ня будзе ствараць.

## Аўген Зубовіч

ЛАРЫСЕ ГЕНІЮШ

І ня зьнікне водгульле і песьня
Нам з табой любімай так пагоні!
Белы сьцяг з чырвоным уваскрэсьне,
Адрадзіцца словы ў Прынямоньні!

На Дзьвіне, на Прыпяці, Дняпры,
Будзе жыць нам родная ўсім мова!
І Літва ня згасьне да пары,
А ўзрадзіцца птушкай адмыслова!

Бо нас любіць Бог, вялікі край!
І сваёю справядлівай сілай
Не памкне абвергнуць у адчай,
А падорыць крылы волі мілай!

## Мікола Яўмененка

КАБ ЖА ВЕДАЎ…

Ах жа, кошачка ласкавая, ненаглядная!
Ты — галубка мая шызакрылая, складная.
Сапраўды цяжка мне безь цябе трываць спрэчную
Маску роднасьці шэрую й недарэчную.
Дзе б ні быў на сваёй эсэндэшнай прасторы я
(Запаляр'е, Урал, Крым, дзе шмат санаторыяў),
Адчуваў водар кос тваіх русых, распушчаных,
Пранікнёнасьць, пяшчоту воч ясных, апушчаных,
Урачыстасьць застольную, хмельную, модную,
Прапіваў калі мілую скрушна-самотную.
Уступіўшы цябе, маю блізкую, родную,
Думаў, справу зрабіў насамрэч благародную.
Ды ня тут-та было! Сэрцу не спадабалася.
Яно ныла спачатку, а потым схавалася.
Я блукаў па зямлі непрыглядную цінаю.
Менавіта цябе не хапала ў жыцьці маім.
Толькі ты магла ўсьмешкай, уласнай прысутнасьцю
Асьвятліць шлях жыцьця дысыдэнта па сутнасьці.
Ах, жыцьцё, ты навошта такое халоднае?!
Лёсы пар закаханых глуміш падкалоднасьцю.
Каб жа ведаў, што стрэну цябе на тым сьвеце я,
Як бы шмат да чаго спрычынілася вэрсія!

## Я.Сеніна (Сымонава)

ЛІСТ АД МАЦІ

Ах! Хадановічы, Хадкевічы, Хадыкі...
Вітаю вас, уладары-музыкі!
Не хвалюйся, любы, аб парадку —
Вечна ў сэрцы вобраз твой нашу.
Як вазьму глыбоцкую асадку,
Дык пішу, пішу, пішу…

Не крыўдуй на той стары гармонік,
Самалёт усё ж такі ляціць.
Што дарма глядзець на падаконьнік —
Па жытнёвай ніве лепш хадзіць.

Як ня будзе ў небе ні хмурынкі —
Пчолкі мёду многа прынясуць.
Па жывому ж не спраўляць памінкі,
Ды і тыя спаці не даюць.

Каб ты ведаў, мой герой-падзьвіжнік, —
Дужа цяжка рана мне ўставаць,
Бо штоноч цяпер Максім наш Кніжнік
Мне пачаў апокрыф дыктаваць.

А бывае, завітае Рэрых
І «Спаленьне цемры» дастае.
Васількоў нямала на паперах,
Толькі вочы прыгажэй твае.

І ня трэба цалаваць радзімкі —
Гэта знак вядзьмарскі, каб ты знаў.
Можа, ты і марыў пра абдымкі,
Але ж вуснаў век не цалаваў.

Хоць казаў мне Юры Хашчавацкі:
«З аднадумцам можна і ўзасос», —
Але ж хлопец ты зусім ня хвацкі —
Ну які з такога паравоз?

Хай пакуль іграе той гармонік,
Бо ня скрыпкай забіваць цьвікі.
Не хадзі ж глядзець на падаконьнік!
І ў каго ж удаўся ты такі?..

## Мікола Бельскі

***

Кажуць Яков і Елена:
— Прыбалтыйцы рускія —
Што ім мора па калена,
Ды дарога вузкая!

***

Весялімся і танцуем —
Аўтабаны мы будуем!
Да «кватэр» героям…
Прыйдуць МАЗы з гноем.

***

Селянін з кавалкам сала
На канцэрт прыйшоў у залю
Сесьці ў лёжу захацеў…
Дзе ж там — гальштук не адзеў!

## Вадзім Карцаў

ТАК!

Ты ня кажаш «Алё?», кажаш — «Так!».
Падыход такі зручны, як нельга.
Калі-небудзь спытаю: «Дык як?»
І пачую: «Так, вельмі! Так, вельмі!»

Не пачую: «Ты хто?» ці «Чаго?»,
Не пачую: «А нам яно трэба?..»
Проста «Так!» фарбай тэмбру твайго,
Не у слухаўцы ўжо, а пад небам.

***

Перадвясновая пара…
Час парадоксаў, нонсэнсаў,
Вар'яцкіх думак віхура,
Зажынкі юру бонусаў.

Каханьне там, каханьне тут
Міргае фотаўспалохам,
Зямля спружыніць, як батут —
Няёмка ў людзях голаму.

Няёмка ўсім тэстастэрон
Дэманстраваць зашкалены,
Але ж вылазіць той гармон
Дурным радком напаленым.

## Алесь Губін

***

Нахілі галаву мне долу,
Я хачу апавесьці зямлі,
Як пялёсткаў ружовыя сполахі
Аб каханьні ўздыхаць пачалі.

Аб вачох, што зоркамі зьзяюць,
Як далёкая здань з вышыні,
Мае мары табе прасьпяваюць
Надвячоркам у цішыні.

Разгані мне тугі завею,
Буду слухаць твае караблі,
Што плывуць за аблокамі з рэю,
Што ўдваіх мы з табой не вялі…

Ноч разгорне рамонкавы ложак…
Ты ня зможаш усьмешкі стрымаць,
Калі ўгледзіш, як гольчасты вожык
З кацянём у абдымку стаяць.

Намалюй на застыглых шыбах
Сваё сэрца чырвоным агнём,
Каб ня помніць зімовыя хібы
І спаткацца малінавым днём.

## Ігар Севяранін

PRÉLUDE II

Пераклад Анатоля Трафімчыка

Мае радкі — туманны сон.
Яны урэзваюцца ў памяць…
Няхай незразумелы ён,
Натхненьне лёгка ён распаліць…

О людзі, дзеці марных мар,
Ваш бог — пасада, грошы, клункі.
Не зразумець ім сну пажар —
Але адчуць яго бяз думкі.

# Нявыкрутка

апавяданьне

**КАСТУСЬ ТРАВЕНЬ**

«Мір бывае там, дзе няма ні волі, ні ўяўленьня, дзе ж гэтыя двое ёсьць, там міру не бывае, там барацьба ўяўленьняў».
*Казімер Малевіч*



Павал Усьціновіч, экспэдытар дробнай менскай фірмы, цяжка крочыў між прыватных шапікаў на Кіеўскім вакзале, моцна стомлены ад беганіны па вялікім горадзе, мноства людзей, паветра, забруджанага выкідамі легкавікоў, і летняй гарачыні.

Пах духмяных каўкаскіх страў казытаў ягоныя ноздры. Ён марыў давалачыся да кватэры на Мажайскай, зьесьці набытых памідораў з кракаўскай кілбасой і рыскім хлебам, усё гэта запіць ражанкай і заесьці мяккай маскоўскай булачкай з разынкамі. А потым адпачыць на ложку ў цішыні і абароненасьці зьнятае кватэры.

Ён выйшаў на прыпынак па Кутузаўскім праспэкце, дачакаўся пад сьпякотным сонцам аўтобуса і паехаў, паглядаючы па баках. Масква была запалоненая легкавікамі. Па Кутузаўскім праспэкце і па Мажайскай шашы ў восем палос валам упрытык імчала рака «аўдзі», «фольксвагенаў», «мэрсэдэсаў»… «Мэрсэдэсы»… «мэрсы»… «мэсэры»… «мэсэршміты»…» — дзівіўся Павал падабенству слоў.

Ён сышоў на Рабінавай, сходзіў у гастраном «Мажайскі», купіў сваю ўлюбёную ражанку, булачку з разынкамі, кракаўскай кілбасы і рыскага хлеба, які цяпер чамусьці пачаў звацца «Рыскі духмяны», і пацягнуўся да кватэры па вул.Грыцына. Адчыніў дзьверы, уставіўшы даўжэзны ключ у шчыліну дзьвярнога замка і павярнуўшы яго тройчы. У кватэры нікога не было, і ён не сьпяшаючыся памыўся, змываючы нэрвовасьць і сьпякоту дня, пераапрануўся ў спартовыя порткі, намыў і парэзаў памідоры і, прысеўшы за стол, зь сялянскай ахвотай прастага чалавека стаў вячэраць.

Мэгаполіс стаміў. Увесь час даводзілася мець справу зь незнаёмымі людзьмі, якія не прабачалі ніводнай ня тое што памылкі, а нават немачы ў характары — мяккасьці ці шчырасьці, даверлівасьці ці ляноты. Масква не дазваляла разьняволіцца, вялізны горад зразу караў за кожную недарэчнасьць.

Сёньня ён як быццам не зрабіў ніводнай хібы. Пасьпяхова разгрузіў фуру і здаў прывезены тавар. Своечасова атрымаў разлік у расейскіх грашовых адзінках. Хаця тут ён зрабіў благі крок. Зямляк з Геранён Міхась Янушка перапанаваў яго спачатку пасядзець па-братэрску ў амбасадзе, а потым яны ўдвух сходзяць у абменьнік і памяняюць грошы. Так і зрабілі. Дзякуй богу, усё абышлося.

Ён прылёг на ложак і, ужо засынаючы, пацешыў сябе думкай, што навучыцца не рабіць памылак у гэтым населеным мільёнамі людзей горадзе-мэгаполісе, дзе ўнутрывідавая барацьба абвостраная як нідзе.

Прачнуўся Павал ад бразгату ключоў у замку. У кватэру ўваходзіла сям'я каўказцаў. Ён хутка сеў на ложку, спусьціўшы ногі долу, і імгненна прыгадаў, як маўкліва фірмач Зьміцер у Менску, выпраўляючы яго ў вандроўку, прамовіў:

— Кватэру ў Маскве мы ўжо не здымаем, так што начаваньня шукай пры патрэбе ў іншым месцы.

Сказаў, а ключа не забраў. Дый зазначыў мімаходзь, без напругі. Проста мякка папярэдзіў, што прыйдзецца застацца ў Маскве на наступны дзень, ведаючы ягоную, Паўлаву, застарэлую нелюбоў да мэгаполісу. І пяцідзесяцігадовы Павал пусьціў Зьмітровы словы пра кватэру між вушэй, засяродзіўшы ўвагу на неабходнасьці застацца яшчэ на дзень у небясьпечным горадзе.

Мажная маладая жанчына ў каляровай кофце і доўгай чорнай спадніцы, чорнавалосая і чарнавокая, трымала за руку маленькую дзяўчынку. Побач стаяў дзесяцігадовы чорнагаловы хлопчык і насьцярожана ўглядаўся ў кватэрную цемру. Убачыўшы Паўла, яна зрабіла крок назад да дзьвярэй і спалохана прамовіла:

— Вах, хто вы? Што вы тут робіце?

Павал спакойна, але ня трацячы тэмпу, усьміхнуўшыся, зрабіў асьцярожны крок у напрамку кабеты і сказаў:

— Прабачце, мы паўгоду здымалі гэтую кватэру. А наш кіраўнік зь Менску паслаў мяне ў камандзіроўку і не папярэдзіў, што тут іншыя жыхары. Мабыць, вы новыя кватэранаймальнікі?

Дзесяцігадовы хлопчык хутка рушыў у другі пакой. Жанчына нешта сказала яму ўсьлед па-каўкаску. Потым яна насьцярожана запытала Паўла:

— Як вы сюды трапілі? Адкуль у вас ключ?

Жанчына прыпынілася ў дзьвярах, трымаючы дзяўчынку за руку, яна выпрамяняла насьцярогу і падазронасьць.

Ці ведаеш, дружа, найгоршую нашу хібу? У Маскве ёсьць усе мафіі: грузінская, сібірская, казанская, армянская, асэтынская, уральская, прыбалтыйская, габрэйская… і ня толькі мафіі, але і іхнія лабісты. Няма толькі беларускага кодла.

— Разумеюце, мы здымалі раней кватэру і ў мяне застаўся ключ, а наш фірмач Зьміцер мяне не папярэдзіў. Вы прабачце, ня бойцеся, заходзьце ў кватэру, я вам усё спакойна растлумачу.

Павал цяпер дзейнічаў узважана і ветліва, нічым не выказваючы неспакою. Між тым абставіны складаліся вельмі кепска. Калі суседзі ўчуюць канфлікт і выклічуць міліцыю, можна лёгка апынуцца за кратамі — з 9500 амэрыканскімі далярамі ў кішэні. А даляры для тамтэйшых міліцыянтаў — як тлусты карась для згаладнелага шчупака…

З другога пакою хутка выйшаў хлопчык і, абмяняўшыся позіркамі з маці, нешта супакоена сказаў. Павал зразумеў сэнс сказаных па-каўкаску слоў і ў сваю чаргу дадаў:

— Праходзьце, калі ласка, у кватэру. Ня бойцеся, я ня злодзей, я камэрсант зь Менску.

Жанчына зрабіла маленькі крок зь дзьвярнога праёму ў кватэру. Хлопчык выйшаў уперад маці і, паглядаючы ўсутыч на Паўла чарнавокім насьцярожаным позіркам, запытаў:

— Как ты сюда папал?

— Разумееш, мы гэтую кватэру здымаем з паўгоду. Апошнім разам наш начальнік не папярэдзіў, што тут іншыя жыхары. Акрамя таго, тут застаўся наш тэлефон. Таму я і зайшоў па старой памяці на кватэру.

— Так, харашо. Аткуда ў тэбя ключ? — Хлопчык ня зводзіў з Паўла чарнавокага позірку і выпрамяняў непераможную перакананасьць дарослага мужчыны.

— Паколькі раз у месяц мы прыяжджаем па тавар у Маскву, то ў мяне заўсёды ёсьць гэты ключ, бо раней мы здымалі гэтую кватэру. Прабачце, вядома, мне. Можа, вы пройдзеце ў пакой, а то неяк няёмка перад суседзямі?..

Апошнія словы Павал прамовіў, зьвяртаючыся да жанчыны. Хлопчык у адказ рушыў да тэлефона. Жанчына зь дзяўчынкай гадоў пяці зрабіла яшчэ крок наперад і прычыніла дзьверы, але не да канца. Павал сеў на ложак. Каўкаскі хлопчык узяў слухаўку і зноўку запытаў:

— Харашо. Скажі, как ты сюда папал?

Слухаючы Паўлаў адказ, падлетак набіраў нумар. Павал хутка думаў, што рабіць далей? Можна было, аддаўшы ключ каўкаскай сям'і, проста пайсьці з кватэры. Гэта было лёгкае выйсьце, якое магло яго ідэнтыфікаваць як злодзея. А калі жанчына пачне лямантаваць? Калі хлопчык пабяжыць за ім з крыкам «Трымайце злодзея!»? Перш ы ж мент арыштуе. А маскоўская міліцыя — гэта машына, ланцуг, канвэер. Вінаваты, невінаваты — сядзі за кратамі і ня рыпайся, не перашкаджай працаваць сьледчым.

Нумар, па якім тэлефанаваў каўкаскі хлопчык, быў заняты, і ён, выслухаўшы Паўлаў адказ, чарговы раз пачаў яго набіраць, ізноў запытаўшы:

— Ты скажі, аткуда ў тэбя ключ?

Павал адказваў і сам прапрацоўваў варыянты. Калі прыедзе гаспадар — каўказец зь сябрамі — і выверне ягоныя кішэні, то гэта ня самае лепшае выйсьце. Могуць балюча набіць твар… адным словам, лепш пазьбегнуць сустрэчы.

Нарэшце хлопчык дазваніўся. Ён гаварыў, слухаў, потым зноў адказваў, мабыць, на пытаньні. Нарэшце працягнуў слухаўку Паўлу, сказаўшы, што бацька хоча зь ім пагаварыць.

— Добры дзень, — прывітаўся ў слухаўку Павал.

— Как ты папал в чужой квартір? — учуў ён каляны мужчынскі голас без усялякіх сантымэнтаў. Павал у каторы раз растлумачыў.

— Харашо, аткуда ў тебя ключ?

Усьціновіч цярпліва паўтарыў пра ключ.

— Харашо. Жды мэня, нікуда нэ ходы. Я скора прыеду. Обязатэльно жды.

Павал паклаў слухаўку і з прыкрасьцю сядзеў нерухома з хвіліну. Потым сказаў каўкаскай маладой жанчыне, спакойна і ветліва зазначыўшы:

— Ужо вечарэе. А мне яшчэ невядома дзе начаваць. З вашага дазволу я патэлефаную знаёмым.

Ён патэлефанаваў Гладышкевічу, той сказаў, што ў яго сваякі з Новасібірску і ён ня можа прыняць Паўла. Прыйшлося, узяўшы ў яго нумар тэлефона, патэлефанаваць Міхасю Янушку, супрацоўніку беларускай амбасады ў Маскве. Той сказаў яму адрас і растлумачыў як даехаць. Павал пісаў у нататнік усё, што дыктаваў яму па тэлефоне Янушка. Ён паклаў слухаўку, ужо амаль супакоены. Яму трэба сысьці з гэтай кватэры на працягу дзесяці хвілін.

— Прабачце, мне трэба ехаць, — сказаў ён, зьвяртаючыся да жанчыны, лагодна маючы яе мажную паставу ласкавым позіркам цывілізаванага мужчыны. — Я сабе пакіну ключ, бо наш тэлефон прапаў. Няхай гаспадар кватэры верне апарат.

— Нэт, ключ аддай, — насьцярожыліся каўкаскі хлопчык і жанчына. Павал яшчэ для выгляду паўпарціўся і як бы нехаця аддаў ключ жанчыне. Хутка перапрануўся, склаў рэчы ў кайстру, разьвітаўся і, зірнуўшы яшчэ раз на адважнага каўкаскага хлопчыка з насьцярожаным чарнавокім позіркам дарослага, пайшоў з кватэры.

Трэба было ехаць да станцыі мэтро «Кунцава» ці да «Кіеўскай», потым, дабраўшыся па Кальцавой лініі да «Барыкаднай», перайсьці на станцыю «Чырванапрэсьненскую» і адтуль праехаць тры прыпынкі да «Паляжаеўскай». Калі ён дабраўся, было ўжо цёмна. На прылеглых вуліцах стаяў густы прыцемак, у якім хутка рухаліся постаці-здані. Павал дзякуючы запісам хутка знайшоў патрэбны дом, а потым і кватэру.

Янушка сустрэў яго ў дзьвярах як добры знаёмы, запрасіў павячэраць, яны выпілі па кубачку зялёнай гарбаты. Паслухаўшы Паўлаву гісторыю, ён зьдзіўлена пахітаў галавой:

— Пашанцавала табе, дружа, і моцна.

Больш ён нічога не тлумачыў. Гэта было меркаваньне месьціча, былога раёнага пракурора, што даўно жыў у Маскве і ведаў тутэйшыя варункі.

Пасьля другога кубачка гарбаты Міхась спакойна прамовіў.

— Ці ведаеш, дружа, найгоршую нашу хібу? У Маскве ёсьць усе мафіі: грузінская, сібірская, казанская, армянская, асэтынская, уральская, прыбалтыйская, габрэйская… і ня толькі мафіі, але і іхнія лабісты. Няма толькі беларускага кодла. Мы безабаронныя. Надышоў новы час, зь іншымі людзьмі, новымі дачыненьнямі. А мы ўсё са сваёй памяркоўнасьцю… Дарэчы, ты зьвярнуў увагу, як апанавалі каўкаскія прадпрымальнікі памяшканьні нашай амбасады?

**Працяг на старонцы 20.**

# Нявыкрутка

Працяг са старонкі 19.

Гэта ж трэба — здаць свабодныя пакоі ня нашым беларускім прадпрымальнікам пад офісы, а паўднёвым людзям. Даляры, брат, перамаглі і танкавыя арміі, і ваенна-паветраныя сілы, і стратэгічныя войскі.

І ў гэтых спакойна выказаных словах Павал учуў тую прыхаваную маркоту, якую выказваюць людзі хваравітыя, можа, нават перанёсшыя інфаркт і таму вымушаныя сьцерагчыся адмоўных перажываньняў**.**

Яны яшчэ крыху пагаманілі — сівыя, раптам нечакана пастарэлыя мужыкі, што страцілі падмурак і сэнс у жыцьці, і апоўначы разышліся па пакоях на адпачынак. Павал, кладучыся спаць на канапцы ў гасьцёўні, даў сабе слова больш не рабіць памылак у гэтым хцівым мэгаполісе…

Наступным днём, загрузіўшы фуру таварам, ён доўга і старанна афармляў таварна-транспартныя дакумэнты, накладныя, дамовы, зьбіраў сэртыфікаты, ліцэнзіі, дазволы і пад самы вечар выехаў у Менск. Па дарозе заскочыў на Варшаўскі рынак, набыў кракаўскай кілбасы, памідораў, некалькі бляшанак шпротаў і сардзін, а таксама сваю ўлюбёную ражанку і рыскага хлеба, які з гэтага дня пачаў звацца «Духмяны». Увечары яны выехалі за МКАД, і толькі тады Павал уздыхнуў на поўныя грудзі, зьбіраючыся са смакам павячэраць:

— Ну, дзякуй богу, едзем дадому.

Маркотны і маўклівы, са шкіперскай барадкай, кіроўца Анатоль змрочна зазначыў:

— Не кажы «гоп». Яшчэ ўперадзе вагі каля Гагарына. Могуць секануць на сотню баксаў за перагруз пярэдняй восі.

Потым запаліў чарговую цыгарэту і паярэдзіў:

— Я плаціць за перагруз ня буду.

Усьціновіч згас — трэба было зноў напружвацца ды браць адказнасьць на сябе. Па прыродзе Павал быў чалавек вясёлы, добразычлівы ды адкрыты і не любіў змрочных дундукоў.

— Ня дзьмі ў брэдзень, дружа. Трэба праслізнуць цішком.

Ён ужо наперад ведаў, што зараз Анатоль пачне прасаваць яго, вымагаючы нейкай матэрыяльнай прыплаты за будучыя дадатковыя намаганьні. Таму да самага Гагарына напружана маўчаў, цярпліва пераносячы ўсе складанасьці руху па зямлі некалі сваёй Радзімы. Толькі заплаціўшы на вагах пяцьдзясят даляраў хабару, ён нарэшце маўкліва павячэраў.

Наступным днём МАЗ прыехаў у Менск. Кіроўца паставіў фуру пад разгрузку на склад у Шабанах і паехаў дадому. А Павал застаўся здаваць прывезены тавар і накладныя, ліцэнзіі і сэртыфікаты. Толькі пад вечар, забраўшы кайстру, пацягнуўся да прыпынку…

Дома, у двухпакаёвай кватэрцы, на першым паверсе блёчнай пяціпавярхоўкі, былі госьці. Сястра Ніна прыехала з Чавусаў з 16-гадовым сынам Валерыкам і прыпынілася ў іх на некалькі дзён. Убачыўшы Паўла, яна радасна зашчабятала, вывальваючы ўсе свае местачковыя пачуцьці і думкі.

— Прывітаньне, Павал! Як там Масква? Якія вы шчасьлівыя, што пераехалі ў сталіцу. Мне тут так падабаецца!..

Павал цяжка паклаў кайстру ў кут, прывітаўся і рушыў у ванну мыць твар і рукі. Перапрануўшыся, вярнуўся да госьці ў залю, што адначасова была іхняй з жонкай спальняй. У меншым пакоі тулілася малодшая дачка Юля з мужам Арцёмам і ўнукам Казімерам.

Ён піў гарбату і моўчкі стомлена слухаў Ніну.

— А ў нас жа ў Чавусах рабіць няма дзе. Беспрацоўе. А начальнікі пашалелі, прымушаюць усім прадпрыемствам падмятаць ды прыбіраць тэрыторыю гораду. А калі не падабаецца, дык зразу і кажуць: «Нікога не трымаем. Хто ня хоча, дык звальняйся». І без усялякага пераходу яна зразу выдала мэту свайго прыезду.

— Прабач мне, Паўлік, я да цябе з просьбай. Хочам купіць сучасны кампутар сыну. Каб не цягаўся па завугольлях. Дак грошай, сам ведаеш, дзе ў тых Чавусах заробіш. Пазыч, калі ласка.

— Колькі? — ледзь стрымліваючыся, прамовіў Павал, якога гэтая сумесь тупасьці і лухтавацкасьці пачынала нэрваваць. Інфантыльны пляменьнік з доўгімі валасамі, бляшкай у падбародзьдзі і жалезнай заколкай у вуху індыфэрэнтна сядзеў на канапцы ў падрапаных неахайных джынсах.

— Хацела б, каб даляраў 700, ну, хоць бы 500. Сучасны кампутар, кажуць, можна купіць за гэткую суму.

— Навошта яму сучасны? Можна бэвэшны.

— Ну ты ж ведаеш, цяпер модна ў Інтэрнэт выйсьці, туды-сюды.

— А болт у барадзе навошта?

— Ну, Паўлік, ты ж павінен разумець. Зусім яшчэ дзіцё. Гэта ж модна.

Павал, сталы мужык сярэдняга росту зь сівой галавой і хранічна шэрым тварам хворага на ішэмію чалавека, змрочна сказаў:

— Як толькі сюрык пачынае рваць гузікі на шырынцы, то ўжо не дзіцё, а мужык…

— Усё, усё, ня трэба. Ня трэба… Ня хочаш даць, то так і кажы. А вучыць ня трэба. Самі не дурныя…

Павал індыфэрэнтна дадаў:

— Параіцца трэба з гаспадыняй. Можа, што і знойдзем…

Ён не пасьпеў скончыць думку.

— Алёна згодна! Яна прызналася, што грошы ёсьцека і яна ня супраць. Дзякуй, Паўлік. Дзякуй, я, па праўдзе, не чакала. Помню, тата заўсёды казаў, што, прабач, што Паўлік наш прыжымісты. Дзякуй, дзякуй…

Сястра Ніна прыклала хустачку да вачэй і ўсхліпнула. Павал коса зірнуў на жонку, што сядзела за сталом зь вінаватым выглядам.

— Эт, шустрая, як венік. Ня ведаю, што табе Алёна растлумачыла, а я скажу, што калі і пазычу, то ня больш чым 50 даляраў.

Ніна вылупіла вочы ад нечаканасьці, сьлёзы імгненна высахлі.

— Ты што, здурнеў, Павал? Які ж кампутар за 50 даляраў? А дзе ж я астатнія знайду? Ты так не жартуй. Мне падачкі твае не патрэбны. Алёна казала, што можаце пазычыць, што грошы маеце. А я аддам. Не хвалюйся, назьбіраю і пад Новы год аддам.

Павал падняўся і, не ўступаючы ў спрэчку (жонка цішком зрабіла знак сястры, каб тая памаўчала), апрануў унука Казіка і пайшоў на прамэнад, пакінуўшы жанчын разьбірацца са складанасьцямі жыцьця.

Не дзеля таго ён ірваў вантробы ў камандзіроўках, каб марнаваць грошы на цацкі для ёлупаў. «І калі ўжо вас жыцьцё навучыць? Як вы зьбіраецеся выжываць? Усё роўна ж рана ці позна прыйдзе драпежны прыватны капітал. Навошта табе той Інтэрнэт? Лепш выдаткуй грошы сыну на рэпэтытара па матэматыцы. Зарабі і выдаткуй…»

Сам Павал зьбіраў грошы на першы ўзнос для дачнай кватэры. Марнеў над кожнай тысячай рублёў, еў усухамяць у камандзіроўках, тыднямі начаваў у кабінах МАЗаў, зімой мёрз, летам душыўся ад сьпякоты. Апрануў, што засталося ад савецкіх часоў.

Двухгадовы ўнук бегаў па дзіцячай пляцоўцы. Павал пагушкаў яго на арэлях. Ізноў бегучы па сьцежцы, унучак зачапіўся за корань дрэва і балюча саўгануўся аб глебу. Казік крывіўся, пазіраў на дзеда, але яшчэ ня плакаў.

— Ну што ты разьлёгся, Казік? Падымайся, гэта табе ня ложак. Ты мужчына. Ты дужы. Ты ня будзеш плакаць…

Маленькі русавалосы хлопчык паслухмяна падняўся і пабег далей, сьмешна паўтараючы дзедавы словы:

— Падымася… ня лозяк… музік… падымася Каська… падымася…

Павал, прысеўшы на лаву, стрымана і цяжка пазіраў на зялёнае наваколле. Быў той цёплы жнівеньскі вечар, калі яшчэ буяла лета, але незнаёмае, з новай аўрай, і таму чужое. І рэдкія жоўтыя лісты ў зялёных кронах ліп сьведчылі аб немінучасьці восеньскіх халадоў, доўгіх вечароў з самотнымі дажджамі, лістападаўскай адзінотай і памяцьцю аб маладым шчасьці, што некалі мільгнула імклівай ластаўкай у жыцьці.

*27.05.2004*

# Сучасьнікі

АДАМ ГЛЁБУС



## 2005. Бэндукідзэ і Ленін

Ёсьць у мяне сяброўка Таня. У мяне некалькі сябровак Тацян, таму я ўдакладняю: гаворка пойдзе пра мікрабіёляга Таню Івашыну. Жыве Таня ў падмаскоўным Пушчыне і працуе ў навукова-дасьледчым інстытуце. Як і ўсе цяперашнія расейскія вучоныя, Таня вядзе паўжабрацкае арыстакратычнае жыцьцё. Калі ёй робіцца зусім кепска, яна тэлефануе свайму былому асыпіранту Бэндукідзэ. Таму Бэндукідзэ, які зрабіўся самым тоўстым алігархам у Расеі. Калі па тэлеку паказваюць расейскіх алігархаў, яго лёгка пазнаць, бо ён самы тоўсты і самы лысы. Каха Бэндукідзэ яшчэ і добры, але пра гэта ў тэлеку не гавораць. Калі памірае вучоны ў Пушчыне, Таня знаходзіць Каху. Ён дае грошы на пахаваньне. Аднойчы Каха абурыўся, што Тацяна звоніць толькі з нагоды чыйсьці сьмерці, і прапанаваў ёй выбраць падарунак сабе любімай. На Кахавы грошы Танька ўставіла навенькія зубкі. Цяпер у Тані галівудзкая ўсьмешка, а Каха — міністар фінансаў у роднай Грузіі. А дзе ж Ленін? Будзе і Ленін, але спачатку я раскажу пра мультыплікатара Ленкіна. Ён адзін з найлепшых мультыкаробаў у Беларусі. Ён і майго брата Мірыка вучыў рабіць флэшкі. Яны разам змастачылі тры сэрыі пра Пацука-людажэра. Дык гэты Ленкін у мінулую суботу напіўся. А напіўся, бо расейскі прэз. Пуцін заказаў рабіць 100 рускіх мульцікаў у год. Прэз. і грошы выдаткаваў: 8000 баксаў за хвіліну гатовага мультфільму. Прад'юсэры выпырхнулі з маскоўскіх кінагнёздаў шукаць выканаўцаў прэзавай замовы. У Менск прыляцеў прад'юсар Хабенскі, ну той Косьцік Хабенскі, які раней артыстам быў і сыграў піцерскага мянта, у якога амэрыканская нэгрырабаўнікі ўсе грошы пазабіралі. Выразны эпізод, праўдзівы: да рускіх мянтоў падыходзяць амэрыканскія мурыны і забіраюць даляры! Мне вельмі спадабаўся эпізод, і Косьцік артыст выдатны. Таму, калі Хабенскі зь Ленкіным спыталі ў Мірыка: «Дзе можна спакойна выпіць і пасядзець-пагаварыць?» — брат мой завёў іх у кавярню «Лёндан», на другі паўсакрэтны паверх. Выпілі яны, пра кіно загаварылі. Мірык сказаў, што і мы сюжэты для кіно робім і прадаём. Хабенскі скрывіўся: маўляў, сюжэты нічога не каштуюць, і прапанаваў Мірыку расказаць такі сюжэт, які мог бы яго зьдзівіць. Ну Мірык і пераказаў зьмест адной з апошнік кніжак нашага віртуальнага дэтэктыўшчыка Андрэя Мікалаевіча Вароніна. «На Краснай плошчы, у маўзалеі, Ленін несапраўдны!» «Як гэта несапраўдны Ленін?» — глынуў каньяку Хабенскі. «А так… Каха Бэндукідзэ — алігарх і мэцэнат — набыў у падмаскоўным Пушчыне кавалак зямлі, каб пабудаваць дом адпачынку для сваіх былых калег — хімікаў. Каха — сапраўдны хімік. Шмат хто думае, што Бэндукідзэ — гаўно чалавек, а ён — хімік, мікрабіёляг і добрай душы таўстун. Будаўнікі на Кахавым участку знайшлі магілу, а ў ёй, як высьветлілася, быў пахаваны сапраўдны Ўльянаў (Ленін), які памёр у 1952 годзе, а не ў 1924, як усе думалі…» — «Сюжэт! — узрадаваўся Хабенскі. — Такі сюжэт можна амэрыканцам загнаць!» — «Загані!» — прапанаваў яму Мірык. — «Толькі мы яго ўжо загналі расейцам у форме кнігі Андрэя Вароніна. Расею Ленін усё яшчэ хвалюе, а вось Амэрыку наўрад…» Такі сюжэт выйшаў у мяне зь Бэндукідзэ і Леніным, толькі майго раманнага Бендукідзэ завуць ня Каха, а Галактыён.

*21.02.2005, 13:23*

# Знакі прыпынку



УЛАДЗІМЕР НЯКЛЯЕЎ

* * *

Расьліна, здабываючы энэргію, сілкуецца сокамі, жывёліна — расьлінай, чалавек — жывёлінай, і ў гэтым ланцужку чалавек — не абавязкова апошняе зьвяно. Для чаго існуюць і заечая капуста, і заяц?.. Ні для чога, калі іх ня зьесьці… Тое самае і чалавек, пра якога Кастанэда прыдумаў, што ён проста харч.

Чалавек для таго, каб ягонай энэргіяй сілкаваўся паралельны сьвет, населены флаерсамі, летунамі. Кастанэда кажа, што яны валодаюць нашай сьвядомасьцю, *ажыцьцяўляюць* нас і кормяцца нашай энэргіяй — дэфіцытам і далікатэсам ва ўсім космасе.

Каб флаерсы цябе ня жэрлі, трэба стаць *нясмачным.* Кастанэда ня кажа *як*, але выходзіць, што дастаткова *быць самім сабой* — і цябе не зжаруць.

Кожны, хто не баіцца, дазваляе сабе быць самім сабой — нясмачны…

Флаерсаў, мусіць, зжырае нехта яшчэ, а тых яшчэ нехта… і ўсё, што ёсьць, было і будзе — адзін няспынны сусьветны жор.

Як даказаць, што гэта не трызьненьне?.. Ніяк. Бо, дапусцім, ты бачыў сон, у якім цябе пажыраў флаерс… Як ты дакажаш некаму, што бачыў такі сон?.. Ніяк. Але сон такі ты бачыў.

* * *

Амэрыканцы пасьля Аўганістану зьбіраюцца бамбіць Ірак… Тэрарызм тэрарызмам, але: «Цар усяго — варожасьць», — сьцьвярджаў Гэракліт.

А ў вядомым афарызьме Кляўзэвіца пра вайну як працяг палітыкі Мішэль Фуко даўно ўжо зрабіў інвэрсію: «Палітыка — працяг вайны іншымі сродкамі».

* * *

Шмат хто думае, што пасьля таго, як памрэ і ўваскрэсьне, тады і зажыве па-сапраўднаму, і будзе самім сабой…

# Першы блін Рабаканя

12 ліпеня менскае «Дынама» праводзіла першы матч кваліфікацыйнага раўнду Лігі чэмпіёнаў. Нічыя на сваім полі. 20 ліпеня камандам гуляць паўторны паядынак, але ў кіпрыётаў няма сумневаў, хто пройдзе ў наступны этап. Піша **Алег Раявец**.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

### Дынамаўскія ракіроўкі

Да залатых мэдалёў першынства Беларусі і, як вынік, пуцёўкі ў кваліфікацыю Лігі чэмпіёнаў менчукоў прывёў гуляючы трэнэр Юры Шуканаў. Пасьля заканчэньня чэмпіянату-2004 ён вырашыў павесіць буцы на цьвік і сканцэнтравацца на трэнэрскай працы.

Але ў сярэдзіне траўня старшыня праўленьня «Дынама», блізкі да Лукашэнкі бізнэсовец Юры Чыж адправіў трэнэра ў адстаўку. Маўляў, каманда правеліла пачатак чэмпіянату. На форуме неафіцыйнага сайту клюбу — «Дзявятцы» — грамадзкасьць выказвалася не на карысьць Чыжа. Сэнс выказваньняў зводзіўся да таго, што дзякуючы Шуканаву каманда пасьля сямі гадоў урэшце трапіла ў Лігу чэмпіёнаў, а яго як кацяня выкідваюць з клюбу. Але з галоўным спонсарам не спрачаюцца.

Наступны трэнэр — Аляксандар Башмакоў — пратрымаўся толькі шэсьць з паловай тыдняў. І вось ужо 2 ліпеня ў «Дынама» зьявіўся новы коўч — украінскі спэцыяліст Аляксандар Рабаконь, які летась трэніраваў «Абалонь». Мяняць коней за паўтара тыдня да старту ў Лізе чэмпіёнаў — рэч рызыкоўная.

### Уцекачы з Фамагусты

Лёсаваньне выбрала менчукам у супернікі па першым раўндзе заснаваны ў 1911 г. кіпрскі «Анартосіс» з Фамагусты. Гэта клюб-бежанец. У 1970-я краіну напаткала грамадзянская вайна. Туркі, што складаюць меншасьць на востраве, абвясьцілі Незалежную Рэспубліку Паўночны Кіпр. Дэмаркацыйная лінія падзяліла краіну на дзьве часткі, і Фамагуста (па-турэцку — Газімагуса) апынулася на турэцкім баку. Каманда пераехала ў грэцкую Ларнаку, міжнародныя матчы праводзячы ў сталіцы востраву Нікосіі, таксама, дарэчы, падзеленай зялёнай лініяй на дзьве часткі — турэцкую і грэцкую.

Летась за 12-разовага чэмпіёна праваслаўнага Кіпру гуляла немалая грузінская дыяспара — у клюбе засталіся толькі Кліменці Цітаішвілі, Георгі Кінкладзэ ды гуляючы трэнэр, экс-паўабаронца зборнай Грузіі Цімур Кецбая. Сёлета да іх далучыўся Гоча Джамараўлі.

### 3803 гледачы

Што засмуціла — невялікая колькасьць беларускіх заўзятараў. Сайт «Беларускі футбол» зафіксаваў пасьля матчу лічбу ў 3803 гледачы, «Спартовая панарама» падала лічбу 2000. Амаль як на матчах чэмпіянату Беларусі. Мажліва, сыграла ролю жывая трансьляцыя па АНТ і анансаваны пад вечар лівень, што абрынуўся на Менск за паўгадзіны да матчу.

Уладкаваўся я ў лёжы «Б» і, нібы танк у ірацкай пустэльні, стаў круціць у розныя бакі галавой — шукаць знаёмыя твары. Вось важна прадэфілявалі журналісты Юры Бушлякоў і Алег Дашкевіч. Ззаду разьмясьціліся экс-трэнэр «Дынама» Юры Шуканаў і трэнэр МТЗ-РІПА Юры Пунтус. Праз дзень «трактарыстам» гуляць у Вугоршчыне матч з «Фэрэнцварашам». Побач уладкаваўся, паводле чутак, трэнэр італьянскага клюбу сэрыі «В»: чырвоныя джынсавыя штаны, чаравікі на босую нагу, прычоска а-ля П'ерлюіджы Каліна. Кажуць, што ён прыляцеў разам з тэлевізійнікамі з Апэнінаў, якія пачалі падрыхтоўку да матчу нацыянальных зборных Беларусь—Італія.

Калі «Дынама» забіла мяч, ён падляцеў да прэс-аташэ клюбу Сяргея Аляхновіча, заключыў яго ў абдымкі ды пачаў радасна віншаваць. Карацей, пры даволі сумнай гульні ў першым тайме суседзі заснуць не давалі. Сусед справа ад мяне пасярод тайму дастаў мабільнік і загадкава спытаў кагосьці на тым канцы дроту: «Куды падзелі мэгафон?»

Праз некалькі хвілін пасьля пачатку матчу перад маім носам, у глядацкім шэрагу, зьявіўся шыракаплечы коратка пастрыжаны мужчына і, махаючы перад вачыма падпалкоўніка міліцыі білетам, папрасіў таго «ачысьціць» месца. Падпалкоўнік выбачыўся і ціхенька даў лататы.

### Сола Кецбаі

«Дынама» атрымала някепскі шанец ужо на першай хвіліне першага тайму. Цімур Кецбая выдаў ювэлірны пас… чэскаму легіянэру менчукоў Давіду Зоўбэку, але той прабіў вышэй кіпрскай брамы. Праўда, Кецбая хутка выправіўся і стаў «нахабна» тузаць дынамаўскія шэрагі. Так што можна сьмела ставіць пад сумнеў народную мудрасьць, што стары конь баразны не псуе, а кладзецца ў яе і сьпіць. Грузінскі трэнэр быў самым заўважным на полі ў гасьцей.

У сярэдзіне тайму атрымаў траўму Андрэй Разін, і трэнэрскі штаб замяніў яго на 19-гадовага Леаніда Ковеля. Але хлопец ня толькі не сапсаваў гульні, а і пачаў штурмаваць абаронча рэдуты кіпрыётаў. Вось толькі бракавала нармальнага завяршэньня камбінацый — і яму, і ягоным калегам.

Пры канцы тайму пацьвердзілася старое як сьвет правіла: не забіваеш ты — прывязуць мяч табе. Бразыльскі легіянэр «Дынама» Эду ўпусьціў верны шанец пасьля падачы Ковеля — і праз дзьве хвіліны менчукі, нібы велізарную рыбіну, выцягвалі мяч з уласнае сеткі. Кіпрыёты традыцыйна навесілі мяч у штрафную, але Зьміцер Лянцэвіч прамахнуўся па мячы, і той апынуўся ў Нікалаюса Фрусаса. Фрусас ня схібіў і адправіў мяч у правы ад Артура Ляська кут. Гэта быў, бадай, адзіны ўдар кіпрыётаў па беларускіх варотах за ўвесь матч. Аднак ад гэтага не лягчэй.

Шуканаў сядзеў змрочны, як мрук.

### Адсутнасьць фарту

Куды цікавей беларусы выглядалі ў другім тайме. Урэшце на 58-й хвіліне выправіўся Лянцэвіч. Віталь Валадзянкоў навесіў у штрафную, мяч зачапіў паўабаронцу Нікаса Нікалаў і, зьмяніўшы траекторыю, прызямліўся на галаву Лянцэвічу. Гэтым разам Зьміцер згуляў бездакорна — 1:1. Трыбуны ўзарваліся апладысмэнтамі. А праз хвіліну стадыён яшчэ раз расшчодрыўся на апладысмэнты. На поле выйшла легенда беларускага футболу 1990-х — Пётар Качура. 33-гадовы вэтэран, імем якога названы клюб беларускіх бамбардзіраў, вярнуўся ў каманду пасьля доўгіх гадоў падарожжаў па розных краінах.

Верылася, што беларусы заб'юць яшчэ. Але прамахваліся Валадзянкоў, Ковель, Эду.

### Паліглёт Кецбая

Шумныя карэспандэнты з Кіпру сьвяткаваць перамогу пачалі яшчэ пры канцы гульні. У іх нават сумневаў няма, што «Анартосіс» выйдзе ў другі раўнд, дзе згуляе з турэцкім «Трабзанспорам». Беларусам, каб трапіць у наступны этап, трэба альбо перамагаць 20 ліпеня ў гасьцях, альбо гуляць нічыю зь лікам 2:2, 3:3.

На прэс-канфэрэнцыі Кецбая прамаўляў па-расейску, а потым для кіпрыётаў перакладаў пагрэцку і ангельску. «Нашы шанцы ў матчы ў адказ прыкладна 60 на 40. Пры гэтым я спадзяюся, што ў Нікосіі ў нас будзе падтрымка 10—15 тыс. гледачоў», — рэзюмаваў грузінскі спэцыяліст.

А Рабаконь зрабіў рэвэранс у бок супернікаў: «Нам супрацьстаяла добрая, тэхнічная каманда». І ўказаў на недахопы свайго клюбу: пры вялікай колькасьці момантаў не хапіла майстэрства. Мудра схоплена.

## СПОРТ СЬЦІСЛА

### Посьпехі Карстэн

Двухразовая алімпійская чэмпіёнка Кацярына Карстэн трэці раз у гэтым годзе першынствавала на этапах Кубку сьвету па акадэмічным веславаньні. Сёлета яна ўжо перамагала на этапах у Ітане (Вялікабрытанія) і нямецкім Мюнхэне, а гэтым разам была першай на заключных спаборніцтвах у швайцарскім Люцэрне.

### Азіяцкі бар'ер

Майстар «малой» ракеткі Ўладзімер Самсонаў на мінулым тыдні дайшоў да паўфіналу Адкрытага чэмпіянату ЗША па настольным тэнісе. На шляху да адной другой фіналу беларус перамог амэрыканца Барні Рыда, швэдаў Робэрта Свэнсана і Енса Люндквіста, а таксама немца Торбэна Возіка. У фінал яго не пусьціў прадстаўнік Паўднёвай Карэі Сань Юн Оху, які потым і выйграў «US Open». Наступны супэр турнір у Самсонава — Адкрыты чэмпіянат Кітаю (8—11 верасьня).

### Рамашчанку праапэравалі

Паўабаронцу беларускай нацыянальнай зборнай і ФК «Дынама» (Масква) Максіму Рамашчанку зрабілі апэрацыю ў Нямеччыне.

Макс у траўні ў матчы чэмпіянату Расеі атрымаў траўму калена і выбыў, як прагназуюць спэцыялісты, на шэсьць месяцаў. Беларускі футбаліст прапусьціць матчы нацыянальнай дружыны з Італіяй, Нарвэгіяй, Шатляндыяй.

### Беразоўскі хоча забраць «Чэлсі»

Расейскі алігарх мае намер забраць у Рамана Абрамовіча футбольны клюб «Чэлсі». Гэта адбудзецца, калі Беразоўскі выйграе ў брытанскім судзе пазоў да губэрнатара Чукоткі на 7,5 млрд даляраў, узяўшы «сініх» як частку кампэнсацыі. Сутнасьць пазову ў тым, што, паводле слоў Беразоўскага, Абрамовіч аказваў на яго націск, дабіваючыся згоды на продаж акцый ОРТ, «Сібнафты» і алюмініевай кампаніі «Русал» па цане, ніжэйшай за рынкавую.

«У Абрамовіча шмат актываў за мяжой, — кажа Беразоўскі. — Ёсьць «Millhouse Capital», клюб «Челсі». Я хварэю за «Чэлсі». І калі няма іншых спосабаў выплаціць кампэнсацыю, хай гэта будзе лёнданскі клюб».

### Грузінскі волат

59-гадовы прафэсар Тбіліскага тэхнічнага ўнівэрсытэту Гэнры Купрашвілі мае намер пераплыць Басфорскі праліў у старажытна-грузінскім стылі «калхуры» — са зьвязанымі ў чатырох месцах рукамі і нагамі. Разам з Купрашвілі ў Турцыю паедзе жонка. Тры гады таму яна дапамагала мужу рыхтавацца да пераплываньня ў падобным стылі праз Дарданэллы. 12-кілямэтровы праліў Купрашвілі пераплыў за 3 гадзіны і 15 хвілін. У плянах — пакарэньне Ля-Маншу.

**AP; belta.by, sport-express.ru**

ІНФАРМАТАР

# Кампутарныя клюбы Менску



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**«Айчына»**
вул.Лазо, 14
201–27–78, 201–27–79
**«Актагон»**
вул.Сьвярдлова, 4
209–23–28
**«Армагедон-1»**
пр.Ф.Скарыны, 25
206–66–19
**«Армагедон-2»**
пр.Ракасоўскага, 142а
**«Армагедон-3»**
вул.Любімава, 6
**«Атава»**
вул.А.Кашавога, 12
230–58–10, 230–14–58
**«Атлянтыс»**
вул.Прытыцкага, 144
258–46–27
**«Бездань»**
вул.Шышкіна, 20/1, офіс 70
246–08–73
**«Галяктыка»**
вул.Кальцова, 32
237–18–28, 237–18–29
**«Гоблін»**
вул.Герасіменкі, 28
242–54–59
**«Інтэр-сетка»**
Калінінградзкі зав., 19а
266–36–45
**«Камбат»**
вул.Р.Люксэмбург, 101
286–16–21
**«Квазар»**
пл.Казінца, 120
212–18–98
**«Майстар»**
вул.Ташкенцкая, 2
240–15–78
**«Місія»**
вул.Чарнышэўскага, 10
269–10–72
**«Навігатар»**
вул.Альшэўскага, 10
254–31–22
**«О.К.»**
вул.Інтэрнацыянальная, 9
223–76–15, 226–57–11
**«Палігон»**
Клюбны праезд, 1
268–73–93
**«Патрыёт»**
вул.Варанянскага, 50/4, 204
228–10–47
**«Рэванш»**
вул.Пухавіцкая, 21 (СШ №89)
275–60–98
**«Руслан»**
пр.Пушкіна, 28
252–92–32
**«Салтайм»**
пр.Ф.Скарыны, 131/1
263–76–85
**«Сківіцы»**
вул.Кастрычніцкая, 5
206–66–88
**«Тарнада»**
пр.Партызанскі, 110
282–59–58
**«Тэтрыс»**
вул.Фрунзэ, 3
284–87–99
**«Фаварыт»**
вул.Мясьнікова, 34
211–20–37
**«Цэнтурыён»**
вул.Шаранговіча, 39
215–74–80
**«Экстрым-1»**
вул.Нікіфарава, 12
**«Экстрым-2»**
вул.Шугаева, 19/3
268–07–84
**«Юніспэктар»**
вул.Усходняя, 129
262–18–14
**CCE**
вул.Сурганава, 47
231–16–93
**«Cyber Ground»**
вул.М.Багдановіча, 78
207–38–74
**«EXistenZe»**
вул.Філімонава, 13/1
299–97–71
**«Hazard-digger»**
вул.Румянцава, 1 / вул. Румянцава, 4
236–51–28, 285–29–11, 663–06–64
**«Goodwin-1»**
вул.Б.Хмяльніцкага, 12
239–34–37
**«Goodwin-2»**
вул.Прытыцкага, 62/2
253–09–71
**«iPoint»**
вул.Румянцава, 15
233–97–25
**«Level»**
пр.Партызанскі, 14
296–26–78, 606–26–78
**«M@XI»**
вул.Гая, 4/1
268–69–65
**«Neo»**
вул.Любімава, 26/3
270–60–24
**«Nuclear Traction-1»**
пр.Ф.Скарыны, 25
227–78–41
**«Nuclear Traction-2»**
вул.Рэвалюцыйная, 6б
223–66–24
**«OlGen»**
вул.Астрашыцкая, 9
684–40–51
**«Scorpio»**
вул.Жукоўскага, 15б
229–65–37
**«Sky»**
вул.Куйбышава 87
239–34–41
**«SkyLords»**
вул.Палявая, 28
**«Stealth»**
вул.Варвашэні, 17
239–42–58
**«SunDay»**
вул.Бельскага, 15
201–43–68
**«SunGate»**
пр.Ракасоўскага, 140
677–07–67
**«Switch»**
вул.Жукоўскага, 1
207–88–95
**«Ultimo»**
пр.газ.«Правда», 25 (к/т «Берасьце»)
207–99–72
**«V2-Portal»**
Лагойскі тракт, 50
283–94–15, 283–94–16
**«V3-FihgtClub»**
вул.Камуністычная, 8
**«V4»**
вул.Ясеніна, 141
274–93–98
**«Web»**
вул.Каліноўскага, 55
283–02–62

КАІСА

# Цэнтральнаэўрапейскія дзівосы

Чэмпіянаты кантынэнту пад эгідай Эўрапейскага шахматнага саюзу пачалі ладзіцца толькі ў 1990–я. Гэтым разам VI чэмпіянат Эўропы сярод мужчын праходзіў у Варшаве, з 220 шахматыстаў адбіраліся кандыдаты не абы–куды — чэмпіянат сьвету па вэрсіі ФІДЭ.

Польшча, дзе штогод ладзяцца сотні турніраў, пакрысе становіцца шахматнай Мэкай кантынэнту. Былі сярод удзельнікаў сёлетняй імпрэзы і беларусы — гросмайстры Сяргей Азараў, Аляксей Аляксандраў і Аляксей Фёдараў. Выступілі пасьпяхова. Аднак гульня Аляксандрава была няроўная; «паласа няўдач» зацягнулася. Рэйтынгавы лідэр ужо на старце адстаў ад суайчыньнікаў і ў выніку падзяліў 54—68–е месцы. А.Фёдараву, які заняў 32–е месца, удалося прабіцца ў чэмпіянат сьвету. С.Азараву (40–е месца) крыху не пашанцавала: у вырашальнай партыі ён пратэрмінаваў час. Чэмпіёнам кантынэнту стаў 29–гадовы румын Ліўю–Дытар Нісыпяну з выдатным вынікам 10 з 13.

Амаль адначасна ў Кішынёве праходзіў чэмпіянат Эўропы сярод жанчын. Тут рэй вяло ўкраінскае цуда–дзяўчо Каця Лагно. 15–гадовая юначка з Краматорску лёгка абышла многіх больш сталых канкурэнтак, у тым ліку чэмпіёнку Беларусі Ганну Шарэвіч і экс–чэмпіёнку Рахіль Эйдэльсон. Ганна ўсё ж здолела ўтрымацца ў верхняй частцы табліцы (7 з 12), зрабіўшы заяўку на гросмайстарскае званьне. Яно, будзем спадзявацца, укаранує прыгажуню яшчэ да заканчэньня ёю Берасьцейскага ўнівэрсытэту.



**Як бы вы згулялі?**

А. Фёдараў (Беларусь, 2602 У.Малахаў (Расея, 2670). Ход белых. Чорныя ахвяравалі фэрзя за дзьве фігуры ды пешку, маюць праблескі ініцыятывы…

Адказ: удар па цэнтры 1. e5! Ke8 і кідок 2. Cd8! зьнялі ўсе пытаньні. Белыя выйгралі.

У чым дзівосы? Перш за ўсё, у тым, што чэмпіянаты адбыліся: шахматы ў сьвеце перажываюць не найлепшыя часы. А таксама ў бескампраміснасьці пераважнай большасьці гульняў — нібы шахматысты абодвух полаў вырашылі зьвесьці «гамбурскія рахункі». Кароткіх, бяззубых нічыіх было вобмаль, а зграбных камбінацый — безьліч. Хто ня верыць, хай паблукае па афіцыйных сайтах турніраў.

**ВР**

## ПАРТЫЯ З ГРОСМАЙСТРАМ: ВЫНІКІ

**Зьміцер Лыбін — чытачы «НН», 2005 (праз перапіску). Дэбют Сакольскага A00.**

1. b4 a5 2. b5 Kf6 3. Cb2 d6 4. c4 g6 5. d4 Cg7 6. Kc3 0–0 7. Kf3 Kbd7 8. e3 e5 9. Ce2 Te8 10. 0–0 e4 11. Kd2 Kf8 12. Фb3 h5 13. Tae1 Cf5 14. f3 ef 15. Cf3 Фc8 16. e4 Cg4 17. Ka4 Cf3 18. Фf3 Фg4 19. Фf2 Фd7 20. h3 Tad8 21. e5 K6h7 22. Ke4 Te7 23. ed cd 24. Kb6 Фe8 25. Kd6 Td6 26. Te7 Фe7 27. Kc8 Фc7 28. Kd6 Фd6 29. Фf7+ Kph8 30. c5 Cd4+ 31. Фf2 1–0.

Досыць напружанай выйшла гэтая таварыская партыя. У нейкі момант (бадай, паміж 10–м і 15–м хадамі) чорныя забавіліся з наступам і спрацаваў футбольны закон: «гол» забілі ім. Цікава, што прарыў адбыўся менавіта праз клетку b6, аслабленую ходам 1…a5?! Заслугоўваюць увагі геамэтрычныя манэўры фэрзяў. Нарэшце, і фінальны ход быццам узяты з камбінацыйных падручнікаў — чорны слон трапіў у «нажніцы» і мусіў быць аддадзены задарма.

Сярэдняя кваліфікацыя двух тузінаў чытачоў, якія дасылалі нам свае хады, — першы разрад, аднак былі заўважаны і майстры, удзельнікі Вышэйшай лігі. Хады прыходзілі зь Менску, Слоніму, Наваполацку, Лунінца. Большасьць гульцоў карысталася электроннай поштай.

## ВАРТА БАЧЫЦЬ

### Пятніца, 15 ліпеня

**БТ, 12.10**

«Людзі на балоце», 2–я сэрыя.

Беларусь, 1981, рэж. Віктар Тураў.

Кінааповесьць паводле раману І.Мележа.

Экранізацыя знакамітага твору Мележа проста абавязковая для прагляду ўсім рупліўцам беларушчыны, дый наагул усім гледачам, якім не абыякава годнае, якаснае і жывое кіно. Трыюмф Віктара Турава; цёплы, шурпаты й прыгожы дыямэнт «Беларусьфільму».

### Субота, 16 ліпеня

**НТВ, 19.10**

«Замужам за мафіяй».

ЗША, 1988, рэж. Джонатан Дэмі.

Гангстэрская камэдыйная мэлядрама.

Пасьля забойства сур'ёзнага й шанаванага гангстэра (Алек Болдўін) і, на няшчасьце, мужа Анжэлы (Мішэль Пфайфэр) ФБР пачынае сачыць за сэксапільнай удоўкай. У суседні дом падсяляюць агента (Мэцью Мадайн).

Любоўны раман непазьбежны.

**СТВ, 0.00**

«Я — Дзіна».

Францыя—Нямеччына—Данія—Швэцыя—Нарвэгія, 2002, рэж. Оле Барнэдаль.



CLUB-CULTURE.COM

Гераіня ў раньнім дзяцінстве стала прычынаю сьмерці маці і заслужыла лютую нянавісьць бацькі. Пазбаўленая ласкі, Дзіна вырастае дзікункаю і знаходзіць суцяшэньне ў трызьненьнях. Яе схаладнелае й шалёнае сэрца здольна растапіць толькі сапраўднае каханьне.

Оле Барнэдаль («Начное вартаваньне») зьняў самы дарагі праект за ўсю гісторыю скандынаўскага кіно. Прыз глядацкіх сымпатый на Манрэальскім фэстывалі («найлепшы фільм») і намінацыя за найлепшую жаночую ролю (Марыя Банэві).

Таксама ролі выконваюць Жэрар Дэпард'ё, Крыстафэр Эклстан («Іншыя»), Пэрніла Аўгуст.

**АНТ, 0.25**

«Пяро маркіза дэ Сада».

ЗША—Нямеччына—Вялікабрытанія, 2000, рэж. Філіп Каўфман.

Драма паводле п'есы Дага Райта.

Нават у псыхіятрычнай клініцы маркіз дэ Сад (Джэфры Раш) працягвае пісаць кнігі, ставіць п'есы й выпрабоўваць людзкую мараль. У небясьпечную гульню ўцягнуты малады абат (Хоакін Фэнікс — «Глядыятар») і прачка Мадлен (Кэйт Уінсьлет).

Філіп Каўфман («Гэнры і Джун», «Невыносная лёгкасьць быцьця») паставіў глыбокі, псыхалягічны й правакацыйны фільм. Выдатныя акторскія працы.

### Нядзеля, 17 ліпеня

**НТВ, 19.10**

«Адвакат д'ябла».

ЗША. 1997, рэж. Тэйлар Гекфард.

Містычная драма паводле раману Эндру Нэйдэрмана.

Малады й таленавіты адвакат Кевін Ломак (Кіяну Рыўз) не прайграе ніводнага працэсу й здольны апраўдаць самага зацятага мярзотніка. Героя запрашаюць у найбуйнейшую юрыдычную кампанію, і сам кіраўнік карпарацыі Джон Мілтан (Аль Пачына) апякуецца ім. Але ўзыходжаньне па службовай лесьвіцы выклікае злавесныя падзеі — і Кевін пачынае разумець, з кім ён заключыў дамову.

**«Лад», 21.40**

«Забіць дракона».

Расея—Нямеччына, 1988, рэж. Марк Захараў.

Філязофская казка паводле п'есы Я.Шварца «Дракон».

Вандроўны рыцар Лянцэлёт (Аляксандар Абдулаў) кідае выклік Дракону, які ўладарыць у горадзе. Але сьмерць Дракона не вызваляе месьцічаў ад рабства, бо дракона трэба забіць у душы кожнага. Фільм не пазбаўлены перабудовачнай каньюнктуры, але адметны высокай пастановачнай культурай і зладжаным акторскім ансамблем (Я.Ляванаў, А.Захарава, В.Ціханаў). Алег Янкоўскі ў ролі Дракона — самаіранічны, геніяльна гратэскны, злачынны й бясьсільна-лірычны.

Прызы «Ніка-89» за музыку й касьцюмы.

**АНТ, 23.40**

«Малена».

Італія—ЗША, 2001, рэж. Джузэпэ Тарнаторэ.

Рамантычная драма.

У гэты дзень Мусаліні абвясьціў вайну Францыі і Англіі, а падлетку Рэната купілі новы ровар. У гэты дзень Рэната ўпершыню ўбачыў прыгажуню Малену — і закахаўся ў яе.

Жанчыны распускаюць плёткі пра Малену і зайздросьцяць ёй, мужчыны — трызьняць ёю, але Малена — тая жанчына, якую герой не забудзе ніколі.

У ролі прыгажуні — Моніка Бэлючы. Музыку да фільму напісаў знакаміты Эніё Марыконэ.

Дзьве намінацыі на прэмію «Оскар».

**Андрэй Расінскі**




## ІМПРЭЗЫ

### Два канцэрты Вайцюшкевіча

**19 ліпеня** Зьміцер Вайцюшкевіч сьвяткуе дзень нараджэньня Ўладзімера Маякоўскага, а 20 ліпеня — свой уласны. З гэтай нагоды ў малой залі КЗ «Менск» заплянаваны два канцэрты. 19 ліпеня «WZ-Orkiestra» прэзэнтуе новую праграму на вершы Маякоўскага, якая складаецца з тузіна песень. Гэта будзе першая расейскамоўная праграма Вайцюшкевіча.

**20 ліпеня** тамсама Вайцюшкевіч ладзіць уласную вечарыну. Ён будзе сьпяваць сольна, на сцэну выйдуць і яго сябры — Рыгор Барадулін, Уладзімер Някляеў, Алесь Камоцкі. Француская знаёмыя рыхтуюць свой сюрпрыз.

Пачатак а 19-й. Квіткі па 10 000—12 000.

## ПРЭЗЭНТАЦЫЯ

### Вяртаньне Ганька

**У пятніцу 15 ліпеня, а 16-й** у бібліятэцы Дому літаратара (вул. Фрунзэ, 5) адбудзецца прэзэнтацыя кнігі ўспамінаў Марыі Ганько «Каб сьведчылі пра Беларусь: Жыцьцё й дзейнасьць Міколы Ганька» з удзелам выдаўцоў.

Маладачанец Мікола Ганько пры канцы 1940-х апынуўся ў Таронта, дзе стаў актывістам беларускага жыцьця ў Канадзе, спрычыніўся да розных выдавецкіх ініцыятыў, заснаваньня моцнай беларускай парафіі царквы сьв. Кірылы Тураўскага. У 1990-я гады Мікола Ганько быў адным з арганізатараў Дабрачыннага фонду дапамогі ахвярам Чарнобылю. Дзякуючы пералічаным сродкам і прывезеным ім асабіста ў Беларусь лекам ад сьмерці былі выратаваныя тысячы дзетак.

## ВЫСТАВЫ

### Art-жыжаль

**З 15 ліпеня да 4 жніўня** каля Бабруйску ў «Вярбках», на базе адпачынку «ФанДАКу», пройдзе III Міжнародны пленэр па кераміцы «Art-жыжаль», у якім возьмуць удзел мастакі-керамісты зь Беларусі, Расеі, Малдовы, Украіны, Польшчы, Літвы, Латвіі і Баўгарыі. Тэма — «Плястыка і прасторавае асяродзьдзе»: выраб керамічнай плястыкі для пэўнага прасторавага асяродзьдзя, узаемадзеяньне керамікі і прасторы. Т. б/а «Вярбкі»: 8-0225-59-73-46. E-mail: akon@date.by, falco@tut.by.

### Стэфанія Станюта

**Да 1 верасьня** ў Музэі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры (Музычны завулак, 5) будзе працаваць выстава, прысьвечаная 100-годзьдзю легендарнай актрысы Купалаўскага Стэфаніі Станюты.

### «Concerto Grosso» Арлена Кашкурэвіча

У Мастацкім музэі з **14 ліпеня да 25 жніўня** — выстава твораў Арлена Кашкурэвіча «Concerto Grosso».

### Менск: аблічча гораду

Да 20 жніўня ў гарадзкой мастацкай галерэі твораў Л.Шчамялёва (пр.Ракасоўскага, 49) працуе фотавыстава «Менск: аблічча гораду». На выставе можна ўбачыць працы ня толькі беларускіх творцаў (Уладзімера Суцягіна, Уладзімера Парфянка, Уладзімера Качана, Сяргея Кажамякіна, Алега Яравенкі, Леаніда Ляўшынава, Сяргея Брушкі ды інш.), але і замежных фотамастакоў (Філіпа Эрбэ, Біла Крэндала, Бэнджаміна Гейларда).

## ТЭАТРЫ

### Балет

**14** (чц), **15** (пт) — «Шчаўкунок».

### Купалаўскі тэатар

**14** (чц) — «Чорная панна Нясьвіжу».
**15** (пт) — «Кім».
**17** (ндз) — «Каханьне ў стылі барока».
**19** (аўт) — «С.В.».
**20** (ср) — «Смак яблыка».
**21** (чц), **22** (пт) — «Чычыкаў».

### Малая сцэна

**15** (пт) — «Адчыніце кантралёру!».
**18** (пн) — «Баляда пра каханьне».

### Тэатар імя Горкага

**14** (чц) — «Перад заходам сонца».
**15** (пт) — «Амфітрыён».
**16** (сб) — «Опэра жабракоў».

### Тэатар-студыя кінаактора

**14** (чц) — «Заноза».
**15** (пт), **16** (сб) — «Філюмэна Мартурана».

### Тэатар-студыя кінаактора і «Новы тэатар»

**17** (ндз) — «12 крэслаў».

## КЛЮБНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

**X-Ray** (223-93-55)
**14** (чц), 20.30 — «Apple tea».
**15** (пт), 22.00 — «Apple tea».
**16** (сб), 20.30 — «Apple tea».

**Рэактар** (671-58-65)
**14** (чц), 22.00 — «Стары Ольса». Квіткі: 8 000 — 12 000.

**Bronx** (288-10-61, GSM «Velcom»: 103 і 105)
**14** (чц), 22.00 — «Bronx».
**15** (пт), 22.00 — «Alegrias» .
**17** (ндз), 17.00 — нядзельны кінасэанс.
**22** (пт), 22.00 — «Acoustic Band».

**Izюм** (206-66-18, 605-25-25)
**14** (чц), 22.00 — Royalty R'n'B»: dj Gaamer, dj Induss .
**17** (ндз), 21.30 — «Blues street».

**Белая вежа** (284-69-22, 239-16-00)
**14** (чц), 23.00 — «White Tower»: dj Top, dj Grizzly, dj Bergamo, dj Alex.
**17** (ндз), 23.00 — «Acoustic Band».
**22** (пт), 23.00 — «Acoustic Band».
**24** (ндз), 23.00 — «Acoustic Band».

## КІНО Ў МЕНСКУ

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Горад грахоў»****: **15** (пт) 16.00, 18.30, 21.00; **16, 17** (сб, ндз) 13.30 (іл), 16.00, 18.30, 21.00.
«Жмуркі»*** (прэм'ера): **15—17** (пт—ндз) 17.00, 19.00, 21.10.
«Зоркавыя войны: эпізод III. Помста сытхаў»: **15—17** (пт—ндз) 14.20.

**«Берасьце»** (272-87-91)
«Вайна сусьветаў»: **15** (пт) 14.00, 16.30, 19.00, 21.10; **16, 17** (сб, ндз) 14.00 (іл), 16.30, 19.00, 21.10.

**«Дружба»** (240-90-13)
«Містэр і місіс Сьміт» (2с): **15, 17** (пт, ндз) 17.50 (іл), 20.00, 22.10; **16** (сб) 17.50, 20.00 (іл), 22.10.

**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Жмуркі»*** (прэм'ера): **15** (пт) 15.20, 17.20, 19.20, 21.30; **16, 17** (сб, ндз) 13.20 (іл), 15.20, 17.20, 19.20, 21.30.

**«Масква»** (203-14-48)
«Жмуркі»*** (прэм'ера): **15** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **16, 17** (сб, ндз) 15.00 (іл), 17.00, 19.00, 21.00.

**«Мір»** (288-22-33)
«Вайна сусьветаў»: **15** (пт) 14.30, 17.00, 19.10, 21.20; **16, 17** (сб, ндз) 14.30 (іл), 17.00, 19.10, 21.20.
«Адзін у цемры»***: **15—17** (пт—ндз) 16.20, 18.20, 20.20.

**«Перамога»** (203-77-66)
«Вайна сусьветаў»: **15** (пт) 12.30, 14.40, 16.50, 19.00, 21.10; **16, 17** (сб, ндз) 12.30 (іл), 14.40, 16.50, 19.00, 21.10.

**«Піянэр»** (227-64-87)
«Уцёкі»****: **15** (пт) 17.00, 21.10; **16, 17** (сб, ндз) 17.10, 21.10.
«Брудныя танцы-2»: **15** (пт) 19.20, **16, 17** (сб, ндз) 15.30, 19.30.

**«Цэнтральны»** (200-34-16)
«Містэр і місіс Сьміт» (2с): **15** (пт) 13.30, 15.50, 18.30, 21.00; **16, 17** (сб, ндз) 11.00 (іл), 13.30, 15.50, 18.30, 21.00.

### Маленькія трагедыі

**20 і 21 ліпеня** ў Музэі гісторыі беларускага кіно (вул.Сьвярдлова, 4) а 18-й гадзіне кінааматары змогуць паглядзець фільм з удзелам У.Высоцкага «Маленькія трагедыі».

(2с) — кінафільм падоўжанай працягласьці
(іл) — ільготны сэанс (зьніжка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

## КІНО ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**«Аўрора»**
«Як Майк»: **16, 17** (сб, ндз) 12.00.

**«Берасьце»**
«У пошуках Нэма»: **15** (пт) 11.00; **16, 17** (сб, ндз) 12.00.

**«Дружба»**
«Маленькі баец»: **15** (пт) 10.30.
«Горад чарадзеяў»: **15, 17** (пт, ндз) 13.00; **16** (сб) 11.00.
«Гарэзы»: **15, 16** (пт, сб) 15.00; **17** (ндз) 11.00.
«Я — Цэзар»: **16** (сб) 13.00; **17** (ндз) 15.00.

**«Масква»**
«Шрэк»: **17** (ндз) 13.00.

**«Мір»**
«Прадвесьнікі буры»: **15** (пт) 10.30.
«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **15—17** (пт—ндз) 13.30.

**«Піянэр»**
«Цімур і яго камандас»: **15** (пт) 10.20; **16, 17** (сб, ндз) 13.30.
«Браток медзьведзяня»: **15** (пт) 12.20; **16, 17** (сб, ндз) 10.20.
«Алёша Паповіч і Тугарын Зьмей»: **15** (пт) 14.20; **16, 17** (сб, ндз) 12.00.

**«Цэнтральны»**
«Ледавіковы пэрыяд»: **15** (пт) 11.00.

## КІНО НА DVD

**Master Records**

**«Эрас»**
Рамантычная драма, ЗША—Італія, 2004, рэж. **Мікелянджэлё Антаніёні, Стывэн Содэрбэрг, Вонг Кар-Вай.**
У ролях: **Лі Гонг, Робэрт Даўні-мал, Луіза Ранiеры**
Тры гісторыі пра каханьне і пачуцьцёвасьць ад трох знакамітых рэжысэраў…
**Менск, Кісялёва, 12, 643-21-08**




## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# 60 літраў расейскай крыві

«Жмуркі» («Жмурки»)
Расея, 2005, каляровы, 107 хв.
**Жанр:** іранічна-мізантрапічны крымінальны баявік, сьцёб-камэдыя.
**Адзнака:** 6 (з 10).


WWW.TOTALCINEMA.13RUS.RU

У клясычных жудасьціках парачкі вычварэнцаў ажыўлялі нявест (для Франкенштайна) ды гуляліся з зомбі. У карціне Аляксея Балабанава «Жмуркі» крывіцай жахаў выступае фальклёрны расейскі пэрыяд першапачатковага назапашваньня капіталу, прэпараваны з іранічным цынізмам і «прысьцёбнутымі» адсылкамі да Тарантына.

Два гангстэры-адмарозкі (Аляксей Панін і Дзьмітры Дзюжаў), якія служаць на пабягушках у героя Мікіты Міхалкова (малінавы пінжак і распальцоўка дадаюцца камплектам), мусяць вярнуць валізку з гераінам. Колькасьць трупаў расьце ў геамэтрычнай прагрэсіі.

Пэрсанажы карціны — усе як на падбор: з ілбамі пітэкантрапаў, масіўнымі сківіцамі, ідыятычна-рубленымі фразамі, і амаль усе кандыдаты ў жмурыкі. У фільме скарыстана 60 літраў штучнай крыві.

Вуліцы, машыны, дамы — пашарпаныя, атмасфэрка сьцёбна-гратэскная. Балабанаў даў волю сваёй мізантропіі — і расквеціў яе чорным гумарам. Крымінальна-гераічныя таварышы з «Брыгад», «Мянтоў» і балабанаўскага «Брата» наўмысна зьніжаны да ўзроўню моўнага штампу і фальклёрнага цэтліка.

Цэтлікі ажыўлены трапнымі дэтальками: бандзюган Панін паўсюль цягаецца з інтэлігенцкаю папкаю і жагнаецца на кожную царкоўку; шафападобны Дзюжаў мае малюсенькі нататнічак і вывучае ангельскую па коміксах. Малінавапінжачны Міхалкоў млее ад тоўстага сынка-нашчадка і ня любіць Цэрэтэлі.

Але перапрацаваны сцэнар футбаліста Стаса Махначова — гэта набор анэкдотаў, які ня цягне на эпас. Напоўніцу ацаніць такое здольныя толькі людзі, на ўласным досьведзе знаёмыя з часамі «малінавых пінжакоў».

Пры канцы фільму паранены герой Паніна скардзіцца, што «страціў цнатлівасьць». Вынікам гэтай страты становіцца кабінэт зь відам на Крэмль, сакратарка Рэната Ліцьвінава — і сёньняшняя Расея.

**Андрэй Расінскі**

# Раскіданае гняздо

ЛЕВЫМ ВОКАМ



Бона Сфорца, Аляксандар ІІ, Сталыпін, Сталін і Лукашэнка... Ім усім прысьпічыла рабіць аграрную рэформу. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

Уважліва заслухаў прэзыдэнцкі пакет ініцыятыў адраджэньня вёскі і заплакаў... Капец нашай Аркадзіі!.. Капец калгасу!

Між тым пры ўсіх сваіх нэгатывах калгас — унікальная чалавечая форма жыцьця, якая выпрацавала нідзе і ніколі ў гісторыі гомасапіенсаў ня бачаную схему адносін людзей і культурных каштоўнасьцяў. Гэта наша нацыянальная каштоўнасьць! А ўжо ж праз пяць гадоў — якраз столькі часу адвёў лідэр на рэформу — калгасьнікаў ня стане, як тых магікан.

За МКАД нас будуць сустракаць аграгарадкі — урбанічная ксэракопія амэрыканскіх белых прыгарадаў. Іх жыхары пад патранажам буйных прадпрыемстваў будуць з ранку да ранку сумленна працаваць, зарабляючы аж пад 300 баксаў. Натуральна, ім у галаву ня прыйдзе назюзюкацца і пайсьці з гармонікам па вуліцы, гарлаючы «А я лягу-прылягу».

Чым закончыцца беларускае «агараджваньне», зразумела.

Як толькі на вёсцы ўсталюецца новы лад, краіну ахопіць флёр настальгіі па калгасным ладзе. Гэтаксама, як у Заходняй Беларусі ідэалізуюць польскія парадкі, зьявяцца натоўпы калгасафілаў.

Бацькі будуць вывозіць дзяцей на месцы былых калгасаў і, выціраючы сьлёзы, расказваць: «…а тутака быў наш... імя 25-га зьезду КПСС. Тут стаяў клюб, дзе я ўпершыню ўбачыў індыйскі фільм. А потым яго зьнесьлі, каб усё засеяць рапсам і імпартазамяняльным ячменем».

Зьявяцца свае Астаф'евы і Шукшыны, якія будуць маляўніча апісваць ломку адаптацыі былога калгасьніка да патрабаваньняў Сусьветнай гандлёвай арганізацыі.

Адным словам, мы зноў наступаем на старыя граблі: спачатку бурым, каб потым аднаўляць. Трэба думаць аб праблемах кансэрвацыі калгаснай спадчыны ўжо сёньня.

Натуральна, прасьцей за ўсё пабудаваць у Строчыцах дадатковы этнаграфічны сэктар «Беларускі калгас», куды мой знаёмы экскурсавод Юра Канавальчык мог бы цягаць экскурсіі: «Увага, шаноўныя інтурысты, сельпо — тыповая пабудова беларускага калгасу. На паліцах вы бачыце муляжы хлеба, кансэрваў і іншых прадуктаў з рацыёну калгасьнікаў…»

Прымітыўны кітч!

Мне здаецца, што гэта той выпадак, калі ісьці трэба амэрыканскім шляхам. Калі няма як захаваць калгасы цалкам, трэба стварыць для аматараў калгаснага ладу нешта накшталт індзейскай рэзэрвацыі, дзе ідэйныя калгасьнікі маглі б і далей піць і рабіць выгляд, што яны працуюць. А калі яшчэ па ўсёй краіне, за выключэньнем калгаснай рэзэрвацыі, забараніць піць піва на вуліцах, то калгасьнікі хутка залезуць з шыі Мінкультуры.

Дарэчы, адным з вынікаў бацькавай рэформы «на валокі» стане маленькая лексычная рэвалюцыя. Слова «калхозьнік», якое дзесяцігодзьдзямі ўжывалася ў дачыненьні да сялян, больш ня каціць. Цікава, якую мянушку прыдумаюць гарадзкія правінцыялам ці проста тармазам: «Ты чо слухаеш, чэл, Анжаліку Агурбаш? Ну ты аграгаротнік!»



**Натальля Пяткевіч: «Выбары будуць»**

**Датэрміновых выбараў прэзыдэнта ня будзе, бо набліжающца тэрміновыя, — адкрыла сакрэт палішынэля на прэс-канфэрэнцыі ў панядзелак намесьніца кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта. — І зьменаў у мыты на ўвоз патрыманых аўтамабіляў ня будзе, бо «ў праекце дакумэнту, пададзеным на подпіс прэзыдэнта, больш абароненыя інтарэсы юрыдычных асобаў, што гандлююць імпартнымі аўтамабілямі, і ў той жа час уціснутыя інтарэсы прыватных асобаў». Як добра, што ў нас усё ж бываюць выбары. Хай сабе і не датэрміновыя.**

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## ПАДЗЯКА

Дзякуй Марыі Ганько з Таронта за падтрымку.

**21—24 ліпеня**

Басовішча.

**24 ліпеня (нядзеля)**

па маршруце: Менск—Горадня—Сьвяцк—Аўгустоўскі канал—Менск.

**Т.: 232-54-58; 622-57-20 (Зьміцер) 264-12-38; 776-24-35 (Павал)**

Ліцэнзія №02310100189 ад 24 траўня 2001 году

**АЛЬТУС ПЛЮС**

Наведайце разам з намі

Самыя прыгожыя замкі Ўкраіны

**Камянец-Падольскі і Хоцін**

**19—22 ліпеня**

**Праграма туру**

Адпраўленьне зь Менску а 18-й.

**1-шы дзень**

Прыбыцьцё ў Камянец-Падольскі;

Разьмяшчэньне ў гатэлі турклясы;

Паездка ў **«Крышталёвыя пячоры»**;

Экскурсія ў **Хоцінскую крэпасьць**;

**2-гі дзень**

Аглядная пешаходная экскурсія па старажытным Камянцы;

Экскурсія ў Катэдральны касьцёл;

Экскурсія ў Старую крэпасьць;

**Прыбыцьцё ў Менск зранку**

Кошт туру 45 у.е. + 22 000 рублёў.

У кошт уваходзяць транспартныя паслугі, пражываньне ў гатэлі турклясы, экскурсійнае абслугоўваньне.

Уваходныя квіткі аплочваюцца дадаткова.

Адрас: Менск, вул.Кастрычніцкая, 5-320

Т.: 222-46-51

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### КАНТАКТЫ

**Шукаем** беларускамоўнага тамаду (пажадана з баянам ці акардэонам) для вясельля. Т.: 680-71-52

**Куплю ўзнагароды** БНР, БЦР, БКА, манэты ВКЛ, Рэчы Паспалітай, фота ваенных (беларускія нацыянальныя фармаваньні часоў 2-е сусьветнае вайны). E-mail: zmagar@yahoo.com. Т.: 722-46-04

**Цікавіць інфармацыя**, дакумэнты, фота, зьвязаныя з Булак-Балаховічам, «Зялёным дубам», «Чорным катом», беларускай партызанкай, — набуду. E-mail: zmagar@yahoo.com. Т.: 722-46-04

### КНІГІ

**Прапаную кнігі** па гісторыі, этнаграфіі, фальклёры, сучасных аўтараў, постмадэрнізм, аўдыё. Абмен, дапамагу знайсьці патрэбнае выданьне, сфармаваць бібліятэку. Т. 753-91-96

**Пэрыёдыка**. Прапаную розныя нумары часопісаў «Крыніца», «ARCHE», «Эпоха», «Студэнцкая думка», газэты «Новы час», «Наша слова», гістарычныя альманахі. Т. 753-91-96

**Міцкевіч**: «Дзяды», «Крымскія санэты», «Кнігазбор», матэрыялы канфэрэнцый. Багдановіч: «Вянок» (рэпрынт), трохтомнік, архіўныя матэрыялы, іншае. Т. 753-91-96

**Прадам кнігі**: «Беларускае народнае адзеньне» М.Раманюка, «Беларускі кнігазбор»: Гётэ, «Філяматы і філярэты», Баршчэўскі. «Тэўтонскі ордэн», Ян Чачот, «Армія Краёва на Беларусі», «Да гісторыі беларускай эміграцыі ў Нямеччыне 1939—1951 г.» ды іншае, багаты выбар. Т.: 753-70-05

**Прадам кнігі**: «Споведзь», «Ад родных ніў» Л.Геніюш, «Добрыя весьці» У.Сыракомлі, факс., Прага, 1942; кнігі па архітэктуры, гісторыі, археалёгіі, этнаграфіі, багаты выбар. Т.: 753-70-05

**Новыя** ды рэдкія кнігі на ўсе густы ды ўзросты, відэа, аўдыё, CD, футболкі, значкі. Т.: 707-40-01, 234-93-71

### ПРАЦА

**Студэнт** (1 курс, Міжнародны дзяржаўны экалягічны ўнівэрсытэт імя Сахарава) шукае працу. Т.: 509-67-35. Кастусь

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17.00. Т.: 235-18-72. Юры

Прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна даслаць поштай (а/с 537, 220050, Менск), праз e-mail на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## КОШТЫ

На платныя прыватныя абвесткі (для прыватных асобаў) на с. 24

**Рэклямныя расцэнкі:**

— да 20 словаў (тэкставы модуль) — 4100 руб.

За кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль) — 4000 руб. Афармленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 см$^2$ — 650 руб.

Абвесткі палітычнага характару і ад грамадзкіх арганізацыяў аплачваюцца паводле рэклямных расцэнак для камэрцыйных абвестак.

Каб замовіць платную прыватную абвестку, трэба пераказаць грошы праз пошту на разьліковы рахунак: УНП 101115521. Рэдакцыя газэты «Наша Ніва», вул.Калектарная, 11. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвэстбанк», код 764.

На зваротным баку блянка паштовага пераказу ў сэктары «Для пісьмовых паведамленьняў» запісваецца дакладна й чытэльна тэкст абвесткі, тэлефон для сувязі і абавязкова дадаецца сказ: «За рэклямныя паслугі».

**Даведкі праз т. (017) 284-73-29**

**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**

З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**

**220050, Менск, а/с 537**

**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**

**E-mail: nn@promedia.by**

**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

**Наклад 3293. Газэта выдаецца 48 разоў на год.**

Нумар падпісаны ў друк 20.00 06.07.2005.

Замова № 4008.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а